# I. ПАСХАЛЬНАЯ ТАЯМНІЦА Ў САКРАМЭНТАХ КАСЦЁЛА

Тэма № 1, VIII кл.

## САКРАМЭНТ ЯК ДЗЕЙСНЫ ЗНАК

***Дыдактычная мэта:*** знаёмім вучняў з паняццем *сакрамэнт*, распавядаем, як падзяляюцца сакрамэнты. Асаблівым чынам звяртаем увагу на тое, што праз гэтыя знакі нам удзяляецца Божая ласка.

***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваем у вучнях уменне дзякаваць за дар сакрамэнтаў і супрацоўнічаць з Божаю ласкай.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** карткі з тэкстамі Св. Пісання: Мц 28, 19; Дз 1, 8; Як 5, 14–15; Ян 20, 23; Мк 14, 22–24; Ян 15, 16; Эф 5, 31. ККК 1131. Фотаздымкі.

***Метады катэхезы:*** праца ў групах, аналіз тэксту.

***Ход заняткаў***

***Малітва*:** О, добры Божа, асвяці нас Духам Тваім Святым, які дае розум і ўмацоўвае духоўныя сілы, каб мы ўважліва спасцігалі ўсе навукі і ўзрасталі Табе, Стварыцелю нашаму, на славу, бацькам і настаўнікам нашым, на радасць і ўцеху, Касцёлу і Бацькаўшчыне на дабро і славу. Амэн.

### Чалавек пытае

Ствараючы чалавека, Пан Бог даў яму несмяротную душу, вольную волю і розум, каб чалавек жыў у сяброўстве з Богам, пазнаваў Яго і любіў. Грэх разарваў сувязь чалавека з Богам, але дзякуючы Божай любові чалавек атрымлівае асвячальную ласку. Менавіта яна развівае ў чалавеку Божае жыццё. Гэтая ласка нябачная, але Пан Бог у сваёй мудрасці трывала злучыў яе з бачнымі знакамі — сакрамэнтамі.

*Катэхет (К.) запрашае вучняў разгледзець фотаздымкі, на якіх паказана ўдзяленне сакрамэнтаў, а пасля пытаецца ў вучняў:*

— Удзяленне якіх сакрамэнтаў вы бачылі на здымках?
— Якія з іх вы ўжо прынялі?
— Да прыняцця якога сакрамэнту вы рыхтуецеся?
— Якія яшчэ сакрамэнты можаце атрымаць?

На сённяшняй катэхезе мы паразважаем над тым, чым з’яўляюцца сакрамэнты і навошта мы іх прымаем. Спачатку разгледзім азначэнне самога слова *сакрамэнт*. Прачытайце ў вашых падручніках, якое азначэнне сакрамэнта падае вучэнне Касцёла. (*адзін з вучняў чытае тэкст*)

«Сакрамэнты — гэта дзейсныя знакі ласкі, ўстаноўленыя Хрыстом і даручаныя Касцёлу, праз якія нам удзяляецца Божае жыццё. Бачныя абрады, праз пасрэдніцтва якіх здзяйсняецца сакрамэнт, азначаюць і ажыццяўляюць ласку, якую нясе кожны сакрамэнт”. (пар ККК 1131)

**Бог адказвае**

Аб тым, як былі ўстаноўлены сакрамэнты, чытаем у Святым Пісанні:

*(заданне ў сшытку)* Напішы, аб устанаўленні якога сакрамэнту кажа Святое Пісанне:

- «**Дык ідзіце і навучайце ўсе народы, і хрысціце іх у імя Айца і Сына,**
  **і Духа Святога**» (Мц 28, 19)
- «**Прымеце моц Духа Святога, які на вас сыйдзе, і будзеце Маімі сведкамі ў Ерузалеме і ва ўсёй Юдэі, і Самарыі, і ажно да краю зямлі**» (Дз1, 8)
- «**Нехта сярод вас хварэе? Няхай пакліча прэзбітэраў Касцёла, а яны няхай памоляцца над ім і намасцяць яго алеем у імя Пана. І малітва веры ўратуе хворага, і Пан падыме яго, і грахі, якія ўчыніў, будуць адпушчаны яму**» (Як 5, 14–15)

- «**Прыміце Духа Святога. Каму адпусціце грахі, таму будуць адпушчаныя; на кім пакінеце, на тым застануцца**» (Ян 20, 23)

- «**І калі яны елі, Езус, узяўшы хлеб, благаславіў, паламаў і даваў ім, кажучы: Бярыце, гэта Цела Маё. І, узяўшы келіх, падзякаваў і даў ім;**
  **і пілі з яго ўсе. І сказаў ім: Гэта Мая Кроў запавету, якая за многіх праліваецца**» (Мк 14, 22–24)

- «… **Гэта чыніце на Маю памяць**» (Лк 22, 19)

- «**Таму пакіне мужчына бацьку свайго і маці і злучыцца з жонкай сваёй, і будуць двое адным целам**» (Эф 5, 31)

*Прэзентацыя працы вучняў.*

Сакрамэнты — гэта ўстаноўленыя Хрыстом бачныя знакі Яго прысутнасці

і дзейнасці на зямлі. Улічваючы нашыя магчымасці ўспрымання, Хрыстус карыстаецца знакамі, каб нам даць упэўненасць, што мы перажываем сустрэчу з Ім. Бачныя абрады, праз пасрэдніцтва якіх здзяйсняецца сакрамэнт, азначаюць і ажыццяўляюць ласку, якую нясе кожны сакрамэнт.

***Хрост:*** праз абмыванне вадой мы атрымліваем дар паўторнага нараджэння, Пан Бог ачышчае нас ад першароднага граху.

***Бежмаванне:*** праз ускладанне рук біскупа і намашчэнне святым алеем мы атрымліваем моц Духа Святога, умацоўваемся Яго дарамі.

***Пакаянне:*** у канфесіянале святар прамаўляе словы адпушчэння грахоў, менавіта там адбываецца спатканне чалавека з Хрыстом, які прабачае грэх.

***Эўхарыстыя:*** найважнейшы Сакрамэнт, у ім пад выглядам хлеба і віна Езус ахвяруе сябе за нас падчас св. Імшы.

***Намашчэнне хворых:*** праз святарскае намашчэнне хворыя атрымліваюць дар прысутнасці і моцы Божай, каб разам з Хрыстом перажываць сваё цярпенне і быць падрыхтаваным да сустрэчы з Богам у вечнасці.

***Святарства:*** праз накладанне рук біскупа ўдзяляецца дар служэння ў Касцёле, каб прэзбітэры выконвалі функцыі ахвярапрынашэння і былі настаўнікамі і пастырамі Божага народа.

***Сужэнства:*** мужчына і жанчына, складаючы адно аднаму сужэнскую прысягу, ствараюць непарыўны саюз сумеснага жыцця і любові ў Богу, атрымліваюць Божую ласку для належнага выканання сужэнскіх абавязкаў.

Сакрамэнты Касцёла падзяляюцца на: сакрамэнты хрысціянскага ўтаямнічання (хрост, канфірмацыя і Эўхарыстыя); сакрамэнты аздараўлення (пакаянне і намашчэнне хворых); сакрамэнты служэння супольнасці і місіі (святарства (пасвячэнне) і сужэнства). Яны ахопліваюць важныя моманты хрысціянскага жыцця. Усе сакрамэнты скіраваны да Эўхарыстыі “як да сваёй канчатковай мэты” (св. Тамаш Аквінскі).

*К. дзеліць вучняў на тры групы, даючы карткі і алоўкі. На дошцы катэхет змяшчае схему, якую вучні павінны дапоўніць, запісваючы:*
*Група I – сакрамэнты хрысціянскага ўтаямнічання*
*Група II – сакрамэнты аздараўлення*
*Група III – служэння і місіі*
*На картках вучні павінны запісаць назву сакрамэнта і намаляваць сімвал, які адлюструе сутнасць гэтага сакрамэнта (напр. хрост – белая вопратка)*




*Прэзентацыя працы вучняў.*

**Чалавек адказвае Богу**

Сакрамэнт — гэта сустрэча дзвюх асоб: Бога і чалавека. Бог дае сваю ласку і запрашае чалавека да супрацоўніцтва з ёю. Калі мы прымаем сакрамэнты, мы выражаем шчырае жаданне жыць у еднасці з Хрыстом.

***Разважанне:***

— Якімі ўчынкамі я пацвярджаю, што з'яўляюся Божым дзіцём?
— Як часта я яднаюся з Хрыстом у сакрамэнце пакаяння?
— Як часта я яднаюся з Хрыстом у сакрамэнце Эўхарыстыі?
— Як я рыхтуюся да прыняцця сакрамэнту канфірмацыі?
— Як я дзякую Пану Богу за ласкі, якімі Ён адорвае мяне праз сакрамэнты?
— Ці малюся аб распазнанні свайго паклікання?
— Ці малюся за святароў?
— Ці малюся за сваю сям'ю?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Падчас вячэрняй малітвы падзякаваць Пану Богу за дар сакрамэнтаў.
2. Вывучы азначэнне сакрамэнта ККК 1131.

***Заключная малітва***

Спеў падзякі.

Тэма № 2, VIII кл.

## ЛАСКА БОЖАЯ НЕАБХОДНАЯ ДЛЯ ЗБАЎЛЕННЯ

***Дыдактычная мэта:*** знаёмім вучняў з тым, што такое Божая ласка, з яе відамі (асвячальная, дзейсная). Звяртаем увагу на тое, што ласка з'яўляецца дарам Духа Святога, апраўдвае і асвячае нас.

***Выхаваўчая мэта:*** заахвочваем вучняў да трывалага жыцця ў асвячальнай ласцы і імкнення да святасці.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Дз 8, 9; Ян 13, 2. 6–30; Ян 18, 2–5. Энцыклапедыя для моладзі. Бог, чалавек, свет. – Катавіцы, 1991. Тры вялікія лісты паперы, алоўкі для малявання.

***Метады катэхезы:*** інфармацыйнае акно.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** Пс 51(50), 3-4.

**Чалавек пытае**

*К. раздае вучням карткі і просіць, каб кожны з вучняў (ананімна) напісаў на іх, кім ён хоча быць у жыцці. Калі заданне будзе выканана, карткі трэба размясціць на табліцы па групах: прафесія, сям'я, палітыка, рэлігія.*

— Што вы сёння робіце, каб дасягнуць гэтай мэты?

*К. ставіць вучням пытанне (праблему):*

— Якіх адказаў няма альбо вельмі мала (хачу быць дасканалым, святым, добрым і г. д.)?

— Чаму няма такіх адказаў? Як вы ўяўляецце сабе святога чалавека?

— Кім былі святыя?

— Што дапамагае быць святым?

— Дзе мы атрымалі задатак святасці?

Давайце прачытаем, што пра святых кажа энцыклапедыя:

***Святыя.*** Святым перадусім з'яўляецца сам Бог, а людзі ўдзельнічаюць у Яго святасці дзякуючы асвячальнай ласцы. Святымі Касцёл называе тых, хто ў сваім жыцці гераічна наследаваў Бога і дасягнуў дасканалага з'яднання з Ім. Святыя былі людзьмі, як кожны з нас, але яны перамяніліся на ўзор Хрыста, а Дух Святы даваў ім штораз больш поўны ўдзел у святасці Бога.

Задатак святасці мы атрымліваем як дар падчас хросту, а потым развіваем і паглыбляем, слухаючы Божае слова, прымаючы сакрамэнты, молячыся, змагаючыся са сваімі слабасцямі і служачы іншым у любові.

***Ласка*** — гэта бескарыслівы дар, які Бог дае нам, каб зрабіць нас удзельнікамі свайго трынітарнага жыцця і здольнымі дзейнічаць дзякуючы Яго любові. Бог адорвае чалавека сяброўствам і годнасцю свайго дзіцяці *(ласка асвячальная)* і дапамагае выконваць добрыя ўчынкі, патрэбныя для збаўлення *(ласка дзейсная)*.

**Бог адказвае**

Кожны Божы дар чалавек можа як прыняць і развіваць, так і адкінуць ці змарнаваць. У Святым Пісанні ёсць мноства прыкладаў супрацоўніцтва чалавека з Божай ласкай. Адзін з іх — гэта гісторыя святога Паўла, якую апісвае кніга Дзеяў Апосталаў у 8 і 9 раздзелах. Павел да сустрэчы з Езусам і пасля яе *(самастойная праца вучняў- падручнік вучня)*.

«**А Саўл быў згодны з ягоным забойствам**» (пар. Дз 8, 1).

«**А Саўл нішчыў Касцёл, уваходзіў у дамы, забіраючы мужчын і жанчын і кідаючы іх у вязніцу**» (Дз 8, 3).

«**Саўл усё яшчэ жыў пагрозамі і забойствамі вучняў Пана. Ён прыйшоў да першасвятара і папрасіў у яго лісты да сінагогаў у Дамаску, каб, калі знойдзе якіх-небудзь прыхільнікаў гэтага шляху, мужчын ці жанчын, мог звязаць іх і прывесці ў Ерузалем**» (Дз 9, 1–2).

«**Усё магу ў тым, хто ўзмацняе мяне**» (Флп 4, 13).

***Святы Павел***

| *да сустрэчы з Езусам* | *пасля сустрэчы з Езусам* |
|---|---|
| ………………………………… | …………………………………… |
| ………………………………… | ……………………………… |
| ………………………………… | …………………………………… |
| ………………………………… | …………………………………… |
| ………………………………… | …………………………………… |

У Пана Бога ўсё магчыма. З дапамогай Яго ласкі мы перамагаем свае слабасці і грахі, набліжаемся да святасці.

Святое Пісанне падае нам і іншы прыклад жыцця чалавека, які не захацеў супрацоўнічаць з Божай ласкай і адкінуў яе. Гэта гісторыя жыцця Апостала Юды (Ян 13, 2. 6–30; Ян 18, 2–5).

Саўл, верны Божай ласцы, становіцца св. Паўлам — Апосталам народаў, а

Юда — Апостал — становіцца здраднікам, марнуе гэты вялікі Божы дар.

**Чалавек адказвае Богу**

Маё жыццё мае вартасць і прыносіць плады, калі я з'яднаны з Хрыстом, калі жыву ў ласцы Божай — асвячальнай і дзейснай. Ласка — гэта Божае жыццё і Божая радасць у нас, якую мы маем ад Духа Святога. Мы атрымліваем яе падчас хросту, а потым памнажаем, прымаючы іншыя сакрамэнты, бо кожны з іх — гэта бязмежная крыніца ласкаў.

Дзейсная ласка — гэта асаблівая Божая дапамога для выканання добрых учынкаў, неабходных для збаўлення.

Успомні сітуацыі, калі нечакана да цябе прыходзіла думка прысвяціць больш часу на малітву, правесці вечар не каля тэлевізара, а схадзіць на вячэрнюю св. Імшу ў касцёл ці дапамагчы маці, якая мае мноства рознай працы, — усё гэта натхненні дзейснай ласкі, якая падштурхоўвае нашу волю да дзеяння. (Параўнанне: лакаматыў і вагоны).

*К. дзеліць вучняў на 3 групы, кожная з іх павінна па-рознаму адлюстраваць, што такое Божая ласка: 1 — слоўнае апісанне, 2 — паказаць схематычна, 3 — скончыць сказ: «Ласка Божая як ... .», 4 — намаляваць коміксавы дыялог, з якога будзе зразумела, што такое ласка.*

Ласка Божая:

| | |
|---|---|
| 1. Дэфініцыя, слоўнае апісанне. | 2. Графічная схема. |
| 3. Метафара, параўнанне. | 4. Коміксавы дыялог. |

***Разважанне:***

Кожнаму з нас Пан Бог удзяляе сваю ласку ў сакрамэнтах.

— Ці стараюся я заўсёды жыць ў стане асвячальнай ласкі?
— Што перашкаджае мне «прыносіць добрыя плады»?
— Як часта я дзякую Пану Богу за дар ласкі?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Напішы ліст да асобы, якая жыве ў цяжкім граху. Раскажы гэтай асобе аб тым, якую вялікую каштоўнасць мае жыццё ў Божай ласцы.
2. Вывучыць азначэнне асвячальнай і дзейснай ласкі.

***Заключная малітва***

Песня *Любоў Твая*.

## САКРАМЭНТЫ ХРЫСЦІЯНСКАГА ЎТАЯМНІЧАННЯ

Тэма № 3, VIII кл.

### ПРАЗ ХРОСТ МЫ СТАЛІ НОВЫМ СТВАРЭННЕМ

***Дыдактычная мэта:*** знаёмім з паняццем «новае стварэнне», якое азначае Хрыстовую справу паяднання чалавека з Богам.

***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваем у маладых людзей успрымальнасць да праблемы барацьбы паміж злом і дабром, абуджаем у іх жаданне супрацоўнічаць з Хрыстом, які перамагае зло.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Эф 4, 25–32; 2 Кар 5, 17–21. прамова Святога Айца Яна Паўла II на XII Сусветны Дзень Моладзі „Wiara musi kształtować wasze postanowienie”.

***Метады катэхезы:*** аналіз тэксту, апавяданне.

***Ход заняткаў***

**Малітва:**

*Божа, спашлі свайго Духа Святога ў нашыя сэрцы і аднаві ў нас ласку хросту. Перамяні нашыя сэрцы і ўмацуй іх, каб з радасцю сведчылі пра Евангелле. Дапамажы нам паглыбіць нашу веру, каб мы ў еднасці і любові маглі служыць Табе і адно аднаму. Амэн.*

**Чалавек пытае**

Мы пазнаёміліся з сакрамэнтамі агульна. Сёння мы больш падрабязна пазнаёмімся з першым і самым неабходным сакрамэнтам, без якога нельга прыняць іншыя сакрамэнты, — гэта сакрамэнт хросту. Сённяшняя тэма: **«Праз хрост мы сталі новым стварэннем».**

Час, у якім мы жывём, часта называюць часам вялікіх тэхналогій. Гледзячы тэлевізар і чытаючы газеты, мы знаходзім гэтаму пацвярджэнне. Сярод матэрыяльных дабротаў і вынаходніцтваў, якія існуюць, ёсць тое, што вельмі непакоіць, — гэта ўзаемаадносіны паміж людзьмі. Усцяж мы чуем пра паглыбленне падзелу паміж людзьмі, пра войны, крыўды...

— Адкуль паходзіць зло, якое мы бачым у сучасным свеце?

**Бог адказвае**

Божае Аб’яўленне кажа нам, што Божы план быў іншы: людзі павінны былі жыць у згодзе са сваім Стварыцелем і паміж сабой. Павінны былі пераўтвараць свет для супольнага дабра, скіроўваючы яго да Бога. На жаль, людзі абралі іншы шлях, супрацьлеглы волі Божай. Яны зграшылі супраць Бога, а праз свой грэх адышлі ад Яго, адначасова парушаючы гармонію ў свеце. З іх грахом у свет увайшла нянавісць, эгаізм, крыўда, няшчасце, войны, цярпенне і смерць. Праз грэх парадак, устаноўлены Богам, быў парушаны. Аднак Пан Бог спасылае свайго Сына, каб зноў паяднаць чалавецтва з Сабою. Ахвяруючы сябе праз смерць на крыжы, Езус вызваліў чалавецтва з няволі граху і смерці і заключыў новы запавет паміж Богам і чалавекам. У Святым Пісанні чытаем:

**«Езус адказаў яму: “Сапраўды, сапраўды кажу табе, калі хто не народзіцца нанова, не можа ўбачыць Божага Валадарства”» ( Ян 3, 3–5).**

— Хто можа ўбачыць Божае Валадарста?

— Што значыць «нарадзіцца нанова»?

Езус праз сваю смерць і ўваскрасенне даў пачатак «новаму стварэнню». Гэта не толькі вялікі дар Божы для кожнага з нас, гэта адначасова і нашае заданне, бо ад моманту нашага хросту мы распачалі ўдзел у «новым стварэнні». Гэтую праўду на XII Сусветным дні моладзі Ян Павел II нагадваў усім прысутным *(падручнік вучня)* .

«Апранутыя ў белае адзенне ў дзень нашага хросту, так, як мы будзем апранутыя ў апошні дзень, мы пакліканы захоўваць яго бляск на кожны дзень і падтрымліваць яго пастаянна праз прабачэнне, малітву і хрысціянскае жыццё. Хрост — гэта знак таго, што Бог спадарожнічае нам на нашым шляху,

упрыгожвае нашае жыццё і перамяняе нашую гісторыю ў святую гісторыю».
— Да чаго абавязвае нас святы хрост?

Мы, з'яднаныя з Хрыстом, пакліканыя любіць Пана Бога, жыць ва ўзаемнай любові і еднасці, перамяняць свет дзеля супольнага дабра, скіроўваючы яго да Бога, так, як гэта было на самым пачатку, як гэта павінны былі рабіць першыя людзі. Да такога сапраўднага хрысціянскага жыцця заклікае св. Павел у Пасланні да Эфесцаў:

«**Таму, адкінуўшы ману, гаварыце праўду кожны блізкаму свайму, бо мы члены адзін аднаму. Гневаючыся, не грашыце: сонца хай не зойдзе ў гневе вашым; і не давайце месца д'яблу. Хто краў, больш не крадзі, а лепей працуй, робячы сваімі рукамі карыснае, каб было з чаго выдзяляць таму, хто мае патрэбу. Ніякае брыдкае слова хай не выходзіць з вуснаў вашых, а толькі добрае на будаўніцтва ў веры, каб яно давала ласку слухачам. Не зневажайце Святога Духа Божага, якім вы запячатаны на дзень адкуплення. Усякая горыч і раздражненне, і гнеў, і крык, і блюзнерства няхай будуць выдалены ад вас разам з усялякай злосцю. Вы ж будзьце адзін да аднаго лагоднымі, міласэрнымі, даруйце адзін аднаму, як і Бог у Хрысце дараваў вам**» (пар. Эф 4, 25–32).

*К. прапануе вучням запісаць на дошцы спачатку негатыўныя жыццёвыя паставы, пра якія св. Павел кажа ў сваім пасланні, а потым — знайсці замест іх пазітыўныя, якімі будзем карыстацца ў сваім жыцці (падручнік вучня):*
падман — праўда,
гнеў — згода, супакой,
грэх — дабро,
крадзеж — сумленная праца,
мова, што нясе шкоду — мова, якая дае добры прыклад,
зневажанне — шацунак, павага,
раздражненне — супакой,
агрэсія, нянавісць — дабрыня, прабачэнне.

**Чалавек адказвае Богу**

Судан, адна з найвялікшых краінаў Афрыкі, ужо некалькі дзесяткаў гадоў з'яўляецца месцам, дзе ісламскі ўрад пераследуе хрысціянаў. У адной з ісламскіх вёсак некалькі жыхароў прынялі хрост. Іх адразу аддзялілі ад усёй супольнасці. Мужчынам забаранілі ўсялякія кантакты з суседзямі, а іх жонкам не дазвалялася чэрпаць ваду з агульнай студні. Хрысціянскія сем'і павінны былі выкапаць сабе студню. Праз некаторы час вясковая студня высахла. Тады хрысціяне дазволілі ісламскім братам карыстацца са сваёй крыніцы. А на іх дамах з'явіліся невялічкія таблiцы з надпісам: «Тут жывуць хрысціяне», каб

кожны ведаў, дзе можна знайсці зычлівую дапамогу (Ks. Z. Trzaskowski „Wspyiczesna Ambona”, Kielce).

Кожны ахрышчаны чалавек пакліканы словам і жыццём абвяшчаць Добрую Навіну, змяняць свет дзеля дабра ўсіх людзей і на хвалу Айцу.

***Разважанне:***

— Якім хрысціянінам з’яўляюся я?

— Як я выконваю свае абавязкі? Ці можна маю вучобу і працу назваць сумленнай?

— Як я адношуся да іншых людзей?

— Што я прыношу ў сваё асяроддзе?

— Якая мая мова? Якімі словамі я карыстаюся?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Падчас вячэрняй малітвы падзякуй Богу за дар сакрамэгту хросту.

2. На падставе выказвання Яна Паўла II на XII Сусветным дні моладзі адкажы пісьмова на пытанне: якое заданне стаіць перад хрысціянінам у сучасным свеце?

***Заключная малітва:*** падручнік вучня

Тэма № 4, VIII кл.

## ХРОСТ — САКРАМЭНТ НАВЯРТАННЯ

***Дыдактычная мэта:*** знаёмім з абрадамі хросту дзяцей і дарослых, асабліва звяртаючы ўвагу на моманты, у якіх гучыць заклік да навяртання.

***Выхаваўчая мэта:*** заахвочваем вучняў да няспыннага навяртання.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Дз 2, 38. Парадак хросту дзяцей. – Мінск, 2005. Парадак хросту дарослых. Фотаздымкі з хросту, лісты паперы для кожнай з груп, фламастэры.

***Метады катэхезы:*** размова, аналіз тэксту, праца ў групах, незакончаны сказ.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** Пс 63(62), 2–5.

**Чалавек пытае**

*К. распачынае размову з вучнямі*:

— Хто з вас калі-небудзь заблудзіўся, ішоў не па той дарозе?
— Як гэта адбылося?
— Што вы тады адчувалі?
— У каго прасілі дапамогі?
— Як можна згубіцца на дарозе жыцця?

**Бог адказвае**

Першародны грэх разарваў сувязь чалавека з Богам. Чалавек унутры стаў паранены: ў ім з'явілася схільнасць да зла. «У выніку першароднага граху чалавечая натура не цалкам сапсаваная, але зраненая ў сваіх натуральных сілах, падпарадкаваная няведанню, пакутам, уладзе смерці і схільная да граху. Гэтая схільнасць называецца пажадлівасцю» (Кампендый, 77). Таму Пан Бог заклікае кожнага з нас вуснамі св. Пятра:

«... Навяртайцеся, і няхай кожны з вас ахрысціцца у імя Езуса Хрыста дзеля адпушчэння грахоў вашых і атрымаеце дар Духа Святога ».

— Што значыць навяртацца?

*К. піша на дошцы слова **навяртацца** вертыкальна, а вучні «расшыфроўваюць» яго: запісваюць адказы, ужываючы літары гэтага слова. (падручнік вучня)*

імк **Н** уцца да святасці
пер **А** магчы грэх
**В** ыбраць Хрыста
зм **Я** ніць паводзіны
пап **Р** асіць прабачэння
**Т** варыць дабро
м **А** ліцца
жы **Ц** ь ў ласцы
спавядац **Ц** а
**А** драчыся ад зла

**Навяртанне** — гэта няспынны працэс, які распачынаецца ў момант прыняцця сакрамэнту хросту. Хрысціянін свядома і добраахвотна выбірае Хрыста і рашуча адкідвае злога духа і яго справы — менавіта ў гэтым заключаецца сутнасць навяртання.

*К. раздае вучням ксеракопіі з тэкстам абраду сакрамэнту хросту дарослых і звяртае ўвагу на заклік адрачэння ад зла; хтосьці з вучняў чытае гэты момант*:

— Да чаго святар заклікае катэхумэна?

— Што значыць «выракаюся зла, спакусаў, грэху»?

*К. прапануе вучням разгледзець фотаздымкі з хросту*:

Як бачым на фотаздымках, мы атрымалі хрост, калі былі яшчэ малымі дзецьмі, не здольнымі тады да барацьбы са злом. Як гэта адбывалася?

*К. раздае вучням ксеракопіі з тэкстам абраду хросту дзяцей і дае заданне знайсці галоўнае адрозненне паміж абрадам хросту дзіцяці і абрадам хросту дарослага чалавека.*

— Хто падчас нашага хросту, адракаючыся ад зла, урачыста ўзяў на сябе абавязак выхаваць нас па-хрысціянску?

На падставе веры нашых бацькоў і нашых хросных мы, яшчэ немаўлятамі, былі прынятыя ў супольнасць Касцёла, а потым узрасталі ў гэтай веры ў сям’і. Але ў нашым жыцці быў таксама такі момант, калі мы самі свядома складалі прысягу і ў прысутнасці ўсёй супольнасці Касцёла, казалі: «Выракаюся». (*К. запісвае гэтае слова на дошцы.)*

Успомніце, калі ласка, калі гэта адбывалася? (*Падчас прыняцця І-й святой Камуніі.)*

**Чалавек адказвае Богу**

У той момант, калі мы паабяцалі Пану Богу быць вернымі і змагацца са злом, спакусы і злыя схільнасці не зніклі аўтаматычна з нашага жыцця. Умацаваныя Божай ласкай мы працягваем гэту барацьбу штодня.

*К. дзеліць вучняў на 3 групы і дае ім заданне:*

Гледзячы праз прызму штодзённых абавязкаў, сустрэчаў, размоў, узаемаадносінаў з бацькамі і аднакласнікамі, падумайце, як мы можам выконваць сваё абяцанне. Закончыце сказ:

***Штодня я выракаюся зла — гэта значыць ... .*** (*прадстаўнікі груп чытаюць адказы, а К. змяшчае іх пад словам «Выракаюся», напісаным раней на дошцы).*

Хрост — гэта толькі пачатак твайго сяброўства з Хрыстом. Перад табой яшчэ доўгая дарога да дому Айца, даўжынёй ў цэлае жыццё, таму нельга спыняцца. Навяртанне не адбываецца раз і назаўсёды — гэта заданне на ўсё нашае жыццё. Кожная мая споведзь, кожная Эўхарыстыя, падрыхтоўка да сакрамэнту бежмавання — гэта мой удзел у няспынным навяртанні.

**Чалавек адказвае Богу**

Хоць ты і не прагнеш зла, аднак схільны да яго. Кожны дзень табе трэба рабіць выбар і вяртацца на шлях Хрыста, які для кожнага з нас з’яўляецца надзеяй на перамогу і прыкладам барацьбы са злом. Задумайся над сваімі

паводзінамі ў школе, на вуліцы, сярод сваіх сяброў і паразважай:

***Разважанне:***

— У чым заключаецца маё навяртанне?

— Што перашкаджае мне быць верным Хрысту?

— Якія плады прыносіць маё жыццё?

— Што трэба змяніць у маіх паводзінах?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Запішы ў свой сшытак дату твайго хросту, назву парафіі, дзе адбыўся твой хрост, і імёны тваіх хросных бацькоў.

2. Падчас рахунку сумлення ўспомні, калі была твая апошняя споведзь?

***Заключная малітва.***

Тэма № 5, VIII кл.

## ДУХ СВЯТЫ ЎМАЦОЎВАЕ КАСЦЁЛ

***Дыдактычная мэта:*** паказваем на тое, што Дух Святы з’яўляецца моцаю і крыніцаю жыцця Касцёла.

***Выхаваўчая мэта:*** заахвочваем вучняў да адкрыцця на дзеянне Духа Святога ў кожным з нас, якія з’яўляемся Касцёлам.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Дз 2, 1–6; Рым 12, 4. 8–11; Рым 12, 13. ККК 767–768. Карткі для кожнай групы, алоўкі, клей.

***Метады катэхезы:*** аналіз тэксту, праца ў групах.

### *Ход заняткаў*

Кожны раз, калі мы робім знак крыжа, мы згадваем Тры Божыя Асобы: Бога Айца, Сына і Духа Святога. Напэўна, падчас малітвы вы часта звярталіся да Бога Айца, дзякавалі Езусу за дар збаўлення, а як наконт Асобы Духа Святога? Наколькі Ён вядомы мне? Як Дух Святы дзейнічае ў маім жыцці, у жыцці Касцёла, да якога кожны з нас належыць праз хрост? Сёння падчас заняткаў мы будзем шукаць адказ на гэтыя пытанні, а распачнем іх малітвай да Духа Святога.

***Малітва:*** Валадару Нябесны, Суцяшыцель, Дух Праўды! Ты ўсюды прысутны і ўсё напаўняеш, Скарбніца дабра і Даўца жыцця, прыйдзі, пасяліся ў нас і ачысці нас ад усяго злога, і асвяці душы нашыя. Амэн.

**Чалавек пытае**

Перад сваім адыходам Езус абяцаў Апосталам спаслаць Духа Святога, які

ўмацуе іх. Прысутнасць і дзеянне Духа Святога не датычыць толькі некалькіх людзей, але ўсяго Касцёла — супольнасці люду Божага, да якога мы належым праз хрост. Касцёл не дзейнічае сам па сабе. Моцаю Духа Святога Пан Бог далучае кожнага з нас да сваёй справы адкуплення, прагнучы дзейнічаць у свеце праз нашыя рукі, сэрца, словы.

«Нягледзячы на сваю хваробу ў шпіталі я адчувала сябе вельмі добра, таму што ў наш пакой штодзённа прыходзіла „сонейка“ — маладая жанчына-ўрач, якая не толькі лячыла хворых, але і прыносіла ў нашае „шпітальнае“ жыццё шмат радасці. Яна суцяшала і падтрымлівала нас сваімі цікавымі апавяданнямі, яна ўмела адцягнуць увагу хворых ад іх цярпення. Яна сама мела невылечна хворае дзіця, але ніколі не дазваляла сабе быць у роспачы і сумаваць.Прыходзячы ў шпітальную каплічку на малітву, я вельмі часта бачыла там “нашае сонейка”. Я глядзела на яе і думала: „Якая ж вялікая моц Духа Святога дзейнічае ў гэтай жанчыне і праз яе перадаецца нам“».

— *Як дзеянне Духа Святога праяўлялася ў жыцці жанчыны-ўрача?*

Кожны з нас, дзякуючы сакрамэнту хросту, з’яўляецца жывою цаглінкай Касцёла. Сёння мы даведаемся пра тое, якім чынам Дух Святы ўмацоўвае Касцёл.

*Запіс тэмы:* **Дух Святы ўмацоўвае Касцёл.**

**Пан Бог адказвае**

Святое Пісанне апавядае, як Дух Святы аб’явіў сваю прысутнасць бачным спосабам і напоўніў сваёю моцаю сабраных у Вячэрніку Апосталаў і Марыю.

*На дошцы змяшчаем ілюстрацыю Спаслання Духа Святога і чытаем тэкст Дз 2, 1–6:*

«**Калі настаў дзень Пяцідзесятніцы, усе былі разам на адным месцы. І раптам узняўся шум з неба, нібы павеў моцнага ветру, і напоўніў увесь дом, дзе сядзелі яны. І з’явіліся ім языкі падзеленыя, быццам ад агня, і затрымаліся на кожным з іх. І напоўніліся ўсе Духам Святым, і пачалі гаварыць на іншых мовах, як Дух даваў ім прамаўляць. Былі ў Ерузалеме юдэі, людзі пабожныя з усякага народу пад небам. Калі ўзняўся шум гэты, сабралася мноства людзей, і захвалявалася, бо кожны чуў іх, што яны гавораць на ягонай мове**» (пар. Дз 2, 1–6).

*Пасля прачытання К. скіроўвае увагу вучняў на дзеянне Духа Святога ў жыцці Апосталаў і першага Касцёла.*

Моцаю Духа Святога Апосталы мужна пачалі абвяшчаць праўду аб Уваскрасенні Хрыста і ўдзялялі Духа Святога тым, хто паверыў і прыняў хрост. Умацаваны дарамі свайго Суцяшыцеля, Касцёл жыве і дзейнічае да нашых дзён.

*К. дзеліць клас на 3 групы. Вучні працуюць над тэкстам, адказваючы на пытанне. Адказы вучні змяшчаюць на плакаце.*
— Якія дары Дух Святы ўдзяляе Касцёлу?

І група:

*"Выканаўшы справу, якую Айцец даручыў Сыну здзейсніць на зямлі, у дзень Пяцідзесятніцы быў пасланы Дух Святы, каб бесперапынна асвячаць Касцёл. Тады " Ксцёл быў ўсім адкрыта аб'яўялены і праз абыяшчэнне пачалося распаўсюджванне Евангелля". З'яўляючыся "пакліканнем" усіх людзей да збаўлення, Касцёл, па самой сваёй сутнасці, пасланніца, якой Хрыстус даў місію ісці да ўсіх народаў, каб зрабіць іх вучнямі".* ( пар ККК 767).

ІІ група:

«Калі ж прыйдзе Ён, Дух праўды, навучыць вас усёй праўдзе. Бо не ад сябе будзе прамаўляць, а будзе казаць вам усё, што пачуў, і будучыню абвесціць вам» (пар. Ян 16, 13).

*" Усе мы, хто атрымаў аднаго і таго ж Духа, злучаныя адзін з адным і з Богам. (...) Гэты адзіны і непадзельны Дух сам па сабе вядзе да еднасці тых, хто мае адрозненне паміж сабою (...) і чыніць так, што ўсё выглядае, як бы адным у Ім. (...) Дух Божы, які жыве ў нас, адзіны і непадзельны, усіх нас вядзе да духоўнай еднасці".* (пар ККК 738).

ІІІ група:

«**Дары ёсць розныя, а Дух адзін і той самы; але кожнаму даецца выяўленне Духа на карысць: аднаму даецца Духам слова мудрасці, другому слова ведання, тым самым Духам; іншаму вера, тым самым Духам; іншаму дар ацалення, тым самым Духам; іншаму цудадзействы, іншаму прароцтва, іншаму распазнанне духаў, іншаму розныя мовы, іншаму тлумачэнне моваў. А ўсё гэта робіць адзін і той самы Дух, надзяляючы кожнага асобна, як Яму заўгодна**» (Рым 12, 4. 8–11).

**Чалавек адказвае Богу**

Дзеянне Духа Святога няспынна суправаджае Касцёл і Яго членаў. Дух Святы ўдзяляе дары нам — вызнаўцам Хрыста, каб мы, служачы адно аднаму ў любові, станавіліся адзіным Ягоным целам — Касцёлам, праз які ўсе людзі з'яднаюцца ў адну вялікую сям'ю і атрымаюць збаўленне. Таму вельмі важна быць адкрытым на дзеянне Духа Святога і ў малітве прасіць Яго аб распазнаванні свайго жыццёвага паклікання і годным выкананні сваіх хрысціянскіх заданняў.

Дух Святы — гэта крыніца аднаўлення як усяго Касцёла, так і нас, якія яго ўтвараем.

***Разважанне:***

— Наколькі часта я малюся да Духа Святога і аб чым я Яго прашу?

— Што я павінен змяніць у сваім жыцці, каб быць адкрытым на дзеянне Духа Святога?

— Як я магу ўключыцца ў актыўнае жыццё Касцёла?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Скласці ўласную малітву, у якой папросіш Духа Святога аб ўмацаванні ўсяго Касцёла, і паспрабаваць штодня маліцца гэтаю малітвай.
2. Напісаць, як ты разумееш словы св. Кірыла Ерузалемскага: «Тое, да чаго дакранаецца Дух Святы, асвячаецца і перамяняецца».

***Заключная малітва***

Духу Святы Божа, Даўца ўсялякіх дароў, пакорна просім Цябе за Касцёл святы, каб напаўняў Яго сваім святлом, мудрасцю і любоўю, а таксама ўсялякімі дарамі, патрэбнымі ў служэнні яго вернікам. Цябе просім...

Тэма № 6, VIII кл.

## У САКРАМЭНЦЕ КАНФІРМАЦЫІ ХРЫСЦІЯНІН АТРЫМЛІВАЕ МОЦ ДУХА СВЯТОГА

***Дыдактычная мэта:*** растлумачваем вучням, што такое сакрамэнт канфірмацыі, і якія ласкі дае Дух Святы ў гэтым сакрамэнце.

***Выхаваўчая мэта:*** падрыхтоўваем да свядомага супрацоўніцтва з Духам Святым.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: 2 Кар 3, 17–18; 1 Кар 2, 10–13; Ян 14, 26; Ян 3, 3–5; Лк 12, 11–12. ККК 1316. Ян Павел II (Кракаў, 1979).

***Метады катэхезы:*** праца ў групах, аналіз тэксту.

### ***Ход заняткаў***

***Малітва:*** Дух Святы, Ты, як моцны парыў ветру, парушаеш наш розум і сэрцы, каб мы на хвіліну затрымаліся і супакоіліся, паўтараючы за Табою словы любові, праслаўлення, падзякі і скрухі, а таксама просьбы аб тым, што Ты хочаш нам даць. Зрабі, каб за Табою і мы хацелі паўтараць найвялікшы заклік Сына: *Ойча наш...*

**Чалавек пытае**

*К. распачынае размову з вучнямі, робячы кароткае паўтарэнне:*

— Назавіце, калі ласка, якія сакрамэнты вы ведаеце?

— Якія з іх вы ўжо прынялі?

— Да прыняцця якога сакрамэнту вы рыхтуецеся?

Сёння мы пазнаёмімся з сутнасцю сакрамэнту канфірмацыі — сакрамэнту хрысціянскай сталасці, у якім Дух Святы адорвае чалавека мноствам Сваіх дароў.

**Бог адказвае**

*К. дзеліць вучняў на 5 груп, якія працуюць над пытаннем:*

— Аб якіх дзеяннях Духа Святога кажа Пан Езус?

I група:

«**Калі вас прывядуць у сінагогі, і да кіраўнікоў, і да ўлады, не турбуйцеся, як або што адказваць, ці што гаварыць, бо Дух Святы навучыць вас у тую гадзіну, што трэба казаць**» (Лк 12, 11–12).

II група:

«**Езус адказаў яму: Сапраўды, сапраўды кажу табе, калі хто не народзіцца нанова, не можа ўбачыць Божага Валадарства**» (Ян 3, 3–5).

III група:

«**Дух Святы навучыць вас усяму і нагадае вам пра ўсё, што Я сказаў вам**» (Ян 14, 26).

VI група:

«**Нам жа Бог адкрыў праз Духа, бо Дух пранікае ва ўсё, нават у глыбіні Божыя. Бо хто з людзей ведае чалавечае, акрамя духа чалавека, які ў ім самім? Так і Божага не ведае ніхто, акрамя Духа Божага. Мы ж прынялі не духа свету, але Духа ад Бога, каб спазнаць тое, што нам падаравана Богам. І мы гаворым пра гэта, навучаныя не словамі чалавечай мудрасці, але навучаныя Духам, і тлумачым духоўнае пры дапамозе духоўнага**» (1 Кар 2, 10–13).

V група:

«**Пан ёсць Духам, а дзе Дух Пана, там свабода. А мы ўсе з адкрытым аблічам углядаемся, нібы ў люстра, у славу Пана і перамяняемся ў той самы вобраз ад славы ў славу, так як праз Дух Пана**» (2 Кар 3, 17–18).

А зараз прачытайце, што пра сакрамэнт канфірмацыі кажа вучэнне Касцёла (*падручнік вучня*) :

*“ Канфірмацыя удасканальвае ласку хросту; гэта сакрамэнт, які дае нам Духа Святога для таго, каб мы глыбей ўкараняліся ў Божым*

*сыноўстве*
*і моцна злучыліся з Хрыстом, каб наша сувязь з Касцёлам стала больш трывалаю, каб мы маглі больш удзельнічаць у яго місіі. Ён дадзены нам нам як дапамога, каб мы сведчылі пра хрысціянскую веру словам, якое суправаджаецца ўчынкамі". (пар ККК 1316).*

Дух Святы ў сакрамэнце канфірмацыі:
— глыбей укараняе нас у «Божым сыноўстве»;
— мацней яднае нас з Хрыстом;
— умацоўвае нашую сувязь з Касцёлам;
— дапамагае нам сведчыць аб веры словамі і ўчынкамі.

**Чалавек адказвае Богу**

Сакрамэнт канфірмацыі — гэта не толькі дары, дадзеныя нам Духам Святым. Прачытайце, пра якія заданні, што стаяць перад канфірмаванымі, кажа Ян Павел II (*падручнік вучня):*

«Сакрамэнт канфірмацыі ў жыцці кожнага хрысціяніна павінен паспрыяць таму, што ён па меры свайго жыцця і паклікання стане „Сведкам Хрыста". Гэта сакрамэнт асаблівым чынам робіць верніка падобным да Апосталаў. Гэта сакрамэнт, які кожнага ахрышчанага ўводзіць у апостальства Касцёла. Гэты сакрамэнт павінен нараджаць у нас пачуццё асаблівай адказнасці за Касцёл, за Евангелле, за справу Хрыста ў душах людзей, за збаўленне свету. Сакрамэнт канфірмацыі мы прымаем адзін раз у жыцці, але гэта выпрабаванне веры і нашага характару».
— Дзякуючы чаму хрысціянін становіцца здольным да выканання гэтых заданняў? *(Адказы вучняў: малітва, Эўхарыстыя, споведзь і г.д.).*

Быць сведкам Хрыста — гэта значыць быць сведкам Яго любові, якая не баіцца цярпення, крыжа і нават смерці. Любові, якая ніколі не скончыцца, бо яна заўсёды гатовая прабачыць. Быць сведкам Хрыста — гэта значыць быць сведкам Яго ўваскрасення, маючы ў сабе новае жыццё ў Духу Святым.

***Развважанне:***
— Што значыць для мяне быць сведкам Хрыста?
— Як я абвяшчаю Хрыста ў сваім жыцці?
— Як я рыхтуюся да прыняцця сакрамэнту канфірмацыі?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

Вывучыць тэкст ККК 1316.

***Заключная малітва:***
Божа, перамяні нашыя сэрцы!
Спашлі Духа свайго Святога ў нашыя сэрцы
і аднаві ў нас ласку хросту.
Перамяні нашыя сэрцы і ўмацуй іх,
каб мы з радасцю давалі сведчанне Евангеллю.
Дапамажы нам паглыбіць нашу веру,
каб мы ў еднасці і любові
маглі служыць Табе і адзін аднаму.

*(«Молімся з Янам Паўлам II», Варшава 1997 г., стар. 19).*

Тэма № 7, VIII кл.

## ЭЎХАРЫСТЫЯ — КРЫНІЦА І ВЯРШЫНЯ ХРЫСЦІЯНСКАГА ЖЫЦЦЯ

***Дыдактычная мэта:*** указваем вучням на тое, што разуменне Эўхарыстыі дапамагае знайсці сваё месца ў Касцёле.

***Выхаваўчая мэта:*** заахвочваем да свядомага, актыўнага і пабожнага ўдзелу ў Эўхарыстыі.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Лк 22, 14–20. Ян Павел II. – Кракаў, 10 чэрвеня 1987 г. Ян Павел II. – Варшава, 8 чэрвеня 1987 г. Ілюстрацыі хлеба і вінаграда.

***Метады катэхезы:*** праца ў групах, аналіз тэксту.

### ***Ход заняткаў***

**Малітва:** *Пане, Ты запрашаеш мяне на сваю гасціну,*
*каб накарміць мяне сабою і паяднаць мяне з братамі і сёстрамі.*
*Дай мне ласку адкрыцця таямніцы Эўхарыстыі,*
*Твайго жыцця і ўваскрасення. Амэн.*

**Чалавек пытае**

*К. распачынае размову з вучнямі, запрашаючы іх прыгадаць дзень Першай Святой Камуніі:*

— Як вы перажывалі гэты дзень?
— Што з гэтага дня вам запомнілася больш яскрава?
— Які быў настрой?
— Што змянілася з таго часу ў вашым жыцці, а што засталося па-ранейшаму?

Сакрамэнт Эўхарыстыі прысутны ў нашым жыцці з дзяцінства. Але ці задумваліся вы калі-небудзь над тым, што нам дае Эўхарыстыя, які ўплыў яна

мае на жыццё і ўчынкі кожнага з нас?

*Запіс тэмы*: **Эўхарыстыя — крыніца і вяршыня хрысціянскага жыцця.**

У Старым Запавеце Эўхарыстыя была прадказана галоўным чынам у штогадовай пасхальнай вячэры, якая цэлебравалася кожны год габрэямі, якія спажывалі прэсны хлеб на ўспамін вызваленчага выйсця з Егіпта. Езус абвяшчае яе ў сваім навучанні і ўстанаўлівае яе, калі цэлебруе са сваімі Апосталамі Апошнюю Вячэру:

**Бог адказвае**

*Нехта з вучняў чытае ўрывак з Бібліі:*

«**Калі настала гадзіна, Езус узлёг за сталом, і Апосталы разам з Ім. І сказаў ім: "Я вельмі хацеў спажыць гэтую Пасху з вамі, перш чым буду цярпець, бо кажу вам, што ўжо не буду есці яе, аж пакуль яна не здзейсніцца ў Божым Валадарстве." І, узяўшы келіх, падзякаваў, і сказаў: "Вазьміце гэта і падзяліце паміж сабою, бо кажу вам, што адгэтуль не буду піць ад вінаграднага плоду, пакуль не прыйдзе Божае Валадарства."**
**І, узяўшы хлеб, падзякаваў, паламаў і даў ім, кажучы: "Гэта ёсць Цела Маё, якое за вас будзе выдана; гэта чыніце на Маю памяць." Таксама ўзяў**
**і келіх пасля вячэры, кажучы: "Гэты келіх ёсць новым запаветам у Крыві Маёй, якая за вас будзе праліта"**»

— Калі Пан Езус устанавіў сакрамэнт Эўхарыстыі?
— Якія знакі Ён выкарыстаў для гэтага?
— Што адбываецца падчас кожнай святой Імшы?

Давяраючы словам Пана Езуса, мы верым, што хлеб і віно пераўтвараюцца ў Ягонае Цела і Кроў. Ён дае нам сваё Цела, каб мы маглі жыць Яго жыццём і мелі жыццё вечнае.

Святы Айцец Ян Павел ІІ неаднойчы ў сваіх гаміліях гаварыў аб дары Эўхарыстыі і Яе неабходнасці для нас, а таксама заахвочваў усіх вернікаў да ўдзелу ў Ёй.

*Праца ў групах. Кожная з груп працуе над адным з пададзенных у падручніку тэкстаў, адказваючы на пытанне:*

— Што дае прыняцце сакрамэнту Эўхарыстыі?

І група

«Праз Эўхарыстыю вы знаходзіцеся заўсёды штодня ў самым „сэрцы“ вашага паклікання. І знаходзіцеся „ў сэрцы“ Касцёла... Сэрца Касцёла б'ецца эўхарыстычным рытмам. Менавіта гэта і ёсць рытм той любові, якою Хрыстус „палюбіў сваіх (...) бязмежна іх палюбіў“. І таму гэтая любоў трывае, прынятая

многімі, многімі людзкімі сэрцамі». (Ян Павел II. — Варшава, 8 чэрвеня 1987 г.).

II група

«Эўхарыстыя — гэта вялікі дар Уваскросшага Езуса, дадзены Касцёлу. Гэта новая пасхальная Вячэра Касцёла, унія Новага Запавету, якую Хрыстус пераказаў вучням як памятку сваёй смерці і ўваскрасення. У таямніцы Эўхарыстыі прысутнічае справа паяднання ўсіх людзей, здзейсненая праз крыж і ўваскрасенне Езуса Хрыста. Эўхарыстычна паяднаны Касцёл будзе верагодным знакам — сакрамэнтам еднасці ўсяго чалавецтва і супакою ў свеце» (Ян Павел II. – Варшава, 8 чэрвеня 1987 г.).

III група

«Эўхарыстыя — сакрамэнт укрыжаванага Хрыста і ўваскрослага. У гэтым знаку Яго пасхальная таямніца здзяйсняецца рэальным чынам: рэальнасцю Найсвяцейшага Сакрамэнта нашай веры... Хрыстус, які „праз уласную кроў увайшоў да вечнага прабывання, каб заступацца за нас“ як „адзіны Пасрэднік паміж Богам і людзьмі“, у гэтым сакрамэнце дапаўняе з дня ў дзень словы свайго абяцання: „Я з вамі“ (...) „Я з вамі аж да канца свету“» (Ян Павел II. Варшава, 8 чэрвеня 1987г. )

**Чалавек адказвае Богу**

*Групы прадстаўляюць вынікі сваёй працы. Карткі з тэкстамі К. змяшчае на дошцы побач з ілюстрацыяй хлеба і вінаграда. Затым вынікі працы вучні запісваюць у падручнік для вучня.*

Удзел у Эўхарыстыі з’яўляецца крыніцаю еднасці не толькі з Хрыстом, але і паміж намі. Гэтае адзінства не знікае, калі мы выходзім з Касцёла пасля святой Імшы. Калі мы хочам захаваць вернасць Хрысту, то павінны памятаць, што дзякуючы Эўхарыстыі мы ствараем адно Цела не толькі ў касцёле, але ўсюды: у сям’і, у школе і на стадыёне. Прымаючы Хрыста ў Эўхарыстычным хлебе, мы атрымоўваем безліч ласкаў і дароў, якія Езус хоча даць кожнаму з нас.

***Разважанне:***

Падчас кожнай святой Імшы Езус кліча мяне на сустрэчу з Ім.

— Як я адказваю на запрашэнне Хрыста сустрэцца з Ім у Эўхарыстыі?

— Чым для мяне з’яўляецца Эўхарыстыя? Гэта для мяне радасная сустрэча ці абавязак?

— Калі апошні раз я ўдзельнічаў у адарацыі Найсвяцейшага Сакрамэнту?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

С кладзі і запішы ўласную малітву, якою будзеш маліцца пасля прыняцця святой Камуніі.

***Заключная малітва:***

Пане, Ты запрашаеш мяне да сваёй гасціны, каб накарміць мяне сабою і паяднаць мяне з братамі і сёстрамі. Дай мне ласку адкрыцця таямніцы Эўхарыстыі, Твайго жыцця і ўваскрасення. Амэн.

Тэма № 8, VIII кл.

## ЭЎХАРЫСТЫЯ — ДАР ПРЫСУТНАСЦІ

***Дыдактычная мэта:*** звяртаем увагу вучняў на тое, што Ахвяра Хрыста, якая нястомна здзяйсняецца ў Эўхарыстыі, паказвае на Ягоную пастаянную прысутнасць у Касцёле.

***Выхаваўчая мэта:*** фарміруем у вучнях паставу ўдзячнасці Езусу за Ягоную прысутнасць сярод нас, заахвочваем да адарацыі Найсвяцейшага Сакрамэнту.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** ККК 1374, 1377, 1378. Ілюстрацыя Эўхарыстыі, табліца.

***Метады катэхезы:*** праца ў групах, плакат.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** *Славім Цябе, дзякуем Табе, ушаноўваем Цябе, о Езу, які з любові да нас устанавіў Найсвяцейшы Сакрамэнт, каб у Ім з намі знаходзіцца і быць штодзённым узмацненнем для нашых душ. Праслаўляем Цябе за гэта, узвялічваем і дзякуем.*

**Чалавек пытае**

Кожны з нас мае магчымасць сустрэцца з Езусам ў Эўхарыстыі, але не ўсе выкарыстоўваюць гэты цудоўны дар яднання са сваім Збаўцам. Прачытаайце, калі ласка, што піша ваш сябра (*падручнік вучня):*

*Набліжаецца нядзеля, і я павінен буду ісці на святую Імшу. Аднак я не адчуваю такой патрэбы. Я прыходжу ў касцёл, але мае думкі падчас святой Імшы недзе далёка. Я прыйшоў, бо так мне кажуць зрабіць. Ці не лепей было б увогуле не ісці ў касцёл на Імшу?*

— Як вы лічыце, чаму для гэтага маладога чалавека святая Імша здаецца такім цяжкім абавязкам?

— Што адбываецца падчас кожнай святой Імшы?

**Бог адказвае**

*Хтосьці з вучняў чытае тэкст ККК 1356–1357:*

*“ Хрысціяне цэлебруюць Эўхарыстыю з самага пачатку, а яе форма па сутнасці не мянялася на працягу стагоддзяў у розных літургічных абрадах. Таму што мы адчуваем сябе звязанымі наказам Пана, які Ён даў напярэдадні сваёй Мукі: “ Гэта чыніце на маю памяць” ( 1 Кар 11, 24-25). Мы выконваем гэты наказ Пана, здзяйсняючы на ўспамін Яго ахвяру. Пры гэтым мы складаем у ахвяру Айцу тое, што Ён сам нам даў: плён Яго тварэння – хлеб і віно, якія сталі моцаю Духа Святога і праз слова Хрыста, Целам і Крывёю Хрыста: такім чынам, Хрыстус рэальна прысутнічае, хоць і містычна. Значыць, мы павінны лічыць Эўхарыстыю:*

*- падзякаю і праслаўленнем Айца;*

*- успамінам ахвяры Хрыста і Яго Цела;*

*- прысутнасцю Хрыста, дзякуючы сіле Яго Слова і Яго Духа”. ( пар ККК 1356–1357).*

*К. змяшчае на дошцы плакат:*




*(вынікі працы вучні запісваюць у падручнік для вучня)*

Касцёл вучыць, што Эўхарыстыя — гэта ахвяра падзякі і праслаўлення, прынесеная Богу Айцу ад імя ўсяго стварэння, праз Хрыста, Яго Сына. Эўхарыстыя з’яўляецца ўспамінам, таму што выяўляе і здзяйсняе ахвяру, якую Хрыстус прынёс Айцу за ўсіх на крыжы дзеля збаўлення чалавецтва. Ахвяра крыжа і ахвяра Эўхарыстыі з’яўляюцца адной ахвярай. Адным з’яўляюцца ахвяра і ахвярадаўца, рознымі з’яўляюцца спосабы ахвярапрынашэння: крывавы — на крыжы, і некрывавы —у Эўхарыстыі.

На падставе тэкстаў ККК мы паспрабуем адказаць на пытанні, якія датычаць прысутнасці Хрыста ў Эўхарыстыі:

*К. дзеліць вучняў на 3 групы, якія працуюць з тэкстам ККК, адказваючы на пытанні, змешчаныя ў табліцы (падручнік вучня):*

**Група — пытанне — адказ**

I

— Чым адметны спосаб прысутнасці Хрыста ў Эўхарыстыі?

II

— Ад якога моманту распачынаецца прысутнасць Езуса ў Эўхарыстыі?

III

— Як мы аказваем хвалу Хрысту ў Эўхарыстыі?

I группа: *«Спосаб прысутнасці Хрыста ў Найсвяцейшым Сакрамэнце выключны. Ён узвышае Эўхарыстыю над усімі іншымі сакрамэнтамі і робіць яе „як бы дасканаласцю духоўнага жыцця і мэтаю, да якой імкнуцца ўсе сакрамэнты“. У святым сакрамэнце Эўхарыстыі „праўдзіва, рэальна і субстанцыяльна існуюць разам Цела і Кроў з душою і Боскасцю Пана нашага Езуса Хрыста, а, значыць, увесь Хрыстус“. Гэту прысутнасць называюць „рэальнаю“ не з-за выключнасці – нават калі б іншыя прысутнасці не былі „рэальнымі“, - але перш за ўсё таму, што яна субстанцыяльная і што праз яе цалкам увасабляецца Хрыстус, Бог і чалавек» (пар. ККК 1374).*

II група: *«Хрыстус становіцца прысутным у гэтым сакрамэнце праз пераўтварэнне хлеба і віна ў Цела і Кроў Хрыста. Айцы Касцёла рашуча пацвердзілі веру Касцёла ў дзейснасць Хрыстовага слова і дзеянне Духа Святога для здзяйснення гэтага пераўтварэння» (пар. ККК 1375).*

III група: *«Эўхарыстычная прысутнасць Хрыста пачынаеца ў хвіліну кансэкрацыі і працягваецца ўвесь час, пакуль існуюць эўхарыстычныя постаці. Хрыстус прысутнічае ва ўсёй паўнаце ў кожнай постаці і ў кожнай іх частцы, значыць ламанне хлеба не дзеліць Хрыста» (пар. ККК 1377).*

*«У Імшы мы паказваем нашу веру ў рэальную прысутнасць Хрыста ў постацях хлеба і віна, у прыватнасці, калі кленчым ці робім глыбокі паклон на знак адарацыі Пана. (...) Гэты культ пакланення, які належыць сакрамэнту Эўхарыстыі, Каталіцкі Касцёл практыкаваў заўсёды і практыкуе не толькі падчас Імшы, але і па-за ёю праз старраннае захаванне Найсвяцейшага Сакрамэнту, праз выстаўленне яго для публічнай адарацыі вернікаў і нясенне яго ў працэсіях» (пар. ККК 1378).*

*(Свае адказы вучні запісваюць спачатку ў табліцу, раней падрыхтаваную К., а затым у падручнік для вучня.)*

Езус застаўся з намі назаўсёды. Не толькі з выбранымі, якія былі з Ім, слухалі Яго словы, былі сведкамі Яго цудаў. Езус застаўся з усімі сваімі вучнямі незалежна ад месца, незалежна ад часу, у якім яны жывуць. Гэта самы вялікі Ягоны дар для чалавека.

**Чалавек адказвае Богу**

Айцец Раньера Канталамэса, прапаведнік папскага дома, называе малітву пакланення Найсвяцейшаму Сакрамэнту «перакрыжаваннем двух позіркаў» — Хрыста і нашага. Вось, як ён кажа пра малітву адарацыі: «Можа здарацца, што наш позірк слабее, але Ягоны — ніколі. Часам пакланенне Найсвяцейшаму Сакрамэнту — гэта толькі звычайнае прабыванне з Езусам, калі мы проста застаёмся пад Яго позіркам, і тым самым даём Яму магчымасць радавацца, гледзячы на нас. Нашае цела, думкі і пачуцці не ў стане зразумець гэтую невыказную рэчаіснасць, якая ў гэты момант дзейнічае ў нашай душы».

***Разважанне:***

— Якое значэнне для мяне мае прысутнасць Езуса Хрыста ў Эўхарыстыі?
— Аб чым я размаўляю з Езусам, калі прымаю Яго ў Эўхарыстыі?
— Як я ўдзельнічаю ў святой Імшы?
— Якая мая малітва падзякі за гэты бясцэнны дар?

***Пастанова.***

***Заключная малітва:***

*Малітва падзякі за дар Эўхарыстыі, а таксама перапрашэння за абыякавасць да святой Імшы.*

***Хатняе заданне***

Напішы, што атрымлівае чалавек, прымаючы св. Камунію?

Тэма № 9, VIII кл.

## ЕЗУС КОРМІЦЬ НАС СВАІМ СЛОВАМ

***Дыдактычная мэта:*** указваем на моц Божага слова і яго дзеянне ў Касцёле ад самага пачатку і да сённяшняга дня.

***Выхаваўчая мэта:*** заахвочваем вучняў услухоўвацца ў Божае слова і выконваць Яго.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Мц 4, 4; 2 Кар 5, 18–19; Лк 8, 54–55; Лк 1, 38. Карткі з элементамі літургіі слова, а таксама карткі, на якіх напісана, хто і якія функцыі выконвае падчас літургіі слова.

***Метады катэхезы:*** апавяданне, аналіз тэксту, праца ў групах.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** папросім Пана Бога аб тым, каб мы ўмелі прыняць слова, якое Ён скіруе да нас падчас сённяшняй катэхезы: *Пс* 119 (118), 105-106.125.133

**Чалавек пытае**

*К. распачынае з вучнямі размову з пытання:*

— Якую ролю выконвае слова ў жыцці чалавека?

Словы дапамагаюць нам лепш разумець адзін аднаго, дзяліцца пачуццямі, пераказваць патрэбную інфармацыю. Пан Бог праз вякі прамаўляе да чалавека. Ягонае слова мае асаблівую моц. Паслухайце, калі ласка, гісторыю адной сям'і, якая адчула гэтую моц. *(падручнік вучня)*

*Прафесар аднаго з універсітэтаў збіраў у сваю хатнюю бібліятэку рэдкія кнігі. Хоць ні сам прафессар, ні яго жонка не былі веруючымі людзьмі, яму вельмі хацелася, каб у час бязлітаснага атэізму 70-х гадоў паліцы ягонай бібліятэкі ўпрыгожвала яшчэ адна рэдкая кніга — Біблія. Ён не хацеў марнаваць час на пошукі гэтай кнігі і папрасіў сваіх сяброў знайсці яе, абяцаючы вялікія грошы. І сябры знайшлі, але, як высветлілася, гэта была Біблія для дзяцей. Прафесар з радасцю ўзяў яе, прынёс дадому, пахваліўся жонцы і ... з гонарам размясціў кнігу побач з іншымі «рарытэтамі». Ішоў час,*

*і прафессар ужо забыўся пра свой набытак, але аднойчы перад сном ён зазірнуў у пакой свайго дзевяцігадовага сына і аслупянеў ад нечаканасці. Ягоны сын стаяў на каленях, а побач ляжала разгорнутая дзіцячая Біблія. «Што ты робіш? Хто цябе гэтаму навучыў?» — спытаў разгублены прафесар. «Ніхто, тата, я проста размаўляю з тым, хто і табе, і мне падараваў жыццё», — адказаў хлопчык і падышоў, каб пацалаваць тату перад сном. Праз некаторы час прафесар і ўся яго сям'я прынялі сакрамэнт хросту.*

— Як Бог праз Сваё слова дзейнічаў у гэтай сям'і?

**Бог адказвае**

*Вучні працуюць над тэкстамі са Святога Пісання адказваючы на пытанні:*

І група:

«**А ўсё ад Бога, які праз Езуса Хрыста паяднаў нас з сабою і даў нам служэнне паяднання, таму што Бог у Хрысце яднаў з сабою свет, не зважаючы на грахі людзей і даючы нам слова паяднання**» (2 Кар 5, 18–19).

— Якія плады дае Божае слова?

II група:

«**Я не саромеюся Евангелля, бо гэта моц Божая, дадзеная для збаўлення кожнаму, хто верыць, спярша юдэю, а потым і грэку**» (Рым 1, 16).
— Якія плады дае Божае слова?

III група:

«**А Ён, выслаўшы ўсіх прэч і ўзяўшы яе за руку, усклікнуў: “Дзяўчына! Устань!” І вярнуўся дух яе; яна адразу ўстала; і Ён загадаў даць ёй есці**» (Лк 8, 54–55).
— Якія плады дае Божае слова?

IV група:

«**Тады Марыя сказала: “Вось я, слуга Пана. Няхай мне станецца паводле твайго слова**”» (Лк 1, 38).

— Як Марыя адказала на Божае слова?

V група:

«**А Ён сказаў у адказ: “Напісана: не хлебам адным будзе жыць чалавек, але кожным словам, што выходзіць з вуснаў Божых”»** (Мц 4, 4).
— Як Божае слова ўплывае на жыццё чалавека

Божае слова абʼяўляе самога Бога і Яго моц. Паўнатою абʼяўлення быў прыход Езуса Хрыста на зямлю, калі Спрадвечнае Слова стала Целам. Езус няспынна запрашае нас да стала свайго слова, прагне, каб гэтае слова, якое дае моц усім, Касцёл нёс свету. «Евангелле — гэта вусны Хрыста. Ён прабывае ў небе, але не перастае прамаўляць на зямлі», — кажа св. Аўгустын, падкрэсліваючы, што
у Божым слове прысутны Хрыстус. Св. Геранім параўноўвае Божае слова
з пасілкам, які неабходны для жыцця: «Хто не корміцца словам Божым, той не жыве».
— Якім чынам Касцёл пераказвае Божае слова?

**Чалавек адказвае Богу**

*К. раздае вучням карткі з элементамі літургіі слова, а таксама карткі, на якіх напісана, хто і якія функцыі выконвае падчас літургіі слова. Заданне вучняў — адпаведна іх дастасаваць:*

***Элементы літургіі слова***
• першае чытанне
• псальм

• другое чытанне
• спеў перад Евангеллем
• Евангелле
• гамілія
• вызнанне веры
• малітва вернікаў

***Хто выконвае функцыі***

• лектар
• псальміст (кантар)
• лектар
• псальміст
• дыякан альбо святар
• святар
• удзельнікі літургіі
• лектар і вернікі *( вынікі працы вучні запісваюць у падручнік)*

— Як адбываецца дыялог паміж Богам і ўдзельнікамі літургіі слова? *(адказы вучняў*).

Бог прамаўляе да нас словамі Святога Пісання. Уважліва слухаючы чытанне, Евангелле, гамілію, якую абвяшчае святар, мы чуем, што гэтымі словамі Пан Бог хоча сказаць нам. Мы адказваем Яму спевам, вызнаннем веры і малітвай верных. Перад усім адказам на Божае слова з'яўляецца нашае жыццё, згоднае з Божай Воляй.

Пан Бог скіроўвае да нас сваё слова, якое нясе праўду, жыццё і свабоду. Ён корміць нас сваім словам, якое ўмацоўвае ў нас веру, надзею і любоў.

***Разважанне:***

— Якое месца займае Божае слова ў святыні майго сэрца?
— Як я ўдзельнічаю ў літургіі слова?
— Як я спаўняў Божае слова ў штодзённым жыцці?
— Як часта я чытаю Святое Пісанне?
— Як часта я дзякую Пану Богу за словы Яго навукі?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

Напісаць, як ты разумееш словы св. Гераніма: «Хто не корміцца словам Божым, той не жыве».

***Заключная малітва:***

Просім Найсвяцейшую Маці, каб так, як Яна, мы разважалі над Божым словам у сваім сэрцы, прымалі Яго з даверам і жылі паводле Божай волі: *Вітай,*

*Марыя…*

Тэма № 10, VIII кл.

## ЕЗУС КОРМІЦЬ НАС СВАІМ ЦЕЛАМ

***Дыдактычная мэта:*** указваем на тое, якія плады прыносіць прынящце святой Камуніі.

***Выхаваўчая мэта:*** заахвочваем вучняў да поўнага ўдзелу ў святой Імшы, а таксама выхоўваем да падзякі за дар Эўхарыстыі.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Ян 6, 35 а. 51а. ККК 1391–1400. Плакат з біблійным тэкстам, дзве рознакаляровыя карткі, тэкст малітвы для кожнага вучня *(з малітоўніка* ***Ойча наш****, стар. 162).*

***Метады катэхезы:*** сонейка.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** спеў *Пане добры, як хлеб.*

**Чалавек пытае**

Напэўна, кожны з вас адчуваў калісьці голад ці смагу. Прыгадайце, калі ласка, як гэта было, як на гэта рэагаваў ваш арганізм? Якою была ваша рэакцыя?

Для таго, каб жыць вечна, чалавек павінен умацоўвацца Хлебам Нябесным. Падчас кожнай святой Імшы ад стала слова Хрыстус запрашае нас да алтара - стала Эўхарыстыі. Алтар — гэта сімвал самога Хрыста, які сам прысутнічае як ахвяра і які дае сябе нам як нябесную ежу.

(*Запіс тэмы*: Езус корміць нас сваім Целам.)

*К. раздае вучням карткі, на якіх яны пішуць, чым, на іх думку, з’яўляецца святая Камунія. Свае адказы вучні змяшчаюць на паперы ў выглядзе сонейка.*

**Бог адказвае**

Хлеб — гэта плён працы рук чалавека. Віно — гэта сімвал радасці і цярпення, а вада сімвалізуе чалавека. Падчас кансэкрацыі хлеб перамяняецца ў Цела Хрыста, віно — ў Кроў Хрыста, а вада, змешаная з віном, выражае нашую лучнасць і паяднанне з Хрыстом.

У Святым Пісанні мы чытаем, што Пан Езус няспынна запрашае нас да, каб мы спажывалі хлеб, які дае жыццё:

«**Езус сказаў народу: “Я ёсць хлеб жыцця; хто да Мяне прыходзіць, не будзе галодны (...). Я хлеб жывы, які сышоў з неба. Калі хто будзе есці гэты хлеб, будзе жыць вечна**”» (пар. Ян 6, 35а. 51а). *К. змяшчае на дошцы табліцу*

*з гэтым тэкстам.*

Хлеб — гэта тая ежа, якую мы спажываем часцей за ўсё. Праз гэты сімвал кожны можа зразумець, як часта Езус хоча прыходзіць да чалавека і якія плады дае прыняцце эўхарыстычнага хлеба. Як без хлеба, без ежы паволі гасне фізічнае жыццё, так без Эўхарыстыі ў чалавеку гасне духоўнае жыццё.

Цяпер, працуючы над тэкстамі ККК, мы даведаемся, што яшчэ дае чалавеку прыняцце святой Камуніі.

*Вучні запісваюць адказы, беручы карткі іншага колеру і «дабудоўваюць» сваімі адказамі сонейка, якое рабілі на пачатку занятка. Вынікі працы вучні запісваюць у падручнік.*

ККК 1391–1400

• святая Камунія паглыбляе нашае з'яднанне з Хрыстом;

• святая Камунія выконвае ў нашым духоўным жыцці тую ж функцыю, што і ежа для арганізма;

• прыняцце Цела Хрыстова падтрымлівае, паглыбляе і аднаўляе ў нас жыццё ласкі, атрыманай падчас хросту;

• святая Камунія захоўвае нас ад граху;

• Эўхарыстыя стварае Касцёл — містычнае Цела Хрыста; аднаўляе, умацоўвае і паглыбляе нашую прыналежнасць да гэтай супольнасці;

• Эўхарыстыя абавязвае нас дапамагаць убогім. Ласка, якою Хрыстус адорвае нас, Яго міласэрнасць, абавязвае нас быць міласэрнымі, дзяліцца матэрыяльнымі дабротамі.

• прыняцце святой Камуніі заклікае да братэрскай зычлівасці да хрысціянаў —праваслаўных і пратэстантаў.

**Чалавек адказвае Богу**

Каб прыняць святую Камунію, неабходна быць цалкам далучаным да каталіцкага Касцёла і быць у стане ласкі, гэта значыць не мець на сумленні смяротнага граху. Хто ўсведамляе, што ўчыніў цяжкі грэх, павінен прыступіць да сакрамэнту пакаяння, перш чым будзе прымаць святую Камунію. Важнымі з'яўляюцца таксама дух засяроджанасці і малітвы, захаванне прадпісанага Касцёлам посту і пастаў цела (жэсты, адзенне), што з'яўляецца знакам павагі да Хрыста.

Напэўна, кожны з нас памятае дзень сваёй I-й святой Камуніі, калі першы раз поўнасцю ўдзельнічаў у святой Імшы. Падзякуем Пану Богу за дар Эўхарыстыі, за дар I-й святой Камуніі, за ўсіх тых, хто дапамог нам рыхтавацца да Яе прыняцця.

*На працягу некалькіх хвілінаў вучні складаюць уласную малітву, запісваюць яе ў сшытак і моляцца ёю на заканчэнне ўрока.*

***Разважанне:***

Касцёл, выконваючы сваю місію і заданне, запрашае кожнага з нас да эўхарыстычнага стала.

— Як часта я дзякую Пану Езусу за дар Эўхарыстыі?
— Як часта я прымаю Езуса ў Эўхарыстыі?
— Кім з'яўляецца для мяне Езус, якога я прымаю ў Эўхарыстыі?
— Як часта я спавядаюся?
— Каго я магу заахвоціць прыйсці на наступную нядзельную св. Імшу?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Напісаць, якое значэнне мае для вучня прыняцце святой Камуніі.
2. Падкрэсліць, да чаго заклікае вучня гэта малітва:

Дзякую Табе, Пане святы Ойча, усемагутны вечны Божа, які мяне, грэшніка, нягоднага слугу Твайго, без ніякаіх маіх заслугаў, але толькі моцаю Тваёй міласэрнасці палічыў годным наталіць найдаражэйшым Целам і Крывёю Твайго Сына, Пана нашага Езуса Хрыста. Малю, каб гэтая святая Камунія не стала мне прысудам на пакаранне, але збавенным заступніцтвам для прабачэння. Няхай яна будзе для мяне зброяй веры і шчытом добрай волі. Няхай стане вызваленнем ад заганаў, пазбаўленнем ад прагавітасці і нястрыманасці, узрастаннем у любові і цярплівасці, у прастаце і пакоры ды ва ўсіх цнотах; моцнаю абаронаю ад подступаў усіх маіх ворагаў, як бачных, так і нябачных; дасканалым задавальненнем маіх памкненняў, як цялесных, так і духоўных; трывалым прабываннем у Табе — адзіным і праўдзівым Богу, а таксама шчаслівым заканчэннем майго жыцця. Малю Цябе, каб Ты меў ласку прывесці мяне, грэшніка, да той невымоўнай гасціны, дзе Ты з Сынам Тваім і Духам Святым, і з усімі святымі Тваімі з'яўляешся святлом праўдзівым, радасцю вечнаю, харастом завершаным і шчасцем дасканалым. Праз Хрыста, Пана нашага. Амэн.

## III. САКРАМЭНТЫ АЗДАРАЎЛЕННЯ

Тэма № 11, VIII кл.

### ПРЫЧЫНА ЗЛА Ў СВЕЦЕ

***Дыдактычная мэта:*** указваем прычыну, з якой паходзіць усялякае зло,

якое мы бачым ў свеце.

***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваем у вучнях імкненне да барацьбы са злом з дапамогай малітвы і святых сакрамэнтаў.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне — Быц 3, 2–5; Лк 4, 13; Лк 13, 16; Ян 8, 44; Ян 13, 27; Ап 12, 18; Эф 6, 10–18. Нажніцы, клей, папера ці газеты для вырабу даспехаў рыцара.

**Метады катэхезы:** аналіз тэксту, праца ў групах, пластычнае адлюстраванне.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** Звернемся да Маці Божай, якая ніколі не слухала д'ябла, а заўсёды выконвала Божую волю. *Тваёй абароне...*

**Чалавек пытае**

Калі мы назіраем за падзеямі ў свеце і людзьмі, паўстае пытанне, як узнікла зло? Мы чытаем у Кнізе Быцця, што Пан Бог стварыў свет добрым! Параўноўваючы свет, створаны Богам, і сучасны свет, мы не можам не заўважыць розніцы. Адкуль ў сэрцы чалавека з'явілася зло? Якім чынам мы можам змагацца з ім?

Падчас сённяшніх заняткаў мы будзем шукаць адказы на гэтыя пытанні. (*Запіс тэмы*: **Прычына зла ў свеце).**

**Бог адказвае**

Бог не стварыў зло. Зло ўвайшло ў свет не таму, што свет быў недасканалы, але таму, што чалавек сам, маючы вольную волю, яго выбраў. Кніга Быцця так апісвае гэтае здарэнне:

«**І сказаў змей жанчыне: “Ці сапраўды сказаў Бог: не ешце ні з якога дрэва ў раі?” І сказала жанчына яму: Мы можам есці плады з дрэў саду. Але пра плод дрэва, якое ў сярэдзіне раю, Бог сказаў: “ Не ешце яго і не дакранайцеся да яго, каб вам не памерці.” І сказаў змей жанчыне: “Не, не памрэце! Бо ведае Бог, што ў дзень, калі вы пакаштуеце з яго, адкрыюцца вочы вашыя, і будзеце, як Бог, які ведае дабро і зло”. І ўбачыла жанчына, што гэтае дрэва добрае для ежы, што яно прывабнае для вачэй і пажаданае дрэва для набыцця пазнання. Тады ўзяла яна плод яго і ела, і дала таксама мужу свайму, і ён еў**» (Быц 3, 2–5).

— У чым заключаўся грэх першых людзей?
— Хто схіліў іх да гэтага?

Так быў учынены першы грэх у гісторыі свету, з якім нараджаецца кожны чалавек і які да сённяшняга дня мае знішчальны ўплыў на жыццё чалавека. Кожны чалавек нараджаецца з наступствамі першароднага граху: з’яўляецца слабым, падлягае ўплыву зла, хварэе, адчувае цярпенне, памірае. На працягу ўсёй гісторыі чалавецтва д’ябал стараецца знішчыць чалавека, створанага на Божае падабенства. Кім жа з’яўляецца злы дух? Святое Пісанне дае яму мноства азначэнняў, якія яго характарызуюць.

*К. падае нумары раздзелаў і вершаў са Святога Пісання, вучні самастойна іх чытаюць і запісваюць ў падручнік азначэнні, якімі характарызуецца д’ябал. (падручнік вучня)*

«**Езус сказаў яму ў адказ: Сказана: не будзеш выпрабоўваць Пана Бога твайго. І скончыўшы ўсе выпрабаванні, д’ябал адступіў ад Яго да пары**» (пар. Лк 4, 13). *(Спакусіцель.)*

«**А гэтую дачку Абрагама, якую звязаў сатана ўжо васемнаццаць гадоў назад, ці не трэба было вызваліць ад гэтых путаў у дзень шабату**?» (пар. Лк 13, 16). *(Мае моц апанавання людзей.)*

«**Ваш бацька д’ябал, і вы хочаце выконваць прыхамаць бацькі вашага, а ён быў душагуб ад пачатку і не ўстаяў у ісціне, бо няма ў ім ісціны; калі кажа ён няпраўду, кажа сваё, бо ён ашуканец і бацька няпраўды**» (пар. Ян 8, 44). *(Забойца, айцец усялякага падману.)*

«**І пасля спажыцця кавалка ўвайшоў у яго д’ябал. І Езус сказаў яму: Што робіш, зрабі хутчэй**» (пар. Ян 13, 27). *(Мае ўплыў на чалавека, які яму аддаецца.)*

«**І раз’юшыўся цмок на жанчыну і пайшоў, каб уступіць у бойку з апошнімі ад насення яе, якія захоўваюць запаведзі Божыя і маюць сведчанне Езуса Хрыста**» (пар. Ап 12, 18). *(Ненавідзіць Бога і ўсіх Яго слугаў.)*

Сын Божы праз сваю смерць і ўваскрасенне вызваліў нас з моцы д’ябла. Падчас хросту, першага сакрамэнту, які мы атрымалі ў жыцці, Езус Хрыстус вызваліў нас ад першароднага граху і ўсіх асабістых грахоў Новае жыццё ў ласцы, атрыманае падчас хросту, не знішчае слабасці чалавечай натуры і яе схільнасці да зла. Воля чалавека параненая першародным грахом, таму чалавеку часта вельмі цяжка супрацьстаяць злу. Аднак, калі маеш свядомасць, што змагаешся не адзін, што разам з табой за тваё збаўленне змагаецца Езус — гэта дадае сілаў і адвагі. Найлепшая абарона супраць подступаў д’ябла — гэта малітва і жыццё ў лучнасці з Хрыстом. Святы Павел падказвае нам, з якою Божаю зброяю мы можам супрацьстаяць уплыву д’ябла і яго спакусам:

«**Нарэшце, браты, мацуйцеся ў Пану магутнасцю сілы Ягонай.**

**Апраніцеся ва ўсю зброю Божую, каб вы маглі супрацьстаяць ашуканствам д’ябла. Бо нашая барацьба не супраць крыві і цела, але супраць панаванняў, супраць уладаў, супраць гаспадароў цемры свету гэтага, супраць нябесных духаў злосці. Дзеля гэтага прыміце ўсю зброю Божую, каб вы маглі супрацьстаяць у дзень ліхі і, усё адолеўшы, выстаяць. Таму станьце, падперазаўшы сцёгны свае праўдаю, і апрануўшыся ў панцыр справядлівасці, і абуўшы ногі ў гатовасць дабравесціць спакой. А разам з усім вазьміце шчыт веры, якім зможаце пагасіць усе распаленыя стрэлы злога. І шлем збаўлення вазьміце, і меч духоўны, якім ёсць слова Божае. Ва ўсялякай малітве і просьбе маліцеся ў Духу пры кожнай нагодзе. А дзеля гэтага дбайце з усёй стараннасцю і маліцеся за ўсіх святых**» (Эф 6, 10–18).

**Чалавек адказвае Богу**

*К. дзеліць вучняў на 6 груп. Кожная з іх, абапіраючыся на словы св. Паўла, павінна зрабіць адзін з элементаў Божай зброі. Кожны з элементаў вучні могуць дапоўніць малюнкамі, сімваламі і словамі:*

I група — шлем
II група — пояс
III група — панцыр
IV група — меч
V група — шчыт
VI група — абутак

*Прэзентацыя працы вучняў: кожная з груп прадстаўляе свой элемент зброі, паясняе з якога «матэрыялу» ён зроблены, тлумачыць сэнс малюнкаў і надпісаў на ім.*

Той, хто хоча быць сапраўдным рыцарам Хрыста, павінен штодня перамагаць спакусы і разам з Хрыстом працаваць над сваёй дасканаласцю.

***Разважанне:***

— Як часта я дзякую Езусу Хрысту за дар збаўлення?
— Ці выракаюся я ў сваім штодзённым жыцці злога духа і ўсіх спраў ягоных?
— Што я раблю для таго, каб выправіць зло, якое ёсць у маім жыцці?
— Калі апошні раз я быў у споведзі?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Падчас вячэрняга рахунку сумлення папрасі у Пана Бога прабачэння за зло, учыненае сёння.

2. Выберы з даспехаў рыцара і намалюй у сшытак тую зброю, якая патрэбна табе для барацьбы са злом.

***Заключная малітва:***

Памолімся да нашага нябеснага Айца, каб Ён бярог нас ад усялякага зла. *Ойча наш.*

Тэма № 12, VIII кл.

# ГРЭХ ЗНІШЧАЕ ГОДНАСЦЬ ЧАЛАВЕКА

***Дыдактычная мэта:*** растлумачваем вучням, што кожная залежнасць чалавека, кожны яго грэх — гэта адыход ад Бога.

***Выхаваўчая мэта:*** дапамагаем усвядоміць, што сапраўдную свабоду дае нам Хрыстус. Заахвочваем да сістэматычнай працы над сабою, над фарміраваннем сваёй індывідуальнасці.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Быц 1, 26–28. 31. Часопісы і газеты, нажніцы, клей, 2 намаляваныя чалавечыя контуры, каменьчыкі для кожнага вучня.

***Метады катэхезы:*** праца ў групах.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** папросім Св. Духа, каб асвяціў нашае сэрца і розум, паказваючы нам, што з'яўляецца дабром, а што нам пагражае. Пс 139 (138), 1-3, 14-15 (*падручнік вучня)*

**Чалавек пытае**

*Кожнаму вучню К. дае каменьчык, кажа пакласці яго сабе ў абутак і зрабіць некалькі крокаў. Вучні вымаюць з ботаў каменьчыкі і дзеляцца тым, як яны сябе з імі адчувалі. К. параўноўвае грэх да такога камня.*

Камень перашкаджае, абцяжарвае хадзьбу, брудзіць шкарпэткі, але да яго можна прызвычаіцца, асабліва калі ён размясціўся ў выгадным месцы, і забыцца пра яго. Падобным чынам можа адбывацца з грахом, да якога трапляеш у залежнасць: ён раніць, перашкаджае, прыводзіць да наступных грахоў, знішчае нашае жыццё. З цягам часу можна да яго прызвычаіцца, таму так важна яго ўсвядоміць, каб не трапіць у стан духоўнай смерці. Тэма нашых сённяшніх заняткаў: **Грэх знішчае годнасць чалавека.**

**Бог адказвае**

Святое Пісанне кажа, што Пан Бог стварыў чалавека на свой вобраз і падабенства.

*Хтосьці з вучняў чытае тэкст Бібліі:*

**«І сказаў Бог: Учынім чалавека паводле Нашага вобразу і Нашага падабенства.» (пар. Быц 1, 26).**

Чалавек — цудоўнае стварэнне Бога, але тады, калі чалавек успрымае свабоду як самаволю і робіць толькі тое, што сам хоча, не задумваючыся аб наступствах сваіх дзеянняў, незаўважна для сябе ён трапляе ў залежнасць.

Бог прагне, каб кожны чалавек заставаўся з Ім у блізкіх адносінах любові і даверу. Аднак, грэх супраціўляецца гэтаму, адварочваючы ад Бога нашыя сэрцы, раніць Яго любоў, прыводзіць да залежнасці, якая знішчае чалавечую годнасць.

……………………………………….

| **Залежнасць, якой падаецца сучасны чалавек** | **Прычыны, па якіх чалавек трапляе ў залежнасць** | **Наступствы, якія прыносіць гэтая залежнасць у жыццё чалавека** |
|---|---|---|
| | | |

Чалавек выйшаў цудоўным стварэннем з Божых рук! Ён прыгожы, радасны, гарманічны, вольны. Але ў момант, калі чалавек успрымае вольнасць як самаволю і робіць толькі тое, што сам хоча, не задумваючыся аб наступствах сваіх дзеянняў, незаўважна для сябе ён пачынае змяняцца.

*К. дзеліць клас на 2 групы. Адна з іх прцуе над рысамі чалавека, які трапіў у залежнасць ад граху, другая – над рысамі свабоднага чалавека.*

Праз грэх чалавек трапляе ў стан залежнасці, якая прыводзіць да духоўнай, а часам і фізічнай смерці. У святле веры залежнасць з’яўляецца найвялікшым няшчасцем чалавека, і таму, каб з ёю змагацца, неабходна яе распазнаць, распазнаўшы — вызнаць, а вызнаўшы — паяднацца з Богам у сакрамэнце пакаяння. Чалавеку не хапае ўласных сілаў, каб вырвацца з няволі залежнасці, таму Езус чакае кожнага з нас у сакрамэнце пакаяння, каб вярнуць нам свабоду, радасць і годнасць дзяцей Божых.

**«Набліжаліся да Езуса ўсе мытнікі і грэшнікі, каб слухаць Яго. А фарысеі і кніжнікі наракалі, кажучы: Ён прымае грэшнікаў і есць з імі. Але Езус расказаў фарысеям і кніжнікам наступную прыпавесць, кажучы: Хто з вас, маючы сто авечак і згубіўшы адну з іх, не пакіне дзевяноста дзевяці ў пустыні і не пойдзе па згубленую, пакуль не знойдзе яе? А знайшоўшы, возьме яе на плечы свае з радасцю і прыйдзе дадому, пакліча сяброў і суседзяў, кажучы ім: Радуйцеся са мною, бо я знайшоў маю згубленую авечку. Кажу вам, што таксама на нябёсах больш радасці будзе з аднаго грэшніка, які пакаяўся, чым з дзевяноста дзевяці праведнікаў, якія не патрабуюць пакаяння » (Лк 15, 1-8).**

**Чалавек адказвае Богу**

Каб не знішчыць у сабе прыгажосць і годнасць Божага дзіцяці, мы штодня павінны працаваць над сабою. Ян Павел II так аднойчы звярнуўся да моладзі: «Вы павінны ад сябе патрабаваць, нават калі іншыя ад вас нічога не патрабуюць!» *(Ян Павел II, Ясная Гара 1983 г.).*

***Разважанне:***

— Як я разумею гэты заклік?
— Што сёння пагражае маёй свабодзе?
— Якія патрабаванні я стаўлю самому сабе, каб не трапіць у залежнасць?
— Да чаго Бог заклікае мяне праз сённяшнюю катэхезу?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

— Пастарайся выконваць свае пастановы ў штодзённым жыцці

— Складзі і занішы малітву за асоб, якія трываюць у залежнасці. Пастарайся як мага часцей маліцца словамі гэтай малітвы.

***Заключная малітва:***

Наш найлепшы Ойча, Ты заўсёды нас любіш, нават калі мы абражаем Цябе сваімі грахамі. Дай нам сілы штодня змагацца з нашымі слабасцямі. *Цябе просім...*

Пане Божа, асвяці нас сваім святлом, каб мы не блукалі. *Цябе просім...*

Ойча, навучы нас любіць Цябе так, як Ты нас любіш. *Цябе просім...*

Навучы нас, Пане Божа, прабачаць нашым вінаватым і аддалі ад нас усе спакусы. *Цябе просім...*

Дадай нам сілаў, каб мы штодня набліжаліся да Цябе і каб нашае жыццё

падабалася Табе. *Цябе просім...*

Тэма № 13.

## ЦЕЛЫ ВАШЫЯ — ГЭТА СВЯТЫНЯ ДУХА СВЯТОГА

***Дыдактычная мэта:*** распавядаем вучням аб тым, якія разбуральныя наступствы прыносіць парнаграфія ў жыццё чалавека. Паказваем вучням, якую вялікую вартасць мае цела чалавека – бо яно з'яўляецца святыняй Духа Святога.
***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваем у вучнях жаданне берагчы сваё цела ў чысціні, ставячы сабе патрабаванні і шануючы годнасць іншай асобы.
***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: 1 Кар 6, 20; Мц 5, 27-28.
***Метады катэхезы:*** апавяданне, незакончаны сказ, праца ў групах.

*Ход заняткаў*

***Малітва:*** *Чыстае сэрца створы ўва мне, Божа, і аднаві ўва мне трывалы дух. Не адкінь мяне ад свайго аблічча і не пазбаў мяне Духа Твайго Святога. Пс 51 (50), 12-13*

***Чалавек пытае***

Кожная залежнасць чалавека ад граху з'яўляецца пагрозай для яго духоўнага жыцця. Калі чалавек трывае ў граху — гэта аслабляе, а з цягам часу знішчае духоўнае жыццё чалавека, бо праз грэх чалавек разрывае сваю сувязь з Богам.

Адным з такіх грахоў з'яўляецца парнаграфія, якая прыносіць і ў духоўнае, і ў фізічнае жыццё чалавека разбуральныя наступствы.
Тэма нашага сённяшняга занятку: Целы вышыя – гэта святыня Духа Святога.

У адным з фільмаў распавядалася такая гісторыя (падручнік вучня):

*Аднойчы, малады чалавек, які займаўся плаваннем, вечарам пасля трэніроўкі "сэрфуючы" па розных сайтах інтэрнэту, зусім выпадкова натрапіў на сай з парнаграфічнымі фотаздымкамі. Прагледзець фотаздымкі цалкам перашкодзіла мама, якая нечакана ўвайшла ў яго пакой. У наступны вечар гэты малады чалавек яшчэ раз знайшоў гэтыя сайты і прагледзеў*

*«учарашнія» фотаздымкі цалкам. Паступова, пасля заняткаў у школе, гэты хлопец усё часцей і часцей заглядваў на розныя парнаграфічныя сайты інтэрнэту. Аб гэтым даведалася яго мама і папрасіла бацьку паразмаўляць з сынам. Хлопец паабяцаў бацькам, што больш не будзе гэтага рабіць, але праз некаторы час парушыў сваё абяцанне. Трэба заўважыць, што бацькі гэтага хлопца, былі вельмі мудрымі і любячымі бацькамі, але ўся гэтая сітуацыя прывяла да таго, што бацька і маці сталі ўсё часцей канфліктаваць паміж сабою. Бацька казаў, што «новае захапленне» сына – гэта часовая з'ява, маці не згаджалася, бачучы, як гэтае «захапленне» пачынае ўплываць на жыццё іх дзіцяці. Хлопец пачаў падманваць бацькоў, казаў, што ідзе да сяброўкі, якая дапаможа ў матэматыцы, а сам выходзіў, каб дзесьці знайсці кампутар, каб прагледзець сайты з парнаграфіяй. Потым гэты малады чалавек пачаў красці ад маці грошы, бо некаторыя з гэтых сайтаў былі платныя. Аднойчы малодшы брат гэтага хлопца ўвайшоў у пакой і ўбачыў, якія фотаздымкі глядзіць яго старэйшы брат. Пры ўмове, што ён не раскажа маці, малады чалавек паказаў іх малодшаму брату, які сам потым скап'яваў іх на дыск і занёс у школу, каб падзяліцца са сваім сябрам. Парнаграфія як вірус пачала распаўсюджвацца. Яна знішчыла ўзаемаадносіны паміж бацькамі героя, зруйнавала ўзаемаадносіны паміж ім і яго братам, паміж ім і дзяўчынай, якая яму падабалася, паміж ім і яго сябрамі, паміж ім і яго настаўнікамі. Ён «закінуў» плаванне, пагоршыліся адзнакі ў школе. Спатрэбілася вельмі многа часу, каб нанава адбудаваць тое, што так хутка і не заўважна для самога героя знішчыла парнаграфія.*

— Як парнаграфія «ўвайшла» ў жыццё маладога чалавека?
— Што яна прынесла з сабою ў жыццё гэтага маладога чалавека?
— Чаму парнаграфія прыносіць у жыццё чалавека такія разбуральныя наступствы?

На падставе гісторыі вучні з дапамогай К. запісваюць этапы, якія праходзіць асоба, залежная ад пагнаграфіі:

- - **этап залежнасці** — асоба штораз часцей набывае новыя матэрыялы, якія маюць у сабе парнаграфічныя сцэны, шукае матэрыялы ў інтэрнэце.
- - **этап страты уражлівасці** — матэрыялы, якія спачатку ўзрушвалі сваёй сутнасцю, цяпер успрымаюцца як норма.
- - **этап “снежнага кому”** — каб атрымаць такі ж стан задавальнення як на пачатку, асоба шукае ўсё больш драстычныя матэрыялы.
- - **этап уцелаўлення ў жыццё** — узнікае жаданне самаму ажыццявіць тое, што адлюстроўваюць парнаграфічныя матэрыялы.

Чалавека, які праходзіць ад аднаго этапу да другога з упэўненнасцю можна назваць залежным. Але не такім Пан Бог хоча бачыць сваё стварэнне.

***Бог адказвае***

Святое Пісанне кажа:

**«Ці не ведаеце, што целы вашыя — гэта святыня Духа Святога, які ў вас, якога вы маеце ад Бога, і што вы не належыце сабе самім? Бо вы куплены за вялікую цану. Таму слаўце Бога ў целе вашым» (1 Кар 6, 19).**

— Што святы Павел гаворыць пра цела чалавека?

*К. запрашае вучняў папрацаваць над пытаннем, чаму цела чалавека ў вачах Бога мае такую вялікую вартасць? Вучні запісваюць свае адказы на табліцы:*

***Цела чалавека***

- - адкрывае Божы план адносна мужчыны і жанчыны
- - ад моманту св.Хросту з'яўляецца святыняй св.Духа
- - адкупленае мукай і смерцю Хрыста
- - робіць магчымым рэалізацыю паклікання
- - падчас Эўхарыстыі становіцца прытулкам для Хрыста
- - робіць магчымым катакт чалавека з навакольным светам і іншымі асобамі
- - служыць для выражэння любові і для пераказу жыцця
- - дапамагае выразіць сябе
- - з'яўляецца "інструментам" душы і г.д.

Цела чалавека ў вачах Бога мае вялікую каштоўнасць. Хрыстус, Сын Божы, уцелавіўся — гэта значыць прыняў людское цела, а праз гэта асвяціў яго. Бог адарыў чалавека здольнасцю панаваць над жаданнямі свайго цела, каб чалавек не змарнаваў сваёй годнасці, не знішчыў «святыні Духа Святога».

У Евангеллі паводле Мацвея Езус перасцерагае:

**«Вы чулі, што сказана: Не распусьнічай. Я ж вам кажу: хто з пажадлівасцю глядзіць на жанчыну, ужо ўчыніў з ёю распусту ў сэрцы сваім. Калі правае вока тваё спакушае цябе, вырві яго і адкінь ад сябе; бо лепей табе, каб загінуў адзін з тваіх членаў, чым усё цела тваё будзе кінута ў геену. І калі правая рука твая спакушае цябе, адсячы яе і адкінь ад сябе, бо лепей табе, каб адзін з членаў тваіх загінуў, чым усё цела тваё пойдзе ў геену»** (Мц 5, 27-28).

К. дзеліць клас на 2 групы, дае ім карткі, на якіх вучні павінны запісаць, як яны разумеюць гэтыя словы:

***Група 1:***

*« Калі ж правае вока тваё спакушае цябе, вырві яго і кінь ад сябе » — гэта значыць….*

***Група 2:***

*«Калі правая твая рука спакушае цябе, адатні яе і кінь ад сябе » — гэта значыць….*

*Вучні прэзентуюць сваю працу.*

Гэтыя словы Езуса вельмі радыкальныя. Чаму? Бо Езус ведае, што адбываецца з чалавекам, які трапляе ў залежнасць ад граху. Чалавек, залежны ад парнаграфіі, не будзе ў стане любіць ні Бога, свайго Стварыцеля, ні іншага чалавека, ні самога сябе. Некаторыя асобы, якія трываюць у граху парнаграфіі, кажуць: «Я ненавіджу сябе за тое, што раблю, але не магу спыніцца». Чалавек, які носіць ў сэрцы столькі бруду, які ненавідзіць сябе, ніколі не ўбачыць чыстасці іншага чалавека і не зможа пакахаць яго.

У чалавеку адбываецца няспынная ўнутраная барацьба паміж духам і целам, а гэта значыць паміж любоўю і пажадлівасцю. У гэтай барацьбе пераможа той, хто сам для сябе паставіць патрабаванні дзеля абароны такіх каштоўнасцяў, як чыстасць, любоў, годнасць іншай асобы, сужэнства, сям'я. Вельмі важна, ставячы перад сабой патрабаванні, папрасіць дапамогі ў Хрыста, каб разам з Ім распачынаць і заканчваць кожны дзень свайго жыцця.

***Чалавек адказвае Богу***

У часопісе «Любите друг друга» можна знайсці вельмі шмат сведчанняў, у якіх маладыя людзі распавядаюць аб тым, як разам з Хрыстом змагаліся са сваімі слабасцямі і грахамі. Вось адно з іх:

*«Я спрабаваў заснуць, але не мог, бо перад вачамі ўзнікалі вобразы, якія затрымаліся ў маёй памяці пасля прагляду парнаграфічных сайтаў. Аналізуючы свае паводзіны, я заўважыў, што мой эмацыянальны і фізічны стан увесь час пагаршаецца. Я стаў незадаволеным, агрэсіўным,*

*напружаным. Мне стала страшна ад таго, што я не паную над сабой. А што са мной будзе праз год, два, тры… ? Я ўстаў з ложка і пачаў шчыра маліцца, просячы ў Хрыста прабачэння і дапамогі. Не ведаю, колькі гадзін я так стаяў, але калі скончылася мая размова з Езусам, я ўбачыў сонца, якое пачынала ўзыходзіць над зямлёй. Не, падумаў я, я не хачу распачынаць новы дзень, трымаючы тое, што атручвае і брудзіць мяне. Я спаліў усе часопісы, паламаў дыскі, якія хаваў у сваім пакоі. Мне нават захацелася прыбраць і памыць свой пакой. А потым я пайшоў на ранішнюю святую Імшу, каб «навесці парадак у сваёй душы». Я адчуў, што я ажываю, што разам з новым днём распачынаецца новы этап майго жыцця. Калі Ты маеш такія клопаты, якія меў я, хачу даць табе параду: зрабі адразу ж гіганцкі крок наперад, не чакай, пакуль гэта атрута знішчыць цябе. Самаму цяжка, але калі будзеш гэта рабіць з Хрыстом, убачыш, што для Яго няма немагчымых спраў!» (* Станіслаў ).

Такія сведчанні яшчэ больш упэўніваюць нас, што разам з Хрыстом — Пераможцам д’ябла, граху і смерці, мы пераможам спакусы і слабасці, якія з’яўляюцца перашкодай на дарозе да нашай святасці.

***Разважанне:***

— Якія фільмы я гляджу? Якія я чытаю часопісы?

—Якія патрабаванні я стаўлю самому сабе, каб не трапіць у залежнасць ад граху?

— Як я адношуся да ўласнага цела?

— Да чаго Бог заклікае мяне праз сённяшнюю катэхезу?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Памаліся аб ласцы навяртання для тых, хто жыве ў граху парнаграфіі.
2. Прачытай адзін з артыкулаў часопіса “ Любите друг друга”, у якім маладыя людзі даюць сведчанне свайго “уваскрашэння” з граху.

***Заключная малітва:***

*Маці прачыстая, — маліся за нас.*
*Маці беззаганная, — маліся за нас.*
*Маці непарушная, — маліся за нас.*
*Маці нявінная, — маліся за нас.*

Тэма № 14, VIII кл.

## ПАКАЯННЕ Ў КАСЦЁЛЕ

***Дыдактычная мэта*:** тлумачым моладзі сутнасць хрысціянскага пакаяння, якое разумеецца, як *метаноя* — навяртанне. Стараемся перадаць моладзі дух хрысціянскага пакаяння.

***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваем у моладзі імкненне прыкладваць намаганні для штодзённага навяртання.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне, плакат з тэкстам: Ян 20, 21–23; Лк 19, 1–10. Карткі і алоўкі для кожнай групы, шклянка.

***Метады катэхезы:*** праца ў групах, аналіз тэксту.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** *падручнік вучня*

**Чалавек пытае**

*К. бярэ ў рукі шклянку:*

Шклянка мае сваю вартасць, дзякуючы таму, з чаго яна зроблена. Яна можа быць з фаянсу, шкла, гліны і нават золата. У яе можна наліць вады, насыпаць жвіру альбо напоўніць яе каштоўнымі камянямі, і тады яе вартасць значна павялічыцца. Але калі б ў шклянцы быў пясок, а мы хацелі б напоўніць яе каштоўнымі камянямі, у нас нічога не атрымалася б. Для таго, каб шклянка выконвала сваю функцыю, нам спачатку трэба яе ачысціць, бо ў напоўненай шклянцы больш нічога не змяшчаецца, а з бруднай ніхто не хоча піць. Таксама і з чалавекам. Пра знешнюю прыгажосць чалавека мы кажам, гледзячы на ягоны твар, колер вачэй, валасоў, на будову цела. Як і наша шклянка, чалавек можа быць чымсьці напоўнены: радасцю, супакоем, любоўю, альбо надварот, — сумам, злосцю, нянавісцю. Гледзячы на гэта мы кажам: «Маладушны, нявыхаваны», — альбо: «Шчыры, адкрыты. Святы, Божы чалавек». Адносна Бога чалавек можа прыняць і такую паставу (*К. адварочвае шклянку ўверх дном*). Любоў Бога будзе дакранацца чалавека, але ніколі яго не напоўніць. Можа здарыцца так, што калісьці мы станем перад Богам прыгожыя, але… пустыя. Для таго, каб Бог мог нас напоўніць, мы павінны дазволіць Яму ачысціць нас з бруду граху і ўласнага эгаізму (*К. адварочвае шклянку ўніз дном*). Такое ачышчэнне адбываецца ў сакрамэнце пакаяння.

**Бог адказвае**

Першародны грэх разарваў сувязь чалавека з Богам, а таксама стаў прычынай унутранага канфлікту ў самім чалавеку. Калі мы знаёміліся з сакрамэнтам хросту, то казалі, што гэты сакрамэнт аўтаматычна не знішчае наступстваў першароднага граху, але з’яўляецца пачаткам шляху няспыннай

барацьбы са злом. Каб нам дапамагчы на нашым няспынным шляху навяртання, Езус устанавіў сакрамэнт пакаяння, ці інакш сакрамэнт паяднання, прабачэння, споведзі.

*К. змяшчае на дошцы тэкст устанаўлення сакрамэнту пакуты, нехта з вучняў чытае:*

«**Тады Езус зноў сказаў ім: “Спакой вам! Як паслаў Мяне Айцец, так і Я пасылаю вас”. І, сказаўшы гэта, дыхнуў, і кажа: “Прыміце Духа Святога. Каму адпусціце грахі, таму будуць адпушчаны; на кім пакінеце, на тым застануцца**”» (пар. Ян 20, 21–23).

Прыступаючы да сакрамэнту пакаяння, чалавек павінен прызнацца ў сваіх грахах, мець шчыры жаль за ўчыненае зло і жаданне направіць зло, шчыра вызнаць грахі і ўзнагародзіць Богу і чалавеку за ўчыненую крыўду. Навяртанне распачынаецца ад унутранай перамены, якую Святое Пісанне акрэслівае як *metanoia* (з грэч. *перамена сэрца)*. Сапраўднае навяртанне закранае ўсяго чалавека: ягоны розум, душу і нават цела, але пачынацца яно павінна з сэрца. Пастунова дзякуючы дзеянню Божай ласкі зменіцца і жыццё чалавека. Такая перамена адбылася і з мытнікам Закхеем, пра якога мы чытаем у Евангеллі паводле Лукі:

«**Езус увайшоў у Ерыхон і праходзіў праз яго. І вось адзін чалавек па імені Закхей, кіраўнік мытнікаў і багаты, стараўся ўбачыць Езуса, хто Ён такі, але не мог з-за натоўпу, таму што быў малога росту. Забегшы наперад, ён залез на смакоўніцу, каб убачыць Яго, бо Ён павінен быў там праходзіць. Калі Езус прыйшоў на гэтае месца, паглядзеў уверх і сказаў яму: “Закхей, хутчэй спускайся, бо сёння Мне трэба быць у тваім доме”. Той хутка спусціўся і прыняў Яго з радасцю. А ўсе, убачыўшы гэта, пачалі наракаць і казалі, што Ён зайшоў пагасціць да грэшнага чалавека. Закхей жа ўстаў і сказаў Пану: “Вось палову маёмасці сваёй, Пане, я аддам убогім і, калі каго ў чым ашукаў, аддам у чатыры разы больш”. Езус сказаў яму: “Сёння прыйшло збаўленне ў гэты дом, таму што і ён сын Абрагама. Бо Сын Чалавечы прыйшоў знайсці і выратаваць тое, што загінула**”» (Лк 19, 1–10).

— Кім у вачах людзей быў Закхей?
— Як яго ўспрымала асяроддзе?
— Як Езус адносіўся да яго?

*Вучні працуюць у 3-х групах:*

I група: *запісвае рысы Закхея да сустрэчы з Езусам.*
II група*: запісвае рысы Закхея пасля сустрэчы з Езусам.*
III група: *характарызуе паставу Езуса.*
*Вынікі працы вучні запісваюць у падручнік для вучня.*

**Закхей**

— Да сустрэчы з Езусам. — Пасля сустрэчы з Езусам

**Езус**
— У жыцці Закхея Езус з’яўляецца як Той, Хто ПРАХОДЗІЦЬ ПОБАЧ.
— Закхей не мае адвагі падысці, а Езус ГЛЯДЗІЦЬ НА ЯГО З ЛЮБОЎЮ.
— Езус НЕ ЗМУШАЕ, пакідае Закхею выбар.

— Што адбылося ў і жыцці Закхея, дзякуючы сустрэчы з Езусам?

**Чалавек адказвае Богу**

У захаванні Закхея пасля сустрэчы з Езусам мы бачым радыкальныя змены. Закхей сустрэўся з прабачэннем, якое напоўніла яго жыццё супакоем і радасцю.

У паставе Закхея мы можам выдзяліць істотныя этапы, дзякуючы якім адбылася гэта перамена. Гэтыя этапы з’яўляюцца дасканалым адлюстраваннем умоў сакрамэнту пакаяння. (*Вучні самі шукаюць іх у жыцці Закхея.)*

- ***рахунак сумлення*** — неспакой, свядомасць таго, што ён ашукваў людзей;
- ***жаль за грахі*** — узрушаны любоўю Хрыста, шкадуе за ўчыненае зло;
- ***пастанаўленне выправіцца*** — пры сустрэчы з Езусам вырашае змяніць сваё жыццё;
- ***шчырая споведзь -*** Закхей шчыра вызнае перад Езусам усе свае правіны.
- ***выкананне пакуты*** — Закхей хоча направіць крыўды, якія ён учыніў людзям. «Палову маёмасці сваёй, Пане, я аддам убогім і, калі каго ў чым ашукаў, аддам у чатыры разы больш».

Нашае навяртанне — гэта няспынны працэс, які распачаўся у нашым жыцці ад сакрамэнту хросту. Езус, «праходзячы побач», «гледзячы на нас з любоўю», заахвочвае нас да выбару дабра. Ён кліча нас да супольнай працы над уласным збаўленнем.

***Развражанне:***
— Як я адказваю на заклік да навяртання, з якім Езус пастаянна звяртаецца да мяне?
— Калі апошні раз я прыступаў да сакрамэнту пакаяння?
— Як я выконваю пастанаўленне, зробленае мною на споведзі?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Памаліся аб ласцы навяртання для тых, хто жыве ў граху.
2. Напішы, што ты атрымліваеш, прыступаючы да сакрамэнту пакаяння.

***Заключная малітва:***

Пане Езу, вызнаю перад Табою, што я грэшнік. Мае грахі аддзяляюць мяне ад Цябе і ад людзей. Прашу Цябе аб ласцы, каб я мог адчуць Тваю міласэрнасць у сакрамэнце пакаяння. Дух Святы, умацоўвай мяне да штодзённай барацьбы са спакусамі і беражы ад граху. Табе хвала навекі. Амэн.

Тэма № 15, VIII кл.

## САКРАМЭНТ ПАКАЯННЯ

***Дыдактычная мэта:*** указваем на сэнс сакрамэнту пакаяння. Указваем на Бога як на любячага Айца, які прабачае нам грахі.

***Выхаваўчая мэта:*** фарміруем паставу навяртання і пакаяння.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** ККК 1431, 1434, 1448, 1451, 1454, 1455, 1459, 1461, 1468, 1469.

***Метады катэхезы:*** праца ў групах.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** акт жалю.

**Чалавек пытае**

Вызнанне грахоў не з’яўляецца прыемнай справай, і, напэўна, заўсёды будзе суправаджацца пачуццём сораму. Падчас сваёй першай споведзі амаль усе дзеці хочуць прыйсці да «свайго» святара. З цягам часу — зусім наадварот — да

незнаёмага, які сядзіць у канфесіянале ў самым цёмным месцы касцёла.

Некаторым людзям сакрамэнт споведзі прыносіць вялікі клопат. Вось, як піша адзін ваш равеснік *(падручнік вучня):*

«Вечарам, напрыканцы пражытага мною дня, я вельмі часта спрабую прааналізаваць свае паводзіны і ўбачыць памылкі, дапушчаныя мною ў гэты дзень. У такія хвіліны мне прыходзіць думка аб тым, чаму нельга спавядацца непасрэдна Богу? Усведамляючы свае дрэнныя ўчынкі, я шкадую за ўчыненае зло і шукаю спосабаў, каб гэтае зло выправіць. Чаму для таго, каб я мог паяднацца з Богам, паміж намі абавязкова павінен быць святар? Перад споведдзю я заўсёды адчуваю сябе неяк няёмка: „Што святар пра мяне падумае? Што мне на гэта адкажа?“ Гэта ўвесь час мяне турбуе. Ды і як я магу абяцаць выправіцца, калі і так ведаю, што не стрымаю слова?»

— Якія цяжкасці адчувае малады чалавек у сувязі з прыняццем сакрамэнту пакаяння?
— Чаму некаторыя людзі пазбягаюць споведзі? (*Размова з вучнямі.*)

Часцей за ўсё гэта адбываецца таму, што не ўсе правільна разумеюць сутнасць сакрамэнту споведзі.

На мінулых занятках мы пачалі размову пра сакрамэнт пакаяння. На сённяшняй сустрэчы мы паразважаем над тым, з кім мы сустракаемся ў гэтым сакрамэнце. Пазнаёмімся таксама з біблейскай асновай сакрамэнту пакаяння, даведаемся, як Касцёл тлумачыць таямніцу вяртання чалавека да Бога. (*Запіс тэмы:* Сакрамэнт пакаяння.)

**Бог адказвае**

*На дошцы К. змяшчае табліцу, якую запаўняюць вучні, адказваючы на пытанні, працуючы з тэкстамі ККК:*

I група

ККК 1431, 1434

— Чым з’яўляецца пакаянне і якія формы яно можа прымаць у жыцці хрысціяніна?

Пакаянне — гэта:

• радыкальная змена жыцця;
• акт шчырага вяртання да Бога;
• адыход ад зла з агідай да ўчыненых грахоў;
• імкненне і станоўчае рашэнне змены жыцця;
• надзея на Божую міласэрнасць і спадзяванне на дапамогу Божай ласкі.

II група:

ККК 1454, 1451, 1455 і 1459

— Якія чыны пэнітэнта з’яўляюцца самымі важнымі?

III група:

ККК 1461, 1448

— Якія чыны спаведніка зяўляюцца самымі важнымі?

IV група:

ККК 1468, 1469

— Якія плёны прыносіць сакрамэнт пакаяння?

*Свае адказы вучні запісваюць ў табліцы, запаўняючы спачатку 1-ю і 2-ю графу. Затым К. чытае тэкст ККК 1449, вучні ўважліва слухаюць і пасля прачытання разам дапаўняюць 3-ю графу — дзеянне Пана Бога ў сакрамэнце пакаяння:*

У формуле адпушчэння грахоў, якой карыстаецца Касцёл лацінскага абраду, выражаны асноўныя элементы гэтага сакрамэнту: Айцкц міласэрнасці ёсць крыніцай усялякага прабачэння. Ён здзяйсняе прымірэнне грэшнікаў праз Пасху Свайго Сына і дар Свайго Духа прах малітву і паслугу касцёла: *Бог, Айцец міласэрнасці, смерцю і ўваскрасеннем Сына Свайго прымірыў светх Сабою і спаслаў Святога Духа ждя адпушчэння грахоў, з дапамогай Свайго касцёла няхай адорыць цябе прабачэннем і спакоем. І я адпускаю табе грахі ў імя Айца і Сына і Сятога Духа. Амэн. (пар. ККК 1449).*

***Чыны пэнітэнта:***

- рахунак сумлення;
- жаль за грахі;
- цвёрдае пастанаўленне выправіцца;
- шчырая споведзь;
- выканане прызначанай пакуты.

***Чыны спаведніка:***

- адпушчэнне грахоў у імя Хрыста;
- устанаўленне спосабу пакуты;
- малітва за грэшніка.

***Пан Бог:***

- Аказвае ЛЮБОЎ І МІЛАСЭРНАСЦЬ;
- ПРАБАЧАЕ;
- ДАЕ ЛАСКУ;
- АДОРВАЕ СУПАКОЕМ.

**Чалавек адказвае Богу**

Споведзь — гэта не размова са святаром, які павінен адпавядаць маім патрабаванням. Споведзь — гэта НАВЯРТАННЕ ў прысутнасці святара, праз якога Бог адпускае грахі.

*Група 4 прадстаўляе вынікі сваёй працы. Вынікі працы вучні запісваюць у падручнік.*

Плады сакрамэнту пакаяння:

***Паяднанне з Богам***

• вяртанне Божай ласкі;
• умацаванне сяброўства з Богам;
• супакой у сумленні;
• «духоўнае ўваскрашэнне»;
• вяртанне годнасці і жыцця Божых дзяцей.

***Паяднанне з Касцёлам***

• вяртанне да братэрскай супольнасці;
• аднаўленне жыцця Касцёла, які цярпеў ў выніку граху аднаго са сваіх членаў.

Найлепшым выражэннем нашага пакаяння з’яўляецца наш жаль, цвёрдае пастанаўленне выправіцца і шчырае вызнанне грахоў падчас споведзі перад святаром, які дзейнічае ад імя Хрыста. Вызнанне на споведзі нават лёгкіх грахоў горача рэкамендуецца Касцёлам, бо гэта дапамагае чалавеку правільна фарміраваць сумленне і змагацца супраць дрэнных схільнасцяў, дапамагае даверыцца аздараўленню праз Хрыста і ўзрастаць у духоўным жыцці.

Касцёл не толькі заахвочвае да пакаяння, але жадае таксама дапамагчы хрысціяніну праз заслугі Езуса Хрыста і святых атрымаць ад міласэрнага Айца дараванне часовай кары за грахі — адпуст. Дзякуючы адпустам вернікі, праз паслугу Касцёла і пры выкананні пэўных умоў, могуць атрымаць дараванне часовай кары за грахі для сябе, а таксама для душаў, якія знаходзяцца ў чыстцы.

***Разважанне:***

— Як да гэтага часу я разумеў сэнс сакрамэнту пакаяння?
— Колькі я прыкладваю намаганняў, каб змяніць свае паводзіны да лепшага?
— Як я магу выразіць удзячнасць Хрысту за Яго бязмежную любоў да мяне?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Падзякуй Пану Богу за дар святарства і за спаведнікоў.
2. Напішы адказ на пісьмо, якое чыталася на пачатку сённяшняй катэхезы.

***Заключная малітва*** Спантанная.

Тэма № 16, VIII кл.

## ХРЫСЦІЯНІН ПЕРАД АБЛІЧЧАМ ХВАРОБЫ І ЦЯРПЕННЯ

***Дыдактычная мэта:*** указваем на сэнс хваробы і цярпення ў святле веры, асабліва праз прызму мукі, смерці і ўваскрасення Езуса.

***Выхаваўчая мэта:*** фарміруем паставу хрысціянскага прыняцця цярпення, заахвочваем да малітвы ў інтэнцыі хворых.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: 2 Кар 4, 16–17;1П 4, 13. ККК 1501; Ян Павел II. *Salvifici doloris*. Крыж.

***Метады катэхезы:*** праца ў групах.

### *Ход заняткаў*

***Малітва:*** Пс 34(33), 2. падручнік вучня

Геніяльнае функцыянаванне чалавечага арганізму на працягу жыцця падлягае зменам. Здароўе чалавека паслабляюць і знішчаюць знешнія і ўнутраныя фактары: фізічныя, псіхічныя, індывідуальныя, грамадскія. Хвароба з’яўляецца неад’емным элементам чалавечага жыцця.

**Чалавек пытае**

Цярпенне і хвароба чалавека — гэта адно з найцяжэйшых пытанняў, якія апошнім часам усё больш турбуюць чалавецтва. На падставе ўласнага вопыту і назіранняў адкажыце на пытанне:

— Чым з’яўляецца цярпенне?

— Чаму ў жыцці чалавека ўзнікае цярпенне?

— Як чалавек можа перажываць цярпенне?

Прачытайце ў сваіх падручніках апавяданне пра адну дзяўчыну Юлю, прыкладна вашага ўзросту, якая страціла зрок і сутыкнулася ў сваім жыцці з таямніцай цярпення:

«Разам са сваімі сябрамі Юля прысутнічала на парафіяльнай сустрэчы моладзі, якую праводзіў святар. Падчас размовы з маладымі людзьмі святар задаў такое пытанне: «Цікава, аб чым вы папрасілі б Езуса, калі б цяпер Яго ўбачылі?» Моладзь вельмі актыўна пачала выказваць свае просьбы, навокал стала вельмі шумна, паступова чарга дайшла да Юлі. Усе былі ўпэўненыя, што яна папросіць Езуса аб вяртанні ёй зроку. «Я хачу, каб на зямлі перасталі бушаваць войны», — распачала свой адказ Юля. «Я прашу ў Езуса супакою для ўсяго свету, каб паміж людзьмі знікла нянавісць, сваркі, зайздрасць, каб людзі перасталі крыўдзіць і зневажаць адно аднаго. Я прашу ў Езуса спакою, любові і радасці для ўсяго свету, для кожнай сям’і, для кожнага чалавека». Яшчэ некалькі

хвілін пасля яе слоў у класе стаяла цішыня…»

— Як Юля перажывае ўласнае цярпенне?

**Бог адказвае**

Для таго, каб адказаць на пытанне пра сэнс людскога цярпення, Святое Пісанне спачатку скіроўвае нас да крыжа Езуса. (*К. змяшчае крыж так, каб яго бачылі ўсе вучні.*) Дзякуючы Хрыстоваму цярпенню на крыжы адбылося збаўленне свету. Мука Езуса вызваліла нас ад многіх наступстваў першароднага граху, але не вызваліла нас ад цярпення і болю. Чаму? Цярпенне ў жыцці чалавека мае вялікае значэнне. Грамадства называе хворага чалавека «неэфектыўным», «які не прыносіць карысці», «страчаным для грамадства». Езус, прайшоўшы праз цярпенне і смерць да ўваскрасення, вучыць нас, што хвароба не з'яўляецца выключна негатыўным здарэннем у жыцці чалавека, што яна мае глыбокі сэнс.

*Праца ў групах:*

I група:

«Мы не губляем адвагі, бо, хоць знешні наш чалавек і тлее, духоўны з дня ў дзень абнаўляецца. Часовае лёгкае цярпенне нашае дае нам бязмернае багацце вечнай славы» (пар. 2 Кар 4, 16–17).

— Якія плёны прыносіць цярпенне ў жыццё чалавека?

II група:

*“ Хвароба можа (...) зрабіць чалавека больш сталым, дапамагчы яму адрозніць, што ў яго жыцці неістотнае, каб звярнуцца да істотнага. Вельмі часта хвароба вядзе да пошуку Бога, да навяртання да Яго”. (пар. ККК 1501).*

— Якую паставу дапамагае асягнуць хвароба?

III група:

«**Але паколькі вы прымаеце ўдзел у муках Хрыстовых, радуйцеся, каб і ў час аб'яўлення славы Яго вы ўсцешыліся і ўзрадаваліся**» (пар. 1 П 4, 13).

— Як хрысціянін павінен прымаць цярпенне?

IV група:

«Часам нас робіць нясмелымі тое, што мы не можам „аздаравіць“, што ні ў чым не можам дапамагчы. Перамагайце ў сабе гэты страх. Вельмі важна прыйсці, каб быць пры церпячым чалавеку. Можа нават больш, чым аздараўленне, хвораму патрэбны чалавек, людское сэрца, людская салідарнасць». *Ян Павел II. Salvifici doloris,29. (падручнік вучня)*

— Як хрысціянін павінен адносіцца да хворых і церпячых?

Кожнае цярпенне мае моц перамяніць чалавека. Цярпенне можа ачысціць унутраны свет чалавека. Часам ты сам можаш заўважыць, як у хваробе людзі становяцца іншымі: адкрываюць у сваім жыцці прысутнасць церпячага разам з імі Хрыста, а таксама сэнс малітвы, заўважаюць клопат іншых людзей, імкнуцца ў святле Божага Провіду адшукаць сэнс цярпення, аналізуюць пражытае жыццё і стараюцца выправіць крыўды і памылкі, вяртаюцца на шлях Божых запаведзяў. Хворы робіць гэта не ад страху перад смерцю, але таму, што, дзякуючы ўласнаму цярпенню, інакш пачаў глядзець на жыццё. Тое, што раней здавалася галоўным, цяпер адышло на другі план. Кожная хвароба і цярпенне павінны прыводзіць нас да крыжа Езуса, інакш яго нельга зразумець. Калі хворы зразумее, што цярпенне чыніць яго падобным да церпячага Хрыста, і ён можа духоўна з’яднацца з Ім, то такое цярпенне атрымлівае збаўчую моц. Ахвяруючы сваё цярпенне за іншага чалавека, хворы можа выпрасіць для яго мноства ласк. Праз сваё цярпенне хворы далучаецца да асвячэння Касцёла і ўсіх людзей, за якіх Езус цярпеў і ахвяраваў сябе.

**Чалавек адказвае Богу**

Езус прыняў цярпенне, каб збавіць нас. Сёння ўсіх хворых людзей Ён запрашае да ўдзелу ў сваім цярпенні. Таямніцу цярпення чалавеку цяжка прыняць і зразумець. Але ў нашым жыцці ёсць яскравыя прыклады жыцця людзей, якія сваё ўласнае цярпенне ахвяруюць для збаўлення іншых людзей. Для кожнага чалавека такім прыкладам перажывання ўласнага цярпення, а таксама клопату за хворых людзей з’яўляецца Ян Павел II. Такія прыклады мы можам знайсці і ў нашым асяроддзі.

Вы, напэўна, таксама сустракаліся з такімі прыкладамі ў сваім жыцці? *(Прыклады вучняў.)*

***Разважанне:***

— Як я да гэтага часу разумеў цярпенне?
— Як я прымаю тое цярпенне, якое сустракаю ў сваім жыцці?
— Ці заўважаю я ў сваім асяроддзі хворых і церпячых?
— Як я адношуся да хворых людзей?
— Што я магу зрабіць для хворых людзей з маёй парафіі?

***Пастанова.***

***Заключная малітва:*** *падручнік вучня*

***Хатняе заданне:***

1. У бліжэйшы час пастарайся наведаць кагосьці хворага.
2. Пастанова штодзённай малітвы за хворых і церпячых.
3. Напішы, у чым ты бачыш сэнс цярпення.

Тэма № 17, VIII кл.

## НАМАШЧЭННЕ ХВОРЫХ – ДАПАМОГА Ў ПРЫНЯЦЦІ ЦЯРПЕННЯ.

*Пан адпускае беззаконні твае і вылечвае ўсе твае хваробы.*
*Ён жыццё ратуе ад загубы, літасцю і міласэрнасцю цябе каранує.*
*Пс 103 (102), 3-4*

Уся гісторыя чалавецтва пасля першароднага граху пазначана знакам цярпення, хваробы і смерці. Хвароба робіць чалавека слабым, патрабуючым дапамогі і апекі. Чалавек у сваім цярпенні не пакінуты сам-на-сам са сваёй хваробай. Езус Хрыстус прыходзіць да хворага чалавека з дапамогай.

**Заданне:**

1. Прыгадай і запішы знаёмыя табе з Евангелля факты аздараўлення людзей, якія ўчыніў Езус.

- .......................................................
- .......................................................
- .......................................................
- .....................................................
- .......................................................

Хрыстус прыйшоў, каб вылечыць усяго чалавека — яго душу і цела. Працягваючы справу Хрыста, Касцёл ад самага пачатку клапоціцца пра хворых людзей, удзяляючы ім сакрамэнт намашчэння хворых.

**«Нехта сярод вас хварэе?Няхай пакліча прэзбітэраў Касцёла, а яны няхай памоляцца над ім і намасцяць яго алеем у імя Пана. І малітва веры ўратуе хворага, і Пан падыме яго, і грахі, якія учыніў, будуць адпушчаныя яму»** ( Як 5, 14 -15 ).

У сакрамэнце намашчэння хворых, які Касцёл удзяляе хвораму чалавеку, намашчэнне азначае асаблівы ўдзел хворага ў збаўчым цярпенні Хрыста. У

гэтым сакрамэнце Хрыстус заклікае хворага да з’яднання свайго цярпення з Яго цярпеннем. Цярпенне набывае іншы сэнс: хворы не толькі пакутуе, а таксама становіцца ўдзельнікам цярпенняў Езуса, які ахвяраваў сябе дзеля збаўлення ўсяго свету і ўсіх людзей.

2. Прачытай наступныя тэксты вучэння Касцёла і падкрэслі адказ на пастаўленыя ніжэй пытанні.

*«Толькі святары (прэзбітэры і біскупы) могуць удзяляць сакрамэнт намашчэння хворых; для гэтага яны карыстаюцца алеем, благаслаўленным біскупам ці, пры неабходнасці, самім прэзбітэрам, які ўдзяляе гэты сакрамэнт» (пар. ККК 1530).*

— Хто можа ўдзяляць сакрамэнт намашчэння хворых?

*«Істотным ва ўдзяленні гэтага сакрамэнту з’яўляецца намашчэнне чала і рук хворага ( згодна з Рымскім абрадам) ці іншых частак цела (у іншых абрадах); намашчэнне суправаджаецца літургічнай малітвай святара, які просіць аб асаблівай ласцы гэтага сакрамэнту» (пар. ККК 1531).*

— Якім чынам святар удзяляе сакрамэнт намашчэння хворых?

*«Намашчэнне хворых – гэта сакрамэнт, прызначаны не толькі для тых, каму пагражае небяспека смерці. Адпаведны час прыняцця гэтага сакрамэнту наступае ўжо тады, калі вернік знаходзіцца ў небяспецы смерці па прычыне хваробы або старасці. Калі хворы, які прыняў сакрамэнт намашчэння хворых, выздараўлівае, у выпадку новай цяжкай хваробы ён можа зноў прыняць гэты сакрамэнт. На працягу адной і той жа хваробы сакрамэнт можна паўторна ўдзяляць, калі хвароба ўзмацнілася. Было б дарэчы прыняць сакрамэнт намашчэння хворых напярэдадні складанай аперацыі. Тое самае датычыць і людзей сталага ўзросту, калі яны відавочна слабнуць» (пар. ККК 1514 — 1515).*

— Калі можна прымаць сакрамэнт намашчэння хворых?

3. Напішы, які плён прыносіць прыняцце сакрамэнту намашчэння хворых.

*«Першая ласка сакрамэнту намашчэння хворых – гэта ласка ўмацавання, спакою і мужнасці для таго, каб перамагчы цяжкасці, звязаныя са станам цяжкай хваробы або немачы старога ўзросту. Гэта ласка з’яўляецца дарам Духа Святога, які аднаўляе давер і веру ў Бога і ўмацоўвае ў барацьбе супраць спакусаў злога духа, спакусы абыякавасці і страху перад смерцю. Гэтая*

*дапамога Пана моцаю Яго Духа павінна прывесці хворага да аздараўлення душы, а таксама і да фізічнага аздараўлення, калі на гэта ёсць Божая воля. Апрача таго, калі ён учыніў грахі, яны будуць яму дараваныя ( Як 5,15). » (пар. ККК 1520).*

- ……………………………………………………………
- ……………………………………………………………
- ……………………………………………………………
- ……………………………………………………………
- ……………………………………………………………
- ……………………………………………………………
- ……………………………………………………………
- ……………………………………………………………

Сакрамэнт намашчэння хворых можна прыняць у доме, у касцёле, або ў шпіталі. У залежнасці ад сітуацыі на працягу жыцця гэты сакрамэнт можна прыняць некалькі разоў. Намашчэнне хворых не з'яўляецца сакрамэнтам, прызначаным толькі для тых, хто знаходзіцца ў небяспецы смерці. Мы, як хрысціяне, маем абавязак растлумачваць людзям сапраўдную сутнасць гэтага сакрамэнту, заахвочваць да яго прыняцця.

Ёсць такі дзень, калі Касцёл асаблівым чынам моліцца за хворых. Гэта адбываецца 11 лютага. Ян Павел II устанавіў гэты дзень як успамін аб'яўлення Маці Божай святой Бэрнардэце ў Люрдзе (Францыя) ў 1858г . Святы Айцец казаў:

*«Менавіта Люрд, такі вельмі дарагі хрысціянскаму народу Марыйны санктуарый, з'яўляецца месцам і адначасова сімвалам надзеі, ласкі, знакам прыняцця і ахвяравання збаўчага цярпення».*

**Разважанне:**

— Як дагэтуль я разумеў сутнасць сакрамэнту намашчэння хворых?
— За каго з хворых людзей я магу ахвяраваць сваю малітву?

***Мая пастанова:***

……………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………

***Хатняе заданне:***

1. Падчас вячэрняй малітвы памаліся за цяжка хворых і паміраючых людзей, якія не бачаць сэнсу ўласнага цярпення.
2. Намалюй у сшытку стол і пакажы на ім прадметы, неабходныя для ўдзялення сакрамэнту хворых у доме.

3. Прачытай у «Кампендыі» № 320 і напішы, што такое Віятык.

…………………………………………………………………………………………
…………………………………………………………………………………………
…………………………………………………………………………………………
…………………………………………………………………………………………
…………………………………………………………………………………………
…………………………………………………………………………………………
…………………………………………………………………………………………
……………………………………………………………

*Хай усім хворым у іх цярпенні дапамагае Марыя – Аздараўленне хворых,*
*Беззаганная Панна з Люрда, дзе адбылося столькі незвычайных цудаў*

*аздараўлення і сышло столькі ласкаў*
*праз Яе заступніцтва. Амэн.*

# IV. САКРАМЭНТЫ СЛУЖЭННЯ СУПОЛЬНАСЦІ І МІСІІ

Тэма № 18, VIII кл.

## СЛУЖЭННЕ СУПОЛЬНАСЦІ

***Дыдактычная мэта:*** передаем моладзі праўду аб тым, што хрысціянства звязана са служэннем, як у адносінах да супольнасці веруючых, так і да ўсяго грамадства.

***Выхаваўчая мэта:*** фарміруем у моладзі імкненне ахвотна служыць іншым, у тым ліку і супольнасці Касцёла.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Мц 25, 31. 34–40. Плаказ з сэрцам, карткі з маркерамі ці каляровая крэйда для вучняў.

***Метады катэхезы:*** праца ў групах, аналіз тэксту.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** Ойча наш.

**Чалавек пытае**

Кожны з нас жыве і расце ў сям'і, аднак гэта не адзіная супольнасць, да якой мы належым. У склад яшчэ якіх супольнасцяў уваходзіце вы? (*Клас, гурт, парафія, дзяржава.)* Кожны з нас штосьці атрымлівае з гэтых супольнасцяў і штосьці ў іх прыносіць, дае ад сябе. З моманту нашага хросту мы належым да супольнасці Касцёла, мы сталі хрысціянамі. Хрысціянін не можа ізалявацца ад свету, бо гэта пярэчыла б самой сутнасці хрысціянства. Хрысціянства заўсёды звязана са служэннем, як у адносінах да супольнасці веруючых, так і да ўсяго грамадства, у якім мы жывем. Нашая сённяшняя тэма: Служэнне супольнасці. На сённяшніх занятках мы пашукаем адказ на пытанне: Хто сёння патрабуе маёй дапамогі? (*Гэта пытанне К. запісвае на дошцы.)*

**Бог адказвае**

Чытаючы Святое Пісанне, мы заўважаем, што Езус не толькі абвяшчае вучэнне аб збаўленні, але аказвае клопат і вялікую любоў да кожнага чалавека. Езус абвяшчае, што асновай супольнага жыцця людзей з'яўляецца любоў.

*Хтосьці з вучняў чытае тэкст з Евангелля. Спачатку вучні чытаюць*

*тэкст самастойна, затым па ролях. Словы Езуса чытае К.*:

«**Калі ж прыйдзе Сын Чалавечы ў славе сваёй і ўсе анёлы з Ім, тады сядзе на троне славы сваёй. (...) Тады скажа Валадар тым, хто праваруч Яго: “Прыйдзіце, благаслаўлёныя Айца Майго, прыміце ў спадчыну Валадарства, падрыхтаванае вам ад стварэння свету. Бо Я быў галодны, і вы далі Мне есці; прагнуў, і вы напаілі Мяне; быў падарожным, і вы прынялі Мяне; быў голы, і вы апранулі Мяне; быў хворы, і вы адведалі Мяне; быў у вязніцы, і вы прыйшлі да Мяне”. Тады адкажуць Яму справядлівыя: “Пане, калі мы бачылі Цябе галодным і накармілі, ці сасмяглым і напаілі? Калі мы бачылі Цябе падарожным і прынялі, ці голым і апранулі? Калі мы бачылі Цябе хворым ці ў вязніцы і прыйшлі да Цябе?” І Валадар скажа ім у адказ: “Сапраўды кажу вам: тое, што вы зрабілі аднаму з гэтых братоў Маіх меншых, вы Мне зрабілі**”» (Мц 25, 31. 34–40).

— З кім Езус атаясамляе сябе?

Езус заклікае нас, каб у кожным чалавеку мы стараліся ўбачыць Яго. На падставе прачытанага Евангелля адкажыце на пытанне, пастаўленае на пачатку заняткаў: каму сёння патрэбна мая дапамога?

*К. змяшчае на дошцы плакат з сэрцам, а вучні яго дапаўняюць. Затым такі самы малюнак яны робяць у сваіх падручніках.*

**Чалавек адказвае Богу**

*К. дзеліць клас на групы. Кожная група выбірае сабе кагосьці з тых людзей, якіх напісалі на плакаце, і піша канкрэтныя формы дапамогі для іх, якія вучні могуць рэалізаваць самі ў бліжэйшы час. Свае адказы вучні запісваюць на картках, якія змяшчаюць на плакаце і расказваюць іншым групам аб сваіх спосабах дапамогі.*

Назавіце, калі ласка, імёны тых людзей, якія з’яўляюцца яскравымі прыкладамі такой ахвярнай дзейнасці. *(Маці Тэрэза з Калькуты.) – гэтыя імёны вучні запісваюць у падручнік.*

Каб правільна і гарманічна развівацца кожнаму з нас патрэбны іншы чалавек, патрэбная супольнасць, а супольнасці ў сваю чаргу патрэбныя мы. Аднак для таго, каб грамадства добра функцыянавала і людзі ў ім адчувалі сябе шчаслівымі, патрэбныя ахвярныя любячыя сэрцы. Мы належым да супольнасці Касцёла, які сёння акрамя місіі навучання засноўвае школы, дамы дзіцяці, дамы апекі для хворых людзей. Такая дзейнасць Касцёла — гэта ахвярная служба многіх людзей, якія ў іншым чалавеку бачаць свайго Настаўніка. Ад кожнага з нас залежыць тое, наколькі будзе развівацца і пашырацца такая дзейнасць.

***Разважанне:***

— Кім для мяне з’яўляецца іншы чалавек?
— Што я раблю для развіцця той супольнасці, да якой належу?
— Якімі дарамі я дзялюся з іншымі людзьмі?
— Як часта я бяру ўдзел у дабрачыннай працы ў маёй парафіі?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

Напішы, як ты разумееш словы благаслаўлёнай маці Тэрэзы: «Няважна, колькі працы робіш, важна, колькі любові ты ўкладваеш у гэту працу».

***Заключная малітва:***

*Малітва св. Францішка аб духу любові*

Учыні мяне, Пане, прыладаю Твайго спакою,
каб нёс любоў туды, дзе пануе нянавісць,
каб прабачаў там, дзе абражаюць,
каб яднаў там, дзе сварка і звада,
каб праўду казаў там, дзе ёсць фальш,
каб нёс веру туды, дзе ёсць сумненне,
каб абуджаў надзею там, дзе пануе роспач,
каб распаліў святло там, дзе валадарыць цемра,
каб нёс радасць туды, дзе турбуе неспакой.
Учыні, каб не шукаў я суцяшэння, а суцяшаў іншых,
каб не толькі прагнуў разумення, але каб разумеў іншых,
каб не шукаў уласнай любові, а любіў іншых.
Бо той, хто дае, заўсёды атрымлівае,
хто не шукае свайго, той знаходзіць,
хто прабачае, таму будзе прабачана,
бо паміраючы мы нараджаемся для жыцця вечнага.

Тэма № 19, VIII кл.

## ПРАЗ ХРОСТ І КАНФІРМАЦЫЮ МЫ – АГУЛЬНАЕ СВЯТАРСТВА

***Дыдактычная мэта:*** указваем на заданні, якія Хрыстус даручыў у Касцёле кожнаму верніку (святарская, прароцкая і каралеўская місія).

***Выхаваўчая мэта:*** фарміруем пачуццё адказнасці за збаўленне — сваё і іншых людзей.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** 4 вялікіх аркуша паперы, фламастэры. Святое Пісанне Мц 5, 13–16, ККК 783–786, Ян Павел II. – Gorzyw

Wielkopolski, 1997

### *Ход заняткаў*

***Малітва:*** *падручнік вучня*

Хрысціянін пакліканы Хрыстом клапаціцца ў супольнасці Касцёла пра ўласнае збаўленне і збаўленне іншага чалавека.

**Чалавек пытае**

(*падручнік вучня*)

У адным шпіталі ляжаў хворы марак. Ён быў няверуючым чалавекам. У шпітальнай палаце яго наведвала дзяўчына, якая апекавалася хворымі на тэрыторыі парафіі, дзе і знаходзіўся гэты шпіталь. Хворы марак хутка заўважыў шчырасць, дабрыню і пабожнасць гэтай дзяўчыны. Аднойчы, гледзячы на яе ахвярную працу, марак запытаў яе: «Што ты атрымліваеш за тое, што прыходзіш сюды?» Дзяўчына адказала, што працуе не за грошы. «А для каго ж тады ты гэта робіш?» — працягваў марак задаваць свае пытанні. «Для Хрыста, які мяне і вас вельмі моцна любіць», — адказала дзяўчына. Марака вельмі здзівіў такі адказ. Надышоў час выпіскі хворага са шпіталя. У дзень развітання марак падзякаваў дзяўчыне за апеку, затым працягнуў ёй прыгожую чырвоную ружу і сказаў: «Занясі гэтую ружу твайму Хрысту».

— Як вы думаеце, чаму марак захацеў аддаць ружу Хрысту?
— Хто пакліканы сведчыць аб Хрысце і якім чынам можа гэта рабіць?

**Бог адказвае**

*Спачатку вучні чытаюць самастойна, затым хтосьці з вучняў чытае ўголас:*

«**Вы — соль зямлі. Калі ж соль страціць смак, то чым пасоліш яе? Яна ўжо ні на што не прыдасца, хіба што выкінуць яе прэч на патаптанне людзям. Вы — святло свету. Не можа схавацца горад, які стаіць на вяршыні гары. І, запаліўшы свяцільнік, не ставяць яго пад пасудзінаю, але на свечніку, і свеціць усім, хто ў доме. Няхай святло вашае так свеціць перад людзьмі, каб яны бачылі вашыя добрыя ўчынкі і праслаўлялі Айца вашага, які ў нябёсах**» (Мц 5, 13-16).
— З чым параўноўвае Езус сваіх вучняў?
— Якое заданне Езус дае вучням у адносінах да іншых людзей?

Праз хрост і «намашчэнне» Духам Святым у сакрамэнце канфірмацыі хрысціянін становіцца ўдзельнікам трайной місіі Хрыста ў Касцёле. Якая гэта місія? На гэтае пытанне нам адказвае вучэнне Касцёла — ККК 783–786.

*Кожны з вучняў атрымлівае тэкст, у якім павінен знайсці і падкрэсліць адказ на гэтае пытанне:*

Иисус Христос есть Тот, Кого Отец помазал Духом Святым, — «Священник, Пророк и Царь». Народ Божий весь в целом участвует в этих трёх служениях Христа и несёт ответственность за миссию и служение, которые из этого вытекают (ККК 783).

Вступая в Народ Божий верою и Крещением, мы получаем удел в уникальном призвании этого Народа — в его священническом призвании: «Христос Господь, Первосвященник, взятый из людей, «соделал царством, священниками Богу и Отцу новый народ. Действительно, крещённые через возрождение и помазание Духом Святым получают посвящение, чтобы стать духовной обителью и святым священством» (ККК 784).

Святой Народ Божий участвует также в пророческом служении Христа». Он участвует в нём прежде всего сверхъестественным чувством веры, свойственным всему Народу в целом, мирянам и иерархии, когда он «неотступно держится веры, раз и навсегда переданной святыми», углубляет её понимание и становится свидетелем Христовым в этом мире (ККК 785).

Наконец, Народ Божий участвует в царственном служении Христа. Христос царствует, привлекая к себе всех людей Своею смертью и Своим Воскресением. Христос, Царь и Господь вселенной, стал слугою всем, ибо Он «не для того пришёл, чтобы Ему служили, но чтобы послужить и отдать душу Свою для искупления многих». Для христианина «царствовать – значит служить Ему», особенно «в лице нищих и страдающих», в которых Церковь «признаёт образ своего Основателя, нищего и страждущего». Народ Божий осуществляет своё «царственное достоинство», когда живёт в соответствии с этим призванием служения вместе с Христом (ККК 786).

*Прэзентацыя працы вучняў, пасля якой адзін з іх запісвае на дошцы невялікую схему, усе астатнія робяць гэта ў сваіх падручніках:*

МІСІЯ КАСЦЁЛА

святарская    прароцкая    каралеўская

***Святарская місія:***

Удзел у святарскай місіі Хрыста выражаецца, з аднаго боку, у дзейсным удзеле ў Літургіі, а з другога, на выкананні самых звычайных штодзённых учынкаў для дабра чалавека і на хвалу Божую.

***Прароцкая місія:***

Хрыстус як Прарок абвяшчаў людзям Божую волю, паказваў, як жыць. Прароцкая місія хрысціяніна заключаецца ў вернасці Евангеллю і ў адважным вызнаванні яго ў жыцці, нават насуперак асяроддзю. Заданне хрысціяніна — стаяць на баку праўды і любові і быць гатовым вызнаваць сваю веру, падтрымліваць іншых сваёю надзеяй на канчатковую перамогу дабра.

***Каралеўская місія:***

У каралеўскай місіі Хрыста ўдзельнічаюць хрысціяне праз няспыннае навяртанне, гэта значыць адрачэнне ад зла і пастаяннае імкненне да дабра. Такім чынам яны далучаюцца да будавання — ўжо тут на зямлі — Божага Владарства, у якім пануе справядлівасць, любоў і супакой. Як Хрыстус у сваім зямным жыцці змагаўся за ўзрастанне гэтага Валадарства, пераконваючы людзей аб Яго вартасці і паказваючы Яго ўласным цярпеннем, так і хрысціянін уключае ў гэтую справу сваю працу і ахвяру.

Мы як удзельнікі функцыі Хрыста — Святара, Прарока і Караля — маем канкрэтныя заданні для рэалізацыі там, дзе жывём, вучымся, працуем. Адказнасць за развіццё Касцёла ляжыць не толькі на святарах. Свецкія хрысціяне ў сакрамэнце бежмавання атрымліваюць моц Духа Святога, беручы на сябе адказнасць за Касцёл Божы. Ян Павел II падказвае нам, як мы можам рэалізаваць даручаныя нам заданні (*падручнік вучня).*

*«Сёння, калі ўжо не трэба сведчання крыві, тым больш яскравым павінна быць сведчанне штодзённага жыцця. Пра Бога трэба сведчыць словам і ўчынкам усюды, у кожным асяроддзі: у сям'і, на працы, у школе, у месцах, дзе чалавек працуе і адпачывае. Мы павінны вызнаваць Бога, старанна ўдзельнічаючы ў жыцці Касцёла: праз апеку над слабымі і церпячымі (...). Кожны хрысціянін пакліканы заўсёды і ўсюды сведчыць аб Хрысце перад людзьмі. Будзьце ў гэтым свеце носьбітамі веры і хрысціянскай надзеі, жывучы штодня любоўю. Будзьце вернымі сведкамі Хрыста, ніколі не адступайце перад перашкодамі, якія ўзнікаюць на сцежках вашага жыцця»* (Ян Павел II, Познань 1997 г.).

**Чалавек адказвае Богу**

Беручы пад увагу словы Езуса, вучэнне Касцёла, словы Яна Паўла II, а таксама на падставе ўласнага вопыту паспрабуем канкрэтна акрэсліць формы і

спосабы апостальства ў нашым асяроддзі.

*Вучні працуюць у 4-х групах. Кожная група атрымлівае вялікі аркуш паперы, фламастэры і выпісвае канкрэтныя магчымасці давання сведчання веры — апостальства — ў тым асяроддзі, дзе жывуць:*

I група — ў школе;
II група — ў сям'і;
III група — ў парафіі;
IV група — сярод сяброў.

*Прэзентацыя працы вучняў.*

Адказнасць за развіццё Касцёла ляжыць на кожным хрысціяніне, незалежна ад таго, якое месца ён займае ў супольнасці Божага народу.

***Разважанне:***

Быць сведкам Хрыста — гэта быць сведкам Яго любові, якая не баіцца цярпення, крыжа і нават смерці. Быць сведкам Хрыста — гэта быць сведкам Яго ўваскрасення, маючы ў сабе новае жыццё ў Духу Святым.

— Як я абвяшчаю Хрыста жыццём?
— Што значыць для мяне быць адказным за Хрыстовы Касцёл?
— Як я выконваю заданні, якія Хрыстус мне даручыў?
— Як я сведчу пра Хрыста ў тым асяроддзі, дзе жыву?
— Што я раблю для развіцця сваёй парафіі?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

Напішы, як ты разумееш словы Езуса: «Вы — соль зямлі».

***Заключная малітва:***

Божа, перамяні нашыя сэрцы!
Спашлі свайго Духа Святога ў нашыя сэрцы
І аднаві ў нас ласку хросту.
Перамяні нашыя сэрцы і ўмацуй іх,
каб з радасцю давалі сведчанне Евангеллю.
Дапамажы нам паглыбіць нашу веру,
каб мы ў еднасці і любові
маглі служыць Табе і адзін аднаму.

(Молімся з Янам Паўлам II. – Варшава, 1997, стар. 19)

Тэма № 20, VIII кл.

## СВЯТАРСТВА Ў СТАРЫМ ЗАПАВЕЦЕ.

***Мэта дыдактычная:*** расказваем вучням пра старазапаветнае святарства і пра Святарства Хрыста.
***Мэта выхаваўчая:*** заахвочваем вучняў да ўдзячнасці за святароў.
***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:***Святое Пісанне: Лчб 1, 48-53 ; Мал 2, 7 ; Вых 19, 5-6 . Каляровыя карткі і алоўкі.
***Метады катэхезы:*** аналіз тэксту

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** Пс 23(22), 1-3

Яшчэ ў часе Старога Запавету Бог, клапоцячыся пра збаўлення чалавека, устанаўлівае святарскую службу. Тэма нашага сённяшняга занятку: *Святарства ў Старым Запавеце.”*.

### ЧАЛАВЕК ПЫТАЕ

Праз першародны грэх чалавек адыйшоў ад Пана Бога. Патрэбны быў «пасрэднік» у дыялогу з Богам. З ізраэльскага народу Пан Бог выбірае тых, каму даручае гэтую асаблівую функцыю быць святарамі.

- Як паўстала святарства ў Старым Запавеце ?
- Кім былі гэтыя людзі і якія заданні яны выконвалі?

На гэтыя пытанні мы будзем шукаць адказ у Святым Пісанні.

### ПАН БОГ АДКАЗВАЕ

*(адзін з вучняў чытае тэкст)*

“**Калі вы будзеце слухацца голасу Майго і захоўваць запавет Мой, то станеце Маёй уласнасцю сярод усіх народаў, бо Мая ўся зямля. І вы будзеце для Мяне valадарствам святароў і народам святым”.** Зых 19, 5-6

- Каго Бог называе “царствам святароў”?

Як бачыце, спачатку Пан Бог выбірае народ ізраэльскі, каб ён вызнаючы адзінага Бога, жыў паводле Яго загадаў і абвяшчаў Яго хвалу сярод іншых народаў. Затым з народа ізраэльскага Бог выбірае адно з дванаццаці кален, даючы ім асаблівае заданне.

*Адзін з вучняў чытае тэкст.*

«**І наказаў Пан Майсею сказаць: “Толькі племя Лявія не ўнось у перапіс і не лічы іх разам з сынамі Ізраэля; а даручы лявітам скінію сведчання і ўсе прылады яе і ўсё, што пры ёй” Няхай яны носяць скінію і ўсе прылады яе, і служаць пры ёй, і каля скініі няхай ставяць табар свой; і калі трэба пераносіць скінію, няхай падымаюць яе левіты, калі трэба спыняцца скініі,**

**няхай ставяць яе левіты; а калі падступіцца хто чужы, аддадзены будзе смерці. Сыны Ізраілевыя павінны станавіцца кожны ў лагеры сваім і кожны пры сваім сцягу, рушэннямі сваімі; а левіты павінны разбіць лагер каля скініі адкрыцьця, каб не было гневу на супольства сыноў зраілевых, і будуць левіты стаяць на варце каля скініі адкрыцця**”. (пар. Лчб 1, 48-53)

**«Бо вусны святара павінны захоўваць веды, а закону шукаюць ад вуснаў яго, бо ён веснік Пана Магуццяў» (пар. Мал 2, 7).**

**«Кожны першасвятар пастаўлены, каб прыносіць дары і ахвяры» (Гбр 8, 3).**

**«І прыйшоў чалавек Божы да Іллі, і сказаў яму: Так кажа Пан: ці ж не адкрыўся Я дому бацькі твайго, калі яны былі яшчэ ў Егіпце, у доме фараона? І ці ж не Я выбраў яго з усіх каленаў Ізраэлевых сабе ў святары, каб ён падымаўся да ахвярніка Майго, каб дыміў фіміям, каб насіў эфод перада Мною? І ці ж не даў Я дому бацькі твайго ад усіх паленых агнём ахвяр сыноў Ізраэлевых?» (пар.1 Вал 2, 27-28).**

- Якое пакаленне з народа ізраэльскага выбраў Бог на сваю службу?
- Дзеля чаго Бог выбірае гэтае пакаленне?

## ЧАЛАВЕК АДКАЗВАЕ ПАНУ БОГУ

*Карыстаючыся тэкстамі Святога Пісання, вучні павінны запісаць у падручніку, якія дзеянні выконвалі святары Старога Запавету.*

### Святарскае служэнне Старога Запавету

- клапаціліся пра скінію
- складалі Богу ахвяры з жывёл і дароў зямлі
- абвяшчалі Божае Слова
- прасілі ў Бога прабачэнне за грахі людзей
- праводзілі абрады на хвалу Бога

Гэтыя розныя святарскія функцыі маюць адзін агульны фундамент: калі святар прамаўляе, то перадае людзям адказ Бога; калі растлумачвае Закон, перадае вучэнне, якое паходзіць ад Бога; калі прыносіць на алтар ахвяры, то

прадстаўляе Богу малітвы людзей. Ва ўсіх гэтых чынах святар – пасрэднік паміж Богам і чалавекам. Гэтыя правобразы знаходзяць сваё здзяйсненне ў Езусе Хрысце, які праз ахвяру свайго крыжа з'яўляецца адзіным «пасрэднікам паміж Богам і людзьмі», адзіным Святаром і дасканалай Ахвярай.

***Разважанне:***
- Як часта я дзякую Пану Богу за дар уласнага збаўлення?

***Пастанова.***

1. ***Хатняе заданне:*** Падчас вячэрняй малітвы падзякуй Пану Богу за дар збаўлення.
2. Прачытай у «Кампендыі» № 324.

***Заключная малітва:*** падручнік вучня

Тэма № 21, VIII кл.

## СВЯТАРСТВА Ў НОВЫМ ЗАПАВЕЦЕ

***Мэта дыдактычная:*** расказваем вучням пра новазапаветнае святарства, устаноўленнае Хрыстом.
***Мэта выхаваўчая:*** выхоўваем вучняў да удзячнасці за сакрамэнт святарства.
***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Лк 22, 19-20; Мк 16, 15; Ян 20, 23; Мц 10, 8. Каляровыя карткі і алоўкі.
***Метады катэхезы:*** праца ў групах.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** *Ойча, пад Сваю апеку вазьмі нашых душпастыраў, якія ўмацоўваюць нас хлебам Эўхарыстычным і хлебам Божага слова. Дай ім сілы для працы і айцоўскае сэрца, каб праз іх паслугу мы маглі б дайсці да збаўлення. Амэн.*

На мінулым занятку мы даведаліся аб тым, як паўстала святарская служба ў Старым Запавеце. Святары Старога Запавету былі "правобразам" Адзінага і Найвышэйшага Святара – Езуса Хрыста. Тэма нашага сённяшняга занятку: *святарства ў Новым Запавеце***.**".

**ЧАЛАВЕК ПЫТАЕ**

*Вучні на падставе ўласных ведаў (кат-т можа ім дапамагаць) запісваюць, што здзейсніў Хрыстус як Святар. Гэтую табліцу кат-т размяшчае побач з той, якую вучні рабілі на мінулым занятку.*

| Святары Старога Запавету | Хрыстус |
|---|---|
| ● клапаціліся пра скінію, складалі Богу ахвяры з жывёл і дароў зямлі | Склаў ахвяру з уласнага жыцця |
| ● абвяшчалі Божае Слова | Моцаю Свайго Слова аздараўляў, уваскрашаў, выганяў д'ябла |
| ● прасілі ў Бога прабачэнне за грахі людзей | Сам прабачаў грэшнікам |
| ● праводзілі абрады на хвалу Бога праславіў Крыжовай | Навучыў людзей маліцца, Айца Сваім жыццём і смерцю. |

**ПАН БОГ АДКАЗВАЕ**

Езус Хрыстус як Найвышэйшы і Вечны Святар прынёс сябе ў ахвяру свайму Айцу, каб збавіць чалавека. Езус хацеў, каб гэтая Ахвяра няспынна трывала, прыносячы плады адкуплення кожнаму чалавеку. У Вялікі чацвер, напярэдадні сваёй Крыжовай смерці, Настаўнік даручае сваім вучням Ягонаю моцаю далей працягваць справу збаўлення чалавека.

*Кат-т дзеліць вучняў на групы, кожнай з іх дае тэкст са Святога Пісання. Карыстаючыся тэкстамі вучні павінны напісаць на картках, адказ на пытанне:*

- якія заданні Езус даверыў Сваім вучням?

*Затым вучні павінны ў сваёй групе паразмаўляць аб тым, што яны маюць, дзякуючы таму, што святар выконвае гэтае заданне. Напрыклад, якія ласкі ім дае Хрыстос праз святара, які адпраўляе Святую Імшу, абвяшчае Божае слова, удзяляе сакрамэнты.*

«**Калі настала гадзіна, Езус узлёг за сталом, і Апосталы разам з Ім. І ўзяўшы хлеб, падзякаваў, паламаў і даў ім, кажучы: "Гэта ёсць Цела Маё, якое за вас будзе выдана; гэта чыніце на Маю памяць". Таксама ўзяў і келіх пасля вячэры, кажучы: "Гэты келіх ёсць новым запаветам у Крыві Маёй, якая за вас будзе праліта**".» (Лк 22, 14. 19-20).

- Складаць Найсвяцейшую Ахвяру

«**Ідзіце па ўсім свеце і абвяшчайце Евангелле ўсякаму стварэнню**». (Мк 16, 15)

- Абвяшчаць Евангелле

«**Дык ідзіце, навучайце ўсе народы і хрысціце іх у імя Айца і Сына, і Духа Святога**». (Мц 28, 19)

- Удзяляць хрост

«**Прыміце Духа Святога. Каму адпусціце грахі, таму будуць адпушчаны; на кім пакінеце, на тым застануцца**». (Ян 20, 23)

- Адпускаць грахі

«**Хворых аздараўляйце, мёртвых уваскрашайце, пракажоных ачышчайце, злых духаў выганяйце. Дарма атрымалі, дарма давайце». (**Мц 10, 8)

- Лячыць душу і цела чалавека

*Карткі з адказамі вучні паклейваюць на дошцы, каля "сонейка", якое рабілі на пачатку занятка. Затым распавядаюць аб тым, пра што гаварылі ў сваёй групе. Вынікі працы вучні запісваюць у падручнік для вучня.*

Святарства ў Касцёле ўстанавіў Хрыстус, каб працягваць місію збаўлення. Ён сам выбірае тых, каго потым кліча на сваё служэнне.

**«Езус узышоў на гару і паклікаў да сябе, тых, каго сам хацеў, і яны прыйшлі да Яго» (Мк 3, 13).**

Святары, здзяйсняючы святое служэнне, навучаюць і дзейнічаюць не ўласнай уладай і не па загадзе ці даручэнні супольнасці, але ў асобе Хрыста і ад імя Касцёла.

Хрыстус праз святара падчас святой Імшы прыходзіць да кожнага з нас, праз святара нас навучае, прабачае нам нашыя грахі. Святар выконвае вельмі важную функцыю — ён намеснік Хрыста на зямлі. Святарскую паслугу не можа выканаць іншы чалавек, таму святарства ў Касцёле заўсёды атуляецца асаблівай пашанай.

**ЧАЛАВЕК АДКАЗВАЕ ПАНУ БОГУ**

Магчыма і ў вашым асяроддзі ёсць тыя людзі, якія чуюць у сваім сэрцы заклік Хрыстовы: “ Ідзі за Мною”. Вы павінны падтрымаць іх сваёю малітвай, каб сучасны зматэрыялізаваны свет, які крычыць аб уласнай карысці і пошуку прыемнасцяў, не заглушыў у гэтых маладых людзях голас іх паклікання. Таксама мы павінны памятаць аб малітве падзякі Пану Богу за святароў, якія працуюць у нашых парафіях, бо праз іх рукі да нас прыходзіць Хрыстус, Які нас умацоўвае, навучае, благаслаўляе.

***Разважанне:***

- Як часта я малюся аб новых і святых паклiканнях?
- Ці малюся за святароў, якія працуюць у маёй парафіі?
- Што я раблю для таго, каб распазнаць уласнае паклiканне?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

Падзякуй Пану Богу за дар святарства.

Напішы імёны святароў, якія працуюць у тваёй парфіі.

***Заключная малітва***

*Божа, які для хвалы і велічы сваёй і для збаўлення чалавецтва ўстанавіў Адзінароднага Сына свайго Найвышэйшым Святаром, просім Цябе, каб тыя, каго Ён выбраў слугамі і распарадчыкамі сваіх таямніцаў, заставаліся заўсёды вернымі ў выкананні сваіх абавязкаў. Праз Хрыста, Пана нашага. Амэн.*

Тэма № 22, VIII кл.

## СТУПЕНІ САКРАМЭНТУ ПАСВЯЧЭННЯ

*Дыдактычная мэта:* пазнаёміць са ступенямі сакрамэнту пасвячэння.

*Выхаваўчая мэта:* фарміраваць паставу павагі да біскупаў, прэзбітэраў і дыяканаў і ўдзячнасці за іх служэнне на карысць пашырэння Божага Валадарста.

*Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:* Святое Пісанне: Мк 3,13–19; Мц 16, 18–19; Ян 21,17; ККК 1555; 1558; 1560; 1562 ; 1569. Фотаздымкі, ці відэаматэрыялы, з адлюстраваннем галоўных элементаў літургіі біскупскага пасвячэння.

*Метады катэхезы:* праца ў групах, аналіз тэксту.

*Ход заняткаў*

Малітва: *Пс 100 (99) 1–4*

Наша сённяшняя тэма: ступені сакрамэнту пасвячэння.

ЧАЛАВЕК ПЫТАЕ

Напэўна вы неаднойчы віталі ў сваёй парафіі біскупа, прысутнічалі на пасвячэннях святарскіх і дыяканату.

ПАН БОГ АДКАЗВАЕ

Святое Пісанне распавядае:

«Пасля ўзышоў на гару і паклікаў да сябе тых, каго сам хацеў, і яны прыйшлі да Яго. І ўстанавіў Дванаццаць, якіх і назваў Апосталамі, каб яны былі з Ім, каб пасланць іх прапаведаваць і каб яны мелі ўладу выганяць злых духаў. І устанавіў гэтых Дванаццаць: Сымона, якому даў імя Пётр, Якуба Зэбэдэевага і Яна, брата Якуба, і даў ім імёны Баанэргес, што азначае «сыны грому»; і Андрэя, і Філіпа, і Барталамея, і Мацвея, і Тамаша, і Якуба Алфеевага, і Тадэвуша, і Сымона Кананэйца, і Юду Іскарыёта, які і выдаў Яго» (Мк 3, 13–19).

«І Я кажу табе, што ты — Пётр скала, і на гэтай скале Я пабудую Касцёл Мой, і брамы пякельныя не перамогуць яго. Я дам табе ключы Валадарства Нябеснага, і што звяжаш на зямлі, тое будзе звязана ў небе, а што развяжаш на зямлі, тое будзе развязана ў небе» (Мц 16, 18–19).

«І сказаў яму трэці раз: «Сымоне, сын Яна, ці любіш ты Мяне?» Пётр засмуціўся, што трэці раз спытаўся ў яго: «Ці любіш ты Мяне?», і сказаў: «Пане, Ты ўсё ведаеш, Ты ведаеш, што я люблю Цябе». Езус сказаў яму: «Пасі авечак Маіх» (Ян 21, 17).

— Каго Езус Хрыстус выбраў на служэнне?
— Каго Езус паставіў на чале Дванаццаці?

Сёння паслядоўнікамі Апосталаў з’яўляюцца ўсе біскупы на чале са Святым Айцом.

*Працуючы самастойна з тэкстамі вучэння Касцёла (падручнік вучня), вучні павінны ў сваіх падручніках адлюстраваць ступені сакрамэнту пасвячэння.*

- Біскупства

«Біскупскае пасвячэнне дае паўнату сакрамэнту пасвячэння, робіць біскупа

легітымным наступнікам Апосталаў, далучае яго да Калегіі Біскупаў, у якой ён падзяляе з Папам і іншымі біскупамі клопат аб усім Касцёле, а таксама даручае яму абавязак навучаць, асвячаць і кіраваць» *(Кампендый, 326).*

«Кожны біскуп як вікарый Хрыста выконвае пастырскую місію ў даручаным яму мясцовым Касцёле, але адначасова калегіяльна з усімі братамі ў біскупстве ён клапоціцца пра ўвесь Касцёл: Хоць кожны біскуп з'яўляецца ўласцівым пастырам толькі часткі статку, які даручаны яго апецы, аднак у якасці законнага пераемніка Апосталаў па Божаму ўстанаўленню ён адказны разам з іншымі за апостальскую місію Касцёла» *(пар. ККК 1560).*

— Што дае біскупскае пасвячэнне?
— Якую функцыю выконваюць біскупы моцаю свайго пасвячэння?
— За што біскупы нясуць адказнасць?

«Біскуп, якому даручаны мясцовы Касцёл, з'яўляецца бачным пачаткам і падмуркам адзінства гэтага Касцёла, у якім ён, як вікарый Хрыста, выконвае пастырскі абавязак з дапамогаю сваіх прэзбітэраў і дыяканаў» *(Кампендый, 327).*

Біскупы, як паслядоўнікі Апосталаў, нясуць адказнасць за ўвесь Касцёл. Асаблівую адказнасць біскуп нясе за сваю дыяцэзію.

— Што вы бачыце на гэтых фотаздымках?

«Праз ускладанне рук біскупаў і малітву пасвячэння выбранаму ўдзяляецца дар Духа Святога для выканання біскупскага абавязку. Наступныя словы з'яўляюцца істотнымі і неабходнымі для сапраўднасці чыну: "А цяпер спашлі на гэтага выбранага тую моц, якая паходзіць ад Цябе, — Духа Найвышэйшага, якога Ты даў Твайму ўмілаванаму Сыну Езусу Хрысту і якога Ён даў святым Апосталам, каб яны ў розных месцах устанавілі Касцёл як Тваю святыню на хвалу і няспыннае праслаўленне імя Твайго".

Галоўны пасвячаючы біскуп прамаўляе малітву пасвячэння ад імя ўсіх прысутных біскупаў; словы, якія адносяцца да сутнасці пасвячэння, прамаўляюць усе біскупы, якія разам з галоўным пасвячаючым біскупам ускладаюць рукі на выбранага. Гэтыя словы належыць прамаўляць так, каб выразна быў чутны голас галоўнага пасвячаючага біскупа, а іншыя біскупы гавораць іх сцішаным голасам.

Ускладанне кнігі Евангелля на галаву прымаючага пасвячэнне падчас малітвы пасвячэння, а таксама ўручэнне кнігі пасвячанаму азначае вернае

абвяшчэнне слова Божага як галоўнага абавязку біскупа. Намашчэнне галавы азначае асаблівы ўдзел біскупа ў святарстве Хрыста. Уручэнне персценя сімвалізуе вернасць біскупа Касцёлу — абранніцы Бога; ускладанне мітры — імкненне да святасці; уручэнне пастарала — абавязак кіравання даручаным яму Касцёлам.

Пацалунак, які прымае пасвячаны ад галоўнага пасвячаючага біскупа і ад усіх біскупаў, з'яўляецца нібы пячаццю, што зацвярджае яго прыняцце ў Калегію біскупаў» (*гл. Рытуал «Пасвячэнне біскупа, прэзбітэраў і дыяканаў»).*

«Біскупскае пасвячэнне дае паўнату сакрамэнту пасвячэння, робіць біскупа легітымным наступнікам Апосталаў, далучае яго да Калегіі Біскупаў, у якой ён падзяляе з Папам і іншымі біскупамі клопат аб усім Касцёле, а таксама даручае яму абавязак навучаць, асвячаць і кіраваць» *(Кампендый, 326).*

Дзе і як біскупы выконваюць сваю функцыю? На гэтае пытанне нам дае адказ вучэнне Касцёла. (*падручнік вучня).*

- Прэзбітэрат:

«Прэзбітэры з'яднаныя з біскупамі ў святарскай годнасці і ўтой жа час залежаць ад іх у выкананні сваіх пастырскіх функцый; яны пакліканыя быць мудрымі супрацоўнікамі біскупаў. Яны ствараюць вакол свайго біскупа прэзбітэрый, які разам з біскупамі адказвае за мясцовы Касцёл. Біскуп даручае кожнаму з іх місію кіравання супольнасцю або пэўную касцёльную функцыю» *(пар. ККК 1595).*

– Чыімі супрацоўнікамі з'яўляюцца прэзбітэры?
– Якую функцыю яны выконваюць моцаю свайго пасвячэння?
– Як прэзбітэры рэалізуюць сваю функцыю?

Падчас літургіі пасвячэння прэзбітэраў адбываецца намашчэнне рук, што азначае асаблівы ўдзел прэзбітэраў у святарстве Хрыста.

Прэзбітэры, з'яднаныя з біскупамі ў святарскай годнасці, рэалізуюць сваё пасвячэнне праз абвяшчэнне Евангелля, праз удзяленне сакрамэнтаў, будучы пастырамі вернікаў у давеpанай ім парафіяльнай супольнасці. У еднасці з біскупам і падпарадкоўваючыся яму, прэзбітэры нясуць адказнасць за мясцовы Касцёл. Роля прэзбітэраў вельмі вялікая і значная, таму мы павінны аказваць ім павагу, удзячнасць і дапамогу. Вялікай дапамогай для іх з'яўляецца наша малітва.

У душы прэзбітэра, так як і ў душы ахрышчанага і канфірмаванага Бог выціскае асаблівы знак — незнішчальную пячаць, якая называецца

сакрамэнтальным характарам.

- Дыяканат:

Пра ўстанаўленне дыяканату чытаем у Дзеях Апосталаў.

«Браты, выберыце з вашага ліку сем мужоў добрай славы, поўных Духа і мудрасці; якім даручым гэтае служэнне. А мы ўвесь час будзем трываць у малітве і служэнні слова. Спадабалася гэта ўсёй грамадзе, і абралі Стэфана, мужа поўнага веры і Духа Святога, і Філіпа, і Прохара, і Міканора, і Тымона, і Пармэна, і Мікалая празеліта з Антыёхіі, яіх паставілі перад Апосталамі. Яны, памаліўшыся, усклалі на іх рукі» *(Дз 6, 3–6).*

Пасвячэнне дыяканату адбываецца не для святарства для служэння. Дыякан не з’яўляецца святаром, таму падчас цэлебрацыі Эўхарыстыі ён служыць біскупу ці прэзбітэру, але не складае ахвяру святой Імшы.

Пры пасвячэнні ў дыяканы толькі біскуп ускладае на іх рукі, што азначае асаблівую сувязь дыякана з біскупам у заданнях яго «дыяконіі». Уручэнне кнігі Евангелля ўказвае на абавязак дыяканаў абвяшчаць Евангелле на літургічных цэлебрацыях і прапаведаваць словам і чынам веру Касцёла (*гл. Рытуал «Пасвячэнне біскупа, прэзбітэраў і дыяканаў»).*

Пацалунак біскупа — гэта нібы пячаць, што пацвярджае прыняцце іх у яго служэнне. Дыяканы пацалункам вітаюць пасвячаных, якія яднаюцца з імі ў супольным служэнні дыяканскага стану.

Дыяканы рэалізуюць сваё пасвячэнне, служачы народу Божаму ў лучнасці з біскупам і яго прэзбітэрам. Гэта паслуга пры алтары, урачыстае ўдзяленне сакрамэнту хросту, асыставанне і благаслаўленне ад імя Касцёла сужэнскіх саюзаў, удзяленне святой Камуніі хворым, чытанне і навучанне верных словам Святога Пісання, правядзенне набажэнстваў, правядзенне абраду пахавання памерлых вернікаў, благаслаўленне рэчаў.

«Сакрамэнт пасвячэння ўсіх трох ступеняў удзяляецца праз ускладанне рук біскупа на галаву кандыдата. Пры гэтым біскуп вымаўляе ўрачыстую кансэкрацыйную малітву. У ёй біскуп просіць Бога аб асаблівым праліцці Духа Святога і Яго дароў на кандыдата, адпаведна яго будучаму служэнню» *(Кампендый, 331).*

ЧАЛАВЕК АДКАЗВАЕ ПАНУ БОГУ

*Можна прапанаваць вучням скласці малітву за біскупа, які з’яўляецца адказным за развіццё Касцёла ў дыяцэзіі, да якой яны належаць, а таксама за святароў і дыяканаў, якія працуюць у іх парафіі. Хтосьці з вучняў прачытае іх*

*падчас малітвы верных на нядзельнай святой Імшы.*

*Разважанне:*

— Як выглядае мая дапамога святарам, пробашчу маёй парафіі?

— Як выглядае мая малітва за святароў, а таксама за новыя святарскія пакліканні?

— Як я выказваю падзяку Пану Богу за дар святарскай паслугі?

— Як я адношуся да тых, хто хоча прысвяціць сваё жыццё служэнню Пану Богу?

*Пастанова.*

*Хатняе заданне:*

1. Памаліся за новыя святарскія пакліканні, а таксама за святароў, якія працуюць у тваёй парафіі.
2. Напішы рэферат на тэму: *«Святары беларускай зямлі».*

*Заключная малітва: падручнік вучня*

Тэма № 23, VIII кл.

## ІЕРАРХІЧНАЯ СТРУКТУРА КАСЦЁЛА

*Дыдактычная мэта:* пазнаёміць вучняў з іерархічнай структурай Касцёла, з функцыямі біскупаў, прэзбітэраў і дыяканаў у Касцёле.

*Выхаваўчая мэта:* фарміраваць належныя адносіны да біскупаў, прэзбітэраў і дыяканаў і удзячнасць за іх служэнне, а таксама заахвоціць да малітвы за пакліканні.

*Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:* Святое Пісанне: Дз 6, 3–6; ККК 1564; 1595. Фотаздымкі, ці відэазапіс, з адлюстраваннем галоўных элементаў літургіі прэзбітэрскага і дыяканскага пасвячэння.

*Метады катэхезы:* аналіз тэксту.

*Ход заняткаў*

Малітва: падручнік вучня

ЧАЛАВЕК ПЫТАЕ

Ад самага пачатку існавання Касцёл быў іерархічны. Само слова «іерархія» мае двайны сэнс — гэта «структура», альбо «дадзеная Богам улада».

1. Прачытай тэксты Святога Пісання і адкажы на пастаўленыя ніжэй пытанні:

«Пасля ўзышоў на гару і паклікў да сябе тых, каго сам хацеў, і яны прыйшлі да Яго. І ўстанавіў Дванаццаць, якіх і назваў Апосталамі, каб яны былі з Ім, каб пасляць іх прапаведаваць і каб яны мелі ўладу выганяць злых духаў. І ўстанавіў гэтых Дванаццаць: Сымона, якому даў імя Пётр, Якуба Зэбэдэевага і Яна, брата Якуба, і даў ім імёны Баанэргес, што азначае, «сыны грому»; і Андрэя, і Філіпа, і Барталамея, і Мацвея, і Тамаша, і Якуба Алфеевага, і Тадэвуша, і Сымона Кананэйца, і Юду Іскарыёта, які і выдаў Яго» *(Мк 3, 13–19).*

«І Я кажу табе, што ты — Пётр [скала], і на гэтай скале Я пабудую Касцёл Мой, і брамы пякельныя не перамагуць яго. Я дам табе ключы Валадарства Нябеснага, і што звяжаш на зямлі, тое будзе звязана ў небе; а што развяжаш на зямлі, тое будзе развязана ў небе» *( Мц 16, 18–19).*

— Каго Езус Хрыстус выбраў на сваё служэнне?
— Каго Езус паставіў на чале Дванаццаці?

Сёння наступнікамі Апосталаў з’яўляюцца Святы Айцец і біскупы. «Папа, Біскуп Рыма і наступнік святога Пятра, з’яўляецца трывалым і бачным пачаткам і падмуркам адзінства Касцёла. З’яўляецца вікарыем Хрыста, галавой Калегіі Біскупаў і пастырам усяго Касцёла, над якім, паводле Божага ўстанаўлення, мае поўную, найвышэйшую, непасрэдную і паўсюдную ўладу» (Кампендый, 182). Ён клапоціцца і з’яўляецца адказным за развіццё Касцёла ва ўсім свеце. У гэтай працы яму дапамагае Калегія Біскупаў, якая «ў еднасці з Папам і ніколі без яго, ажыццяўляе над Касцёлам найвышэйшую і поўную ўладу» *(Кампендый, 183).*

2. Прачытай тэксты вучэння Касцёла і падкрэслі адказ на пастаўленыя ніжэй пытанні.

«Біскупскае пасвячэнне з місіяй асвячэння прыносіць таксама місію навучання і кіравання. Праз ускладанне рук і праз словы пасвячэння ўдзяляецца ласка Духа Святога і накладаецца святая пячаць, так што біскупы асаблівым і бачным чынам займаюць месца самога Хрыста, Настаўніка, Пастыра і Першасвятара і дзейнічаюць ад Яго імя. Таму біскупы, праз дадзенага ім Духа Святога, становяцца сапраўднымі настаўнікамі веры, святарамі і пастырамі» *(пар. ККК 1558).*

— Чыю місію спаўняюць біскупы ?
— Якую функцыю выконваюць?

Біскупы ў еднасці з Папам як праўдзівыя сведкі апостальскай веры і ўлады, дадзенай ім Хрыстом, маюць абавязак верна і аўтарытэтна абвяшчаць усім Евангелле. Паколькі кожны біскуп з’яўляецца членам Калегіі Біскупаў, то калегіяльна, разам з іншымі біскупамі, з’яднанымі з Папам, ён бярэ на сябе клопат пра ўсе мясцовыя Касцёлы і пра ўвесь Касцёл. Біскуп, якому даручаны мясцовы Касцёл, кіруе ім з аўтарытэтам святой улады, якая здзяйсняецца ў імя Хрыста.

У еднасці з біскупам і падпарадкоўваючыся яму, прэзбітэры нясуць адказнасць за мясцовы Касцёл. Біскуп даручае кожнаму з іх місію кіравання супольнасцю або пэўную касцёльную функцыю.

На найніжэйшай ступені ў іерархіі Касцёла знаходзяцца дыяканы. Па прызначэнню біскупа яны здзяйсняюць функцыі, якія вынікаюць з іх пасвячэння, служачы той ці іншай парафіяльнай супольнасці пад кіраўніцтвам пробашча.

Служэнне іншаму чалавеку злучана з ахвярай. Гэтага Хрыстус жадае і ад тых, хто складае іерархію Касцёла, і таксама ад кожнага з нас.

У сённяшні час мы амаль штодня бачым святара, прымаючы ўдзел у святой Імшы, набажэнствах, часам на вуліцах нашых гарадоў ці вёсак. Кім святар з’яўляецца для вас?

*Катэхет раздае вучням аркушы паперы, затым на дошцы піша «Святар — гэта...». Вучні павінны на картках запісаць, з чым асацыіруецца ў іх гэтае слова. Праз некалькі хвілін вучні змяшчаюць на дошцы карткі, размяшчаючы іх ў выглядзе сонейка..*

Кожны з нас інакш глядзіць на святарства, мае розныя дасведчанні ад сустрэч і размоў са святарамі, але неаспрэчным з’яўляецца той факт, што пакліканне да святарства з’яўляецца Божай справай.

Мы можам па–рознаму глядзець на святарства, але трэба заўсёды памятаць, што святар — гэта чалавек, якога выбраў на Бог.

— Прыгадайце, якімі словамі Езус установіў сакрамэнт пасвячэння святароў?
— З якой мэтай Езус установіў гэты сакрамэнт?

ПАН БОГ АДКАЗВАЕ

*Катэхет прапаноўвае вучням разгледзець фотаздымкі ці відэазапіс, з адлюстраваннем галоўных элементаў літургіі пасвячэння. Катэхет звяртае ўвагу вучняў на знешнія знакі (адзенне), якое дапамагае распазнаваць розныя ступені сакрамэнту пасвячэння.*

«На дыяканаў «ускладаюцца рукі не для святарства, а для служэння. Умацаваныя сакрамэнтальнай ласкай, у супольнасці з біскупам і яго прэзбітэрыем яны служаць народу Божаму ў служэнні літургіі, слова і любові» (*гл. Рытуал «Пасвячэнне біскупа, прэзбітэраў і дыяканаў»).*

Дыяканы рэалізоўваюць сваё пасвячэнне служачы Божаму народу ў лучнасці з біскупам і яго прэзбітэрамі. Гэта і паслуга пры алтары, урачыстае ўдзяленне сакрамэнту хросту, асыставанне і благаслаўленне ад імя Касцёла сужэнскім саюзам, удзяленне Вятыку хворым, чытанне і навучанне верных словам Святога Пісання, правядзенне набажэнстваў, пахаванне, благаслаўленне рэчаў. Пра ўстанаўленне дыяканату чытаем у Святым Пісанні: «Таму, браты, выберыце з вашага ліку сем мужоў добрай славы, поўных Духа і мудрасці, кім даручым гэтую паслугу. А мы будзем трываць у малітве і служэнні слова». Спадабалася гэта ўсёй грамадзе, і абралі Стэфана, мужа поўнага веры і Духа Святога, і Філіпа, і Прохара, і Міканора, і Тымона, і Пармэна, і Мікалая, празеліта з Антыёхіі, бякіх паставілі перад Апосталамі. Яны, памаліўшыся, усклалі на іх рукі» *(Дз 6, 3–6).*

*У тэксце Святога Пісання падкрэсліце імёны першых дыяканаў. (падручнік вучня).*

Прэзбітэрскае пасвячэнне адбываюцца падчас св. Імшы.

Прэзбітэры, з'яднаныя з біскупамі ў святарскай годнасці, рэалізуюць сваё пасвячэнне праз абвяшчэнне Евангелля, праз удзяленне сакрамэнтаў, будучы пастырамі вернікаў і цэлебрантамі літургіі ў даверанай ім парафіяльнай супольнасці.

Карыстаючыся ККК даведаемся дзе і як прэзбітэры выконваюць сваю фуцкцыю. (*падручнік вучня).*

«Намашчэнне Духам Святым пазначае прэзбітэра незнішчальнай духоўнай пячаццю (характарам), прыпадабняе яго да Хрыста-Святара і робіць здольным дзейнічаць у імя Хрыста-Галавы. З'яўляючыся супрацоўнікам біскупа, ён кансэкраваны, каб абвяшчаць Евангелле і цэлебраваць Божы культ, асабліва Эўхарыстыю, з якой атрымлівае моц для свайго служэння, а таксама, каб быць пастырам вернікаў» *(Кампендый, 328).*

«Прэзбітэры з'яднаныя з біскупамі ў святарскай годнасці і ў той жа час залежаць ад іх у выкананні сваіх пастырскіх функцый; яны пакліканыя быць мудрымі супрацоўнікамі біскупаў. Яны ствараюць вакол свайго біскупа прэзбітэрый, які разам з біскупамі адказвае за мясцовы Касцёл. Біскуп даручае кожнаму з іх місію кіравання супольнасцю або пэўную касцёльную функцыю»

*(пар. ККК, 1595 ).*

— Чыімі супрацоўнікамі з’яўляюцца прэзбітэры ?
— Якую функцыю яны выконваюць моцаю свайго пасвячэння ?
— Дзе святары выконваюць сваю службу ?

ЧАЛАВЕК АДКАЗВАЕ ПАНУ БОГУ

Сакрамэнт пасвячэння, так як і сакрамэнты хросту і канфірмацыі выціскае ў душы хрысціяніна асаблівы знак — незнішчальную пячаць, якая называецца сакрамэнтальным характарам. «Ідзіце і абвяшчайце Евангелле кожнаму стварэнню» — гэта заданне Хрыстус даў не толькі святарам, але і кожнаму ахрышчанаму, гэта значыць – табе і мне. Мы ўсе з’яўляемся пакліканымі да жыцця ў праўдзе, любові і святасці *(гл. Кампендый № 177, 188–191).*

Роля святароў вельмі вялікая і значная — гэта і адпраўленне св. Імшы, і абвяшчэнне Евангелля, і ўдзяленне сакрамэнтаў, таму мы павінны аказваць ім павагу, удзячнасць і дапамогу. Вялікай дапамогай для іх з’яўляецца наша малітва.

*Разважанне*

— Як выглядае мая дапамога святарам, пробашчу маёй парафіі?

— Як выглядае мая малітва за святароў, а таксама аб новыя святарскія пакліканні?

— Як я адношуся да тых, хто хоча прысвяціць сваё жыццё на служэнне Пану Богу?

*Пастанова:*
*Дамашняе заданне:*

1. Малітва аб новых святарскіх пакліканнях, а таксама за святароў, што працуюць у тваёй парафіі.
2. На наступных занятках мы правядзем прэс-канферэнцыю пад назвай «100 пытанняў да святара».

Нашым госцем будзе пробашч нашай парафіі, якому вы можаце задаць хвалюючыя вас пытанні на тэму сакрамэнту пасвячэння. Падрыхтуйце дома некалькі такіх пытанняў, запішыце іх на паперы.

*Заключная малітва*

О Езу, наш Пасрэднік і Найвышэйшы Святар,
ахвяруем Табе нашыя малітвы, працу і цярпенні за Тваіх святароў,
каб святасцю свайго жыцця яны пашыралі Тваё Валадарства.
О Езу, спасланы з неба як наш Найвышэйшы Святар — дай нам святых

святароў!

О Езу, для збаўчага пераказу Твайго вучэння…

О Езу, для справавання аж да канца свету Тваёй Крыжовай Ахвяры...

О Езу, для збаўчага ўдзялення нам святых сакрамэнтаў...

О Езу, для адпушчэння нам грахоў у сакрамэнце пакаяння...

О Езу, для ўмацавання ў веры і добрых звычаях нашых сем’яў...

О Езу, для выхавання дзяцей дзеля Тваёй хвалы...

О Езу, для аховы і дапамогі сярод небяспекі свету....

О Езу, для нашай падрыхтоўкі да шчаслівай смерці....

О Езу, для пашырэння Твайго Валадарства — дай нам святых святароў!

Тэма № 24, VIII кл.

## СУЖЭНСТВА ПАВОДЛЕ БОЖАГА ПЛАНА

***Дыдактычная мэта:*** растлумачваем, што такое сакрамэнт сужэнства, а таксама значэнне яго прыняцця, падкрэсліваем яго вартасць. Указваем на сакрамэнт сужэнства, як на дар любові Бога да чалавека.

***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваем моладзь да адказнай падрыхтоўкі да сакрамэнту сужэнства.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Быц 1, 28; Быц 2, 24; Рым 7, 1–3; ККК 1623, 1625, 1627, 1628, 1630, 1640–1641, 1646, 2363; плакат, карткі для кожнай групы, маркеры.

***Метады катэхезы:*** праца ў групах.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** *падручнік вучня*

**Чалавек пытае**

*К. распачынае з вучнямі размову:*

Аднойчы нехта ў размове пра сужэнства, сказаў так: «Добры сужэнскі саюз можна заключыць толькі ўтраіх: Пан Бог ён і яна».

— Як вы разумееце гэтыя словы?

— Які саюз, на ваш погляд, можна назваць шчаслівым?

Інстытут сужэнства — з’ява паўсюдная, яе можна ўбачыць ва ўсіх вядомых культурах і грамадствах. Кожны з нас паходзіць з сям’і. Але сёння сям’я перажывае вялікі крызіс, бо ўсё часцей можна пачуць аб магчымасці сумеснага жыцця без сакрамэнту сужэнства. Чаму жыць разам і любіць адно аднаго яшчэ не дастаткова, каб быць сужэнствам?

**Бог адказвае**

*К. дзеліць вучняў на 4 групы. Вучні працуюць над тэкстамі, а затым змяшчаюць свае адказы на плакаце.*

І група:
— Якое заданне Бог даў мужчыне і жанчыне? (Быц 1, 28)
— Хто яго ўдзяляе? (ККК 1623)

ІІ група:
— Што неабходна для заключэння сакрамэнту сужэнства? (ККК 1625, 1628)
— Як ён удзяляецца? (ККК 1630)

ІІІ група:
— Як доўга трывае сакрамэнт сужэнства? (Рым 7, 1–3; ККК 1640)
— Навошта і з якой мэтай? (Быц 1, 28; ККК 2363)

IV група:
— Якія вынік заключэння сужэнства? (ККК 1641)
— Да чаго яно абавязвае? (ККК 1646)
— Які найважнейшы момант падчас заключэння гэтага сакрамэнту? (ККК 1627)



*Вынікі працы вучні запісваюць у падручнік для вучня.*

*К. разам з вучнямі супольна фармулююць азначэнне сакрамэнту сужэнства. Вучні запісваюць яго ў падручнік*

Сужэнства — гэта супольнасць любові мужчыны і жанчыны, скіраваная на дабро сужэнцаў і для нараджэння і выхавання патомства. Сужэнства павінна быць трывалае, заснаванае на любові, вернасці і павазе, скіраваннае на новае жыццё.

Нарачоныя, складаючы прысягу любові, вернасці і павагі, самі ўзаемна ўдзяляюць сабе скарамэнт сужэнства, робячы гэта ў прысутнасці святара — сведкі Касцёла.

Хрыстус учыніў сужэнства месцам асаблівай прысутнасці Бога і Яго ласкаў. Сакрамэнт сужэнства — гэта знак сувязі Хрыста і Касцёла. Ён дае сужэнцам ласку ўзаемнай любові, якою Хрыстус палюбіў Касцёл. Ласка сакрамэнту ўмацоўвае іх непарыўную еднасць і асвячае іх на шляху да вечнага жыцця.

**Чалавек адказвае Богу**

Напэўна, большасць з вас у будучым будзе мець сваю сям’ю. Якога чалавека вы б хацелі бачыць побач з сабою?

*Праца ў групах:* РЫСЫ ДОБРАГА МУЖА / ДОБРАЙ ЖОНКІ.

Вучні атрымліваюць заданне намаляваць контуры хлопчыка / дзяўчынкі, падзяліць кожны контур напалову, а затым напісаць:

• *(дзяўчыны)* Чым павінна характарызавацца добрая жонка?
• *(хлопцы)* Чым павінен характарызавацца добры муж?

*Затым вучні абменьваюцца карткамі і пішуць так:*

• *(хлопцы)* Якія рысы павінна мець мая жонка?
• *(дзяўчыны)* Якія рысы павінен мець мой муж?

*Вынікі працы вучні запісваюць у падручнік для вучня.*

***Разважанне:***

— Якія рысы характару я павінен (павінна) у сабе выхоўваць, каб у будучым быць добрым мужам (добрай жонкай)?
— Як я разумею сужэнства, якое заключаецца перад Богам?
— Ці малюся за асобу, якая будзе маёй жонкай (маім мужам)?

***Пастанова:***

Добрай падрыхтоўцы да сужэнства служыць малітва ў гэтай інтэнцыі, таму зараз з даверам скіруем яе да Пана Бога:

*Пане Божа, кожны з нас прагне мець шчаслівую сям'ю, у якой жыве любоў. Мы марым аб тым, каб у будучым мы змаглі стварыць сям'ю, у якой усе будуць адчуваць сябе каханымі, патрэбнымі і вартаснымі. Хочам падзякаваць Табе, Пане, за тое, што Ты даў нам гэтае імкненне і клічаш мужчыну і жанчыну да жыцця ў сужэнстве, заснаваным на любові, якая ўсяму верыць, усё вытрывае, усё пераможа і ніколі не скончыцца, бо Ты з'яўляешся такой любоўю.*

*Дапамажы нам, Пане, так пражыць час свайго юнацтва, каб узрастаць да любові сужэнскай і бацькоўскай, якой Ты сам нас вучыш. Дапамажы, каб ніхто і нішто не знішчыла нашых сем'яў і нашай будучыні. З даверам і надзеяй просім Цябе, Пане, праз Хрыста, Пана нашага. Амэн.*

***Хатняе заданне:***

1. Памаліся за сваіх бацькоў аб умацаванні іх сужэнскага саюза.
2. Напішы, як ужо сёння ты можаш рыхтавацца да адказнага сужэнства.

*Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*

«**І благаславіў іх Бог, і сказаў ім: "Пладзіцеся і размнажайцеся, напаўняйце зямлю і валодайце ёю; пануйце над рыбамі марскімі, над птаствам нябесным і над усімі жывымі істотамі, якія рухаюцца па зямлі**"» (Быц 1, 28).

«**Таму пакіне мужчына бацьку свайго і маці сваю і злучыцца з жонкай сваёй, і стануць яны адным целам**» (Быц 2, 24)

«**Хіба вы не ведаеце, браты, — бо кажу тым, хто абазнаны ў законе, — што закон мае ўладу над чалавекам, пакуль чалавек жывы? Замужняя жанчына прывязана законам да жывога мужа; а калі памрэ муж, яна вызваляецца ад закона замужжа. А таму, калі пры жывым мужы яна выйдзе за другога, будзе называцца чужаложніцаю; а калі памрэ муж, яна вольная ад закона і не будзе чужаложніцаю, як выйдзе за другога мужа**» (Рым 7, 1–3).

Согласно латинской традиции сами супруги как служители благодати Христовой взаимно преподают друг другу таинство Брака, выражая перед Церковью своё согласие. В традициях Восточных Церквей священники (епископы или пресвитеры) являются свидетелями обоюдного согласия супругов, но также для действительности таинства необходимо их благословение (ККК 1623).

Действующие лица брачного союза — мужчина и женщина, крещёные, свободные для заключения брака, добровольно выражающие своё согласие. «Быть свободным» означает:

— не испытывать принуждения;

— не иметь препятствий с точки зрения естественного или церковного закона (ККК 1625).

Соглашение должно быть волевым актом каждого из брачующихся, свободным от любого насилия или серьёзной боязни чего-то извне. Никакая человеческая власть не может заменить этого соглашения. Если такой свободы нет, брак не действителен (ККК 1628).

Христианские супруги (…) в своём состоянии и положении имеют свой собственный дар в Народе Божием. Благодать, присущая таинству брака, предназначена совершенствовать любовь между супругами и укреплять их неразрывное единство. При помощи этой благодати они «помогают друг другу освящать себя через супружескую жизнь, а так же через принятие и воспитание детей» (ККК 1641).

Супружеская любовь по своей природе требует от супругов нерушимой верности. Это — следствие обоюдного дарования себя, которое совершают супруги. Любовь должна быть постоянной. Она не может быть «временной». Этот глубокий союз и обоюдный дар двух личностей, не менее, чем благо детей, требует полной верности супругов и нерасторжимости их единства (ККК 1646).

Тэма № 25, VIII кл.

## ХАРАКТЭРНЫЯ РЫСЫ СУЖЭНСТВА

***Дыдактычная мэта:*** указваем на сакрамэнт сужэнства як на непарыўную, манагамную супольнасць, скіраваную на дар новага жыцця.

***Выхаваўчая мэта:*** фарміруем у моладзі пачуццё адказнасці за падрыхтоўку да сакрамэнту сужэнства.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Мц 19, 5–6; Быц 1, 27–28.

***Метады катэхезы:*** праца ў групах, пластычнае адлюстраванне.

### *Ход заняткаў*

***Малітва:*** падручнік  для вучня.

Вельмі часта мы чуем сёння, што сужэнства не абавязкова павінна быць адно на ўсё жыццё, што перад тым, як заключыць сужэнскі саюз, трэба некаторы час пажыць разам, каб упэўніцца і потым не шкадаваць аб сваім выбары. Якім жа павінна быць сужэнства? На сённяшніх занятках мы пазнаёмімся з вучэннем Касцёла адносна сужэнства, якое з'яўляецца пачаткам будавання сям'і.

**Чалавек пытае**

*К. дзеліць вучняў на 2 групы і раздае ім пластылін сіняга і жоўтага колеру, з якога яны павінны зляпіць нейкую фігуру, напрыклад, трохвугольнік. Спосаб выканання гэтай фігуры ў кожнай з груп будзе розным. Затым К. падыходзіць да кожнай з груп і ўдакладняе заданне: адна з груп павінна будзе зрабіць фігуру, змешваючы дадзеныя ім колеры, другая павінна зрабіць гэтую ж фігуру з двух асобных колераў. Пасля заканчэння працы вучні змяшчаюць свае фігуры на адным стале. К. задае вучням пытанні:*

— Чым адрозніваюцца гэтыя фігуры?
— Як і чаму падчас працы змяніўся колер пластыліну ў першай групы?
— Якая з гэтых фігур будзе больш трывалай і чаму?
— Якая з гэтых фігур, на ваш погляд, адлюстроўвае сапраўдную сутнасць сужэнства?

**Бог адказвае**

Падчас урачыстасці сужэнства маладыя кажуць адно аднаму наступныя словы: «Я, N.., бяру цябе, N.., сабе за жонку (за мужа) і абяцаю захоўваць табе вернасць у шчасці і ў няшчасці, у здароўі і хваробе, а таксама любіць і шанаваць цябе ва ўсе   дні жыцця майго».

1. Напішы, як ты разумееш гэтыя словы: падручнік вучня

Якім павінна быць сужэнства паводле Божага плана мы прачытаем у Святым Пісанні *(спачатку вучні чытаюць самастойна, затым чытае К.):*

«**Таму пакіне мужчына бацьку і маці і злучыцца з жонкай сваёй, і абое стануць адным целам. Таму яны ўжо не двое, але адно цела. Таму няхай чалавек не раздзяляе таго, што злучыў Бог**» (Мц 19, 5–6).

«**І стварыў Бог чалавека паводле свайго вобразу, паводле Божага вобразу стварыў яго, стварыў мужчыну і жанчыну. І благаславіў іх Бог, і сказаў ім: "Пладзіцеся і размнажайцеся, напаўняйце зямлю і валодайце**

**ёю**”» (пар. Быц 1, 27–28).

— Якая істотная праўда адносна сужэнства заключаецца ў гэтых тэкстах Св. Пісання?
— Якімі рысамі мы можам ахарактарызаваць сужэнства?

*Адказы вучняў К. запісвае на дошцы, вучні выконваюць гэта заданне ў падручніку:*

АДЗІНСТВА
НЕПАРЫЎНАСЦЬ
ПЛОДНАСЦЬ
ВЕРНАСЦЬ

Адзінства — манагамія, азначае сувязь аднаго мужчыны і адной жанчыны. Непарыўнасць палягае на тым, што сужэнскі саюз заключаецца да канца жыцця адной са старон. Адзінства і непарыўнасць з’яўляецца дабром не толькі для сужэнцаў, але таксама і для іх будучых дзяцей. Сужэнская любоў адкрытая на плоднасць і скіраваная на перааказ жыцця, дару, які паходзіць ад Стварыцеля.

Толькі трывалая і любячая сям’я можа быць крыніцай сапраўднай любові, у якой будзе гарманічна развівацца кожны чалавек. Побач з непарыўнасцю ідзе вернасць. Захаваць сужэнскую вернасць дапамагае Хрыстус у сакрамэнце сужэнства, які становіцца для сужэнцаў крыніцай духоўных сілаў, месцам асаблівай прысутнасці Бога.

Для кожнага чалавека сям’я мае вельмі вялікае значэнне. У сям’і ты развіваешся, пазнаеш Бога, вучышся прабачаць, адчуваеш сябе бяспечна, бо твае блізкія любяць і клапоцяцца пра цябе. Напэўна, у будучым ты таксама захочаш стварыць сваю сям’ю, таму ўжо сёння ты павінен рыхтавацца да выканання гэтага вельмі адказнага задання, каб твая будучая сям’я была крыніцай шчасця, любові, павагі і ўзаемнай дапамогі. Задумайся, што ты сёння робіш дзеля дабра сям’і, у якой жывеш.

**Чалавек адказвае Богу**

Для кожнага чалавека сям’я мае вельмі вялікае значэнне. У сям’і мы развіваемся, адчуваем сябе бяспечна, бо нашыя блізкія любяць нас і клапоцяцца пра нас. Большасць з вас у будучым захоча стварыць сваю ўласную сям’ю, таму ўжо сёння мы павінны рыхтавацца да выканання гэтых вельмі адказных заданняў, каб нашыя будучыя сем’і былі крыніцай шчасця, любові і ўзаемнай дапамогі. Задумаемся, што мы сёння робім дзеля дабра сям’і, у якой жывём:

***Разважанне:***

— Як часта я малюся за сваю сям'ю?
— Што я раблю дзеля таго, каб у маёй сям'і была добрая атмасфера?
— Якія каштоўнасці я бачу ў трывалым сужэнскім саюзе?
— Што я раблю сёння для дабра сваёй будучай сям'і?

Праз пасрэдніцтва Маці Божай папросім Бога аб узаемнай любові і вернасці ў сужэнствах і сем'ях: *Тваёй абароне..*, *Святая Сям'я, маліся за нас*.

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

1. Намалюй, з якіх каштоўнасцяў будзе пабудавана твая будучая сям'я. Кожнай цаглінцы можаш надаць адпаведны памер. Напішы, што будзе падмуркам, на якім ты будзеш будаваць сваю сям'ю.

***Заключная малітва Пс 128(127)***

Тэма № 26, VIII кл.

## СЯМ'Я ЯК СУПОЛЬНАСЦЬ ЖЫЦЦЯ Ў ЛЮБОВІ

***Дыдактычная мэта:*** указваем на сям'ю, як на супольнасць асобаў і паглыбляем разуменне каштоўнасці сям'і.

***Выхаваўчая мэта:*** фарміруем у моладзі пачуццё адказнасці за ўласную сям'ю.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Клс 3, 18–21; 3 канверты, пранумараваныя літары, фотаздымкі на тэму «Сям'я».

***Метады катэхезы:*** праца ў групах, арыгамі.

***Ход заняткаў***

***Малітва:*** *Добры і міласэрны Божа, аддаём у Тваю апеку наш дом, сям'ю і ўсё, што маем. Благаслаўляй нас, беражы ад усяго злога, ахоўвай у небяспецы,*

*захоўвай ад няшчасця, умацоўвай нашу веру. У смутку і цярпенні дай шчырую надзею. Учыні, каб мы заўсёды былі паяднаныя з Табою. Амэн.*

**Чалавек пытае**

Са словам *сям'я* кожны чалавек мае свае асацыяцыі, у кожнага ўзнікаюць свае пачуцці. Агульна ж пад словам *сям'я* мы разумеем супольнасць асобаў, звязаных паміж сабою вузамі крыві, супольнымі падзеямі і агульным жыллём. Найчасцей сям'я — гэта супольнасць некалькіх асоб, куды ўваходзяць самі

сужэнцы, іх уласныя бацькі, родныя, а таксама дзеці, якімі адорыць сужэнцаў Пан Бог.

*К. раскладвае на стале розныя ілюстрацыі і фотаздымкі на тэму дома і сям'і. На дошцы змяшчае надпіс* ***сям'я****. З прадстаўленных фотаздымкаў вучні выбіраюць тыя, якія на іх погляд адлюстроўваюць сям'ю, затым каментуюць свой выбар.*

**Бог адказвае**

Першым і асноўным заданнем кожнай сям'і з'яўляецца будаванне сапраўднай еднасці, якая будзе фундаментам для развіцця ўсяго грамадства. У Пасланні да Каласянаў знаходзіцца адказ на пытанне, як дасягнуць такой еднасці і ўзаемазразумення ў сям'і.

*Вучні спачатку чытаюць тэкст, затым рознымі колерамі падкрэсліваюць абавязкі мужа, жонкі і дзяцей (падручнік вучня):*

«**Жонкі, падпарадкоўвайцеся мужам вашым, як належыць у Пану. Мужы, кахайце жонак і не будзьце суровымі да іх. Дзеці, будзьце паслухмянымі бацькам вашым ва ўсім, бо гэта падабаецца Пану. Айцы, не раздражняйце дзяцей вашых, каб яны не падалі духам**» (Клс 3, 18–21).

— Да чаго Бог заклікае мужоў?
— Да чаго Бог заклікае жонак?
— Да чаго Бог заклікае дзяцей?

Сям'я стане «супольнасцю жыцця ў любові» тады, калі ЎСЕ яе члены будуць імкнуцца да гэтага праз выкананне сваіх штодзённых абавязкаў. *К. змяшчае на дошцы вялікае сэрца і раздае вучням па дзве карткі паперы. Уключае спакойную музыку і звяртаецца да вучняў:*

Пастарайцеся самастойна ў цішыні з гэтых картак зрабіць штосьці непаўторнае і прыгожае *(метадам арыгамі)*. Тое, што вы зараз зробіце, з'яўляецца для вас вялікім скарбам і толькі вашым (*час для працы*). Цяпер паглядзіце на змешчанае на дошцы нашае супольнае сэрца, якое ў гэтую хвіліну пустое, у ім няма нічога каштоўнага і важнага. Паразважайце зараз і прыміце рашэнне, ці хочаце вы даць свой «скарб» для нашага супольнага сэрца. Хто вырашае аддаць, падыходзіць да дошкі і змяшчае свой «скарб» у сэрцы.

*Вучні (па жаданні) змяшчаюць свае скарбы ў сэрцы, К. выключае музыку і каментуе:*

Падобна адбываецца і ў нашых сем'ях. Сям'я можа быць пустой і

зімнай. Гэта адбываецца тады, калі тыя асобы, якія яе ствараюць, не хочаць адорваць адно аднаго тымі скарбамі, якія маюць. Найвялікшым скарбам для сям'і з'яўляюцца не матэрыяльныя рэчы, аб якіх мы так часта турбуемся. Гэтымі скарбамі могуць быць нейкі добры ўчынак, прыязнае слова, а таксама адказнае выкананне штодзённых абвавязкаў. У сям'і будзе столькі дабра і любові, колькі дадуць іх ад сябе тыя людзі, якія яе складаюць.

Хрысціянскую сям'ю называюць хатнім Касцёлам. Чаму? Бо сям'я выяўляе і здзяйсняе супольны і сямейны характар Касцёла, як Божай сям'і, у якой кожны паводле ўласнай ролі рэалізуе святарства хросту, прычыняецца да таго, каб сям'я стала супольнасцю ласкі і малітвы, школай чалавечых і хрысціянскіх цнотаў, месцам першага абвяшчэння веры дзецям.

*К. дзеліць вучняў на 3 групы і кожнай дае канверт з пранумараванымі літарамі на знешнім баку. У кожным з канвертаў знаходзіцца па адной часцы фразы:*

***У сям'і будзе столькі дабра і любові, колькі іх ахвяруюць тыя, хто яе ўтварае.***

*Кожная група складае сваю частку, а К. запісвае яе на дошцы. Так узнікае ўся фраза, якую затым вучні запісваюць сабе ў сшытак.*

***Разважанне:***

— Што я раблю для ўмацавання еднасці ў маёй сям'і?
— Як выглядае мая малітва ў сям'і і за сям'ю?
— Як я адношуся да сваіх бацькоў і старэйшых асоб, якія ўваходзяць у маю сям'ю?

***Пастанова***

Ад кожнага з нас залежыць, якая ёсць і якой будзе мая сям'я. Кожны з нас можа даць штосьці ад сябе для супольнага дабра ў сям'і. Заахвочваю вас, каб вы зараз зрабілі і запісалі ў сшытак пастанову, якую пастараецеся ўжо сёння рэалізаваць у сваёй сям'і.

***Хатняе заданне***

1. Напішы ў сшытку, навошта чалавеку патрэбна сям'я.
2. Напішы разважанне на тэму «Сучасныя пагрозы для сям'і». Як іх пераадолець?
3. Пастарайся як мага часцей маліцца за сем'і, якім пагражае крызіс.

***Заключная малітва***

*Святая Сям'я, благаславі ўсе сем'і свету і вазьмі іх пад сваю апеку.*
*Захавай іх у лучнасці непарыўнымі повязямі любові, вернымі атрыманым ласкам і абавязкам свайго паклікання.*
*Учыні, каб яны жылі паводле Божых запаведзяў, каб іх жыццё стала адлюстраваннем вашага жыцця на зямлі і дазволіла ім радавацца, прабываючы*

*з вамі ў небе. Амэн.*

Тэма № 27, VIII кл.

## ЧЫСТАСЦЬ ДЗЕЛЯ БОЖАГА ВАЛАДАРСТВА

***Дыдактычная мэта:*** адкрываем рэлігійнае вымярэнне манаскага жыцця, якое разумеецца як служэнне ў Касцёле Богу і людзям.

***Выхаваўчая мэта:*** выхоўваем у моладзі паставу клопату пра пакліканні да манаскага жыцця, заахвочваем да распазнавання ўласнага паклікання.

***Асноўныя і дапаможныя матэрыялы:*** Святое Пісанне: Мц 19, 16–21; ККК 915–916; фотаздымкі святароў і сясцёр з розных кангрэгацый.

***Метады катэхезы:*** аналіз тэксту.

### ***Ход заняткаў***

***Малітва:***

Духу Святы Божа!
Прашу, памнажай і ўмацоўвай маю веру,
каб кожны дзень я набліжаўся да Цябе.
Напоўні мяне Тваёй любоўю,
каб я ўмеў заўважыць кожнага чалавека,
які патрабуе маіх рук і майго сэрца.
Дапамажы мне мудра выкарыстоўваць Твае дары
і рабіць усё так, каб маё жыццё было радасцю для людзей
і хвалою для Цябе. Амэн.

На старонках Святога Пісання мы часта сустракаемся з людзьмі, якіх Пан Бог кліча да выканання пэўных заданняў. Таксама і ў наш час ёсць людзі, якія адчуваюць у сваім сэрцы заклік прысвяціць сваё жыццё на служэнне Богу, заклік да бескарыслівай любові бліжняга, а ахвяравання свайго часу, сваіх здольнасцяў на патрэбы іншых людзей.

**Чалавек пытае**

*К. раздае вучням фотаздымкі святароў і сясцёр з розных кангрэгацыяў, дзе ўсе яны выконваюць свае штодзённыя абавязкі (напр., працуюць з дзецьмі, моладдзю, сем'ямі, апякуюцца хворымі, моляцца, урачыста складаюць шлюбы і г.д.).*

— Каго мы бачым на гэтых фотаздымках?
— Як можна ахарактарызаваць жыццё гэтых людзей?

— Каму, дзе і як служаць гэтыя людзі?
— Як вы разумееце слова *пакліканне*?

Вы ўжо, напэўна, здагадаліся, што сёння мы будзем размаўляць пра своеасаблівае пакліканне — пакліканне да жыцця ў чыстасці дзеля Божага Валадарства. Менавіта так гучыць наша сённяшняя тэма.

*Нехта з журналістаў назіраў, як Маці Тэрэза з сёстрамі апекавалася пракажонымі, хворымі і паміраючымі. Ён сказаў: «Я не зрабіў бы гэтага ніколі, нават за мільён даляраў». «За мільён даляраў я таксама не зрабіла б гэтага, – адказала Маці Тэрэза, – толькі дарма! З любові да Хрыста!»*

— Што з'яляецца мэтай жыцця кансэкраваных асоб?

**Бог адказвае**

Часта мы не можам зразумець людзей, якія пакідаюць сям'ю, кар'еру, сяброў, каб ісці за Хрыстом. Але яшчэ часцей, калі закранаюцца пытанні выбару ўласнага спосабу жыцця, узнікае няўпэўненасць.

**«Пастаў мяне, як пячаць на сваё сэрца, як пячаць на сваю руку, бо каханне магутнае, як смерць, рэўнасць бязлітасная, як адхлань. Яго полымя — гэта полымя агню, як Божае полымя. Вялікія воды не змогуць пагасіць кахання, і рэкі не затопяць яго. Калі б хто ўзамен за каханне аддаў усё багацце свайго дому, ім толькі будуць пагарджаць» (**Пп 8, 6-7).

— Як Песня песняў Саламона апісвае любоў?

У большасці парафій тваёй дыяцэзіі працуюць сёстры і прэзбітэры, якія належаць да розных манаскіх супольнасцяў, выконваюць шэраг розных заданняў, давераных ім Панам Богам і Касцёлам. Усіх гэтых людзей аб'ядноўвае адно — яны жывуць згодна з трыма евангельскімі парадамі. Якімі? *Вучні падкрэсліваюць адказ на гэтае пытанне (падручнік вучня).*

«Евангельскія парады ў іх разнастайнасці прапанаваны ўсім вучням Хрыста. Дасканаласць любові, да якой пакоіканы ўсе вернікі, ускладае на тых, хто свабодна прымае заклік прысвячэння жыцця Богу, абавязак захавання чыстасці для Валадарства Божага, жыцця ва ўбостве і паслухмянасці. Жыццё, "прысвечанае Богу, характарызуе выкананне гэтых парадаў» (пар. ККК 915).

**Чалавек адказвае Богу**

*К. скіроўвае увагу вучняў да фотаздымкаў, якія яны разглядалі на пачатку занятку*:

На гэтых фотаздымках — сёстры і святары, якія належаць да розных манаскіх супольнасцяў, выконваюць шэраг розных спраў. Але ўсіх гэтых людзей аб'ядноўваюць шлюбы, аб якіх мы толькі што прачыталі ў ККК. Назавіце іх, калі ласка.

Шлюб чыстасці — гэта адрачэнне ад сужэнства і сям'і. Гэты шлюб глыбей звязвае чалавека з Асобай Езуса Хрыста.

Шлюб убогасці — гэта наследванне Езуса ў прастаце сэрца і жыцця.

Шлюб паслухмянасці — гэта наследванне Езуса праз адрачэнне ад сваёй вольнасці дзеля збаўчага плана Бога.

Манаскае жыццё — гэта перадусім дар і заданне, атрыманае ад Бога, гэта місія абвяшчэння Добрай Навіны праз слова і чын усім патрабуючым братам і сёстрам. Асобам, якія ахвяравалі сваё жыццё на служэнне Богу і людзям у манаскім стане, больш за ўсё патрэбна твая малітва і твая пашана. Сваёю малітвай ты дапамагаеш прэзбітэрам і сёстрам, якія працуюць у тваёй парафіі.

Часамі мы не можам зразумець людзей, якія пакідаюць сям'ю, кар'еру, сяброў, каб ісці за Хрыстом, а тады, калі закранаюцца пытанні выбару ўласнага спосабу жыцця, узнікае няўпэўненасць.

Святы Айцец Ян Павел ІІ у сваіх гаміліях неаднойчы звяртаўся да маладых людзей з заклікам рашуча і адважна ісці за голасам уласнага паклікання. Сёння гэты заклік скіраваны, магчыма, і да цябе:
*«Я прамаўляю да вас, маладыя: калі чуеце запрашэнне Хрыста, не адкідайце яго! Адважна станавіцеся на вялікія шляхі святасці, якія праклалі святыя, ідучы за Хрыстом. Трэцяе тысячагоддзе чакае інвестыцыі веры і ініцыятывы супольнасці маладых кансэкраваных асоб»* (Ян Павел ІІ, Познань 1997 г.).

***Разважанне:***

— Як часта я ахвярую сваю малітву за святароў і кансэкраваных асоб?
— Што я раблю для таго, каб распазнаць уласнае пакліканне?
— Як я дзякую Богу за дар святарства і манаскага жыцця?

***Пастанова.***

***Хатняе заданне:***

Кожны чацвер пастарайся маліцца за новыя і святыя пакліканні.

Падчас вячэрняй малітвы паразважай над выказванне Маці Тэрэзы з Калькуты. «Кім для мяне з'яўляецца Езус? Езус — гэта.... Слова, якое трэба прамовіць, Свет, любоў, Мір. Езус — гэта галодны, якога трэба накарміць; бяздомны, самотны, адкінуты, пракажоны, убогі, сляпы, калека, вязень...»

***Заключная малітва:***

Пане Езу Хрыстэ, Ты аддаў сваё жыццё дзеля збаўлення людзей і стаў Вечным Святаром. Просім у Цябе за тых, хто рыхтуецца да святарства альбо

манаскага жыцця. Атулі іх ласкаю свайго благаслаўлення,
аддалі ад іх усялякія спакусы і ўмацуй іх
у святасці, каб яны ахвотна і самааддана пазнавалі Цябе і такім чынам рыхтаваліся да годнага служэння ў Тваім Касцёле. Амэн.